WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 МАЯ 2011 г.
СЕРАДА
№ 85
(26949)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Фота БЕЛТА.

«ПЕРАМОГА Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ — САМАЯ ЗНАЧНАЯ ПАДЗЕЯ Ў НАЙНОЎШАЙ ГІСТОРЫІ ЧАЛАВЕЦТВА»

Фота БЕЛТА.

ПРЭЗІДЭНТ Беларусі Аляксандр Лукашэнка 9 мая па традыцыі прыняў удзел ва ўрачыстых мерапрыемствах у гонар Дня Перамогі.

Кіраўнік дзяржавы ўзначаліў урачыстае шэсце па праспекце Незалежнасці ад Кастрычніцкай плошчы да плошчы Перамогі. У першых шарэнгах святочнай калоны прайшлі Героі Савецкага Саюза, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і Узброеных Сіл, вышэйшыя службовыя асобы краіны. Ветэраны ехалі і на аўтамабілях УАЗ, а для тых, хто па стане здароўя не змог прыняць удзел у шэсці, на плошчы Перамогі зрабілі спецыяльныя трыбуны. Усяго на святочныя мерапрыемствы ў цэнтры сталіцы сабралася амаль 80 тысяч чалавек.

Прэзідэнт усклаў вянок да манумента Перамогі. Да помніка таксама ўсклалі вянкі і кветкі прадстаўнікі структур дзяржкіравання, грамадскіх аб'яднанняў, дыпламатычнага корпуса, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, духавенства.

Аляксандр Лукашэнка і ўсе прысутныя на плошчы Перамогі ўшанавалі памяць загінулых герояў мінутай маўчання.

Кіраўнік дзяржавы цёпла пагутарыў з ветэранамі, кіраўнікамі дыпламатычных місій, якія прынялі ўдзел ва ўрачыстасцях.

Прэзідэнт таксама па традыцыі падзяліўся з журналістамі сваімі ўражаннямі ад свята.

Паводле яго слоў, Беларусь заўсёды будзе захоўваць памяць аб подзвігу беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У краіне ўжо зроблена і робіцца нямала для гэтага. У рэспубліцы няма ні аднаго недагледжанага помніка, узводзяцца новыя. У Мінску пачата будаўніцтва новага будынка музея Вялікай Айчыннай вайны.

«І мы гэта робім сёння яшчэ і таму, што ў грамадстве жыве даніна павагі да тых людзей, якія прынеслі нам свабоду. Паглядзіце, колькі дзяцей і моладзі сёння на праспекце, яны ўсё разумеюць, яны гавораць, як яны ўспрымаюць тую Перамогу, як ваявалі іх дзяды і прадзеды. Гэта дарагога каштуе. Значыць, у хлопчыка ўжо з 5-7 гадоў закладваецца даніна павагі да ветэранаў, да таго, каб ён шанаваў гэту Вялікую Перамогу», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Дзякуючы той Перамозе мы стварылі нашу дзяржаву, мы ўмацавалі яе, — адзначыў Прэзідэнт. — Каб гэту памяць захаваць, у Беларусі робіцца больш, чым у любой іншай краіне».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што неабходна захаваць усё тое, што сведчыць аб подзвігу беларускага народа ў той крывавай вайне.

Прэзідэнт лічыць, што Дзень Перамогі — гэта агульнае аб'яднальнае свята і беларусаў, і еўрапейцаў. «Ваявалі і гінулі не толькі савецкія людзі. Яны, вядома, адыгралі галоўную ролю, але з ворагам біліся і ў Германіі антыфашысты, камуністы, антыфашысцкі Рух супраціўлення быў масавым у Заходняй Еўропе. Гэта дарагога каштуе, асабліва калі мы перайшлі граніцу і рушылі да Берліна, мы адчувалі дапамогу. Вызваленчая армія Югаславіі, іншыя групы, армія Польшчы — яны ж таксама, няхай з нашай падтрымкай, нашай дапамогай, інакш і быць не магло, таму што цяжка было змагацца ў акупацыі, але яны змагаліся», — сказаў Прэзідэнт.

Гаворачы аб цяперашнім этапе адносін Беларусі з Еўрасаюзам, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Ніякага Рубікона мы не пераходзілі, але вельмі ўжо імкнецца хтосьці яго перайсці з таго боку.

СТАР. 2

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Знакавыя прадпрыемствы айчыннай энергетыкі

БЭРН: КАЛЕКТЫЎ УНІКАЛЬНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ, СУЧАСНЫ БРЭНД І ДОБРАЕ ІМЯ

На гэтым участку рамантуюць трансфарматары.

Калі творчая група «Звязды» наведвала адно са шматпрофільных прадпрыемстваў беларускай энергетычнай галіны — адкрытае акцыянернае таварыства «Белэнергарамналадка», то мы нават уявіць сабе не маглі, якія аб'ёмныя сур'ёзныя праекты рэалізуе гэтае прадпрыемства ў нашай краіне і за яе межамі, а таксама якія грандыёзныя сучасныя задачы спецыялісты БЭРНа плануюць здзейсніць у найбліжэйшы час.

Генеральны дырэктар ААТ «Белэнергарамналадка» Васіль ХАМЕНКА.

Генеральны дырэктар ААТ «Белэнергарамналадка» Васіль ХАМЕНКА:

«Кліентам прапануецца поўны комплекс паслуг «пад ключ»

— Мабыць, своеасаблівай іскрынкай БЭРНа з'яўляецца яе шматпрофільнасць і вялікая разнапланавая дзейнасць?..

— У энергетыцы нашай краіны не так шмат падобных арганізацый, якія маюць такую колькасць напрамкаў дзейнасці, як ААТ «Белэнергарамналадка». Нехта спецыялізуецца толькі на мантажных работах, хтосьці займаецца электрыкай ці наладкай. А мы ў адной структуры арганізавалі вытворчасць уласнай электратэхнічнай прадукцыі і тавараў народнага спажывання, мантажную і будаўнічую дзейнасць у сферы энергетыкі. Займаемся рамонтам і наладкай любога складанага энергетычнага абсталявання, маем сертыфікаваную лабараторыю па розных вымяральных прыборах, хімлабараторыю, міжсістэмную лабараторыю кантролю металу і зваркі і г.д. Увесь такі вялікі спектр дзейнасці з'яўляецца асаблівасцю нашай фірмы. Такі падыход дае свае плюсы менавіта ў крызісны час, калі мы маем магчымасць лавіраваць у залежнасці ад кан'юнктуры рынку. Калі адна структура пачынае крыху адставаць па загружанасці, то абавязкова на другім напрамку назіраецца рост заказаў. А ў выніку даход прадпрыемства заўсёды застаецца не ніжэй за сярэдні ўзровень. Аднак з іншага боку — гэта складана, бо неабходна пастаянна ўкладваць у вытворчасць дадатковыя фінансавыя сродкі, каб падтрымліваць у рабочым стане адразу ўсе напрамкі.

— З вашых слоў атрымліваецца, што на прадпрыемстве наладжана такая сістэма «працы ў звязцы», якая дазваляе аказваць кліентам увесь комплекс паслуг...

— Гэта сапраўды так. У нас ёсць такая магчымасць: выконваць усе работы адпаведнага профілю, так бы мовіць «пад ключ». Шчыра дадам, што часткова існуе толькі адно слабае месца, якое датычыцца праектавання. У гэтым выпадку праекты вялікіх аб'ектаў па нашым заказе складаюць галіновыя праектныя інстытуты. Заўважу, што невялікія праекты вырабляем самастойна на даволі высокім прафесійным узроўні. Што датычыцца любых відаў мантажных работ, наладкі, вырабу неабходных металаканструкцый і прыстасаванняў для суправаджэння гэтых работ, — усё гэта мы выконваем якасна і ў неабходны тэрмін. Калі казаць словамі Райкіна, то за «касцюм», што мы пашылі, менавіта мы цалкам і адказваем. Тут перад канкурэнтамі ў нас існуе даволі важкі плюс.

— У Беларусі вы з'яўляецеся адным са знакавых прадпрыемстваў, якія трымаюць айчынную энергетычную сістэму ў тонусе. Дзякуючы намаганням вашых структурных падраздзяленняў у краіне на неабходным тэхналагічным узроўні падтрымліваецца энергетычная бяспека дзяржавы...

— Не толькі мы трымаем энергетычную бяспеку ў краіне. Разам з тым згаджуся з вашым пасылам аб тым, што БЭРН актыўна ўдзельнічае ў гэтым напрамку. Так, сёння няма ніводнага аб'екта дзяржаўнай праграмы, калі гэта генерацыя, дзе б мы не прымалі свой удзел. Тут мы выконваем пастаўленыя ўрадам задачы ў комплексе ці робім асобны від работ, але мы абавязкова ўдзельнічаем у такіх праграмах. Напрыклад, у мадэрнізацыі мінскіх ЦЭЦ-2 і ЦЭЦ-5. На першы погляд здаецца, што на ЦЭЦ-5 кітайскімі калегамі ажыццяўляецца праект будаўніцтва парагазавага энергаблока магутнасцю 399 МВТ «пад ключ». Аднак нават у сферы генерацыйнага абсталявання мы актыўна ўдзельнічаем у праекце, бо менавіта нашы спецыялісты будуць ажыццяўляць прыёмку абсталявання з мантажу ад кітайскіх партнёраў, забяспечаць кантроль выканання пусканаладачных работ і ўвод абсталявання ў эксплуатацыю ў адпаведнасці з тэхнічнымі нормамі Рэспублікі Беларусь. Так склалася, што нават на такіх аб'ектах, дзе комплекс работ «пад ключ» выконваецца іншай арганізацыяй, наша непасрэдная прысутнасць там неабходна. Мы забяспечваем пуск іх абсталявання. На мінскай ЦЭЦ-2, дзе мы з'яўляемся галоўнай арганізацыяй па пуску кітайскага абсталявання, нам давялося сутыкнуцца з вельмі няякасным праектам па сістэме кантролю і кіравання абсталяваннем дзвюх парагазавых установак магутнасцю па 32,5 МВТ кожная. Нашым спецыялістам давялося ў самыя кароткія тэрміны распрацаваць тэхналагічныя алгарытмы па кіраванні і рэгуляванні тэхналагічнымі працэсамі, а таксама распрацаваць прыкладное праграмнае забеспячэнне. Аператыўнае рашэнне гэтых пытанняў дазволіць істотна скараціць тэрмін уводу ў эксплуатацыю кітайскага абсталявання.

ПРАДСТАЎЛЯЕМ КІРАЎНІКА

Васіль Мікітавіч Хаменка нарадзіўся ў 1953 годзе ў пасёлку Сасноўка Канатопскага раёна Сумскай вобласці. У 1973 годзе скончыў Канатопскі індустрыяльна-педагагічны тэхнікум, а ў 1980 годзе — інжынерна-эканамічны інстытут у Ленінградзе. Інжынер-эканаміст па спецыялізацыі «Эканоміка і арганізацыя энергетыкі».

Працаваў электраманцёрам на Харкаўскім маторабудаўнічым заводзе (1973), электраманцёрам ЖКА Канатопскага вагонарамонтнага завода (1975). У 1980—1981 гадах быў інжынерам-тэхнолагам, інжынерам па падрыхтоўцы вытворчасці аддзела рамонтна-механічнай вытворчасці прадпрыемства «Белэнергарамналадка»; эканамістам, старшым інжынерам службы эканомікі, намеснікам начальніка ААТі3 «Белгалоўэнерга» (1981—1986); спецыялістам па аказанні дапамогі ў арганізацыі працы на электрычных станцыях Рэспублікі Куба (1986—1988), старшым інжынерам і вядучым інжынерам па арганізацыі і нарміраванні працы ТЭА «Беларусэнерга» (1988—1990). У 1990—1992 — начальнік аддзела Працы і Заработнай платы, 1992—2001 гадах працаваў на пасадзе намесніка дырэктара ААТ «Белэнергарамналадка», у 2001—2003 гадах — дырэктарам, пачынаючы з 2003 года — генеральным дырэктарам ААТ «Белэнергарамналадка». Быў узнагароджаны Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, медалём «За працоўныя заслугі».

СТАНАЎЛЕННЕ ПРАДПРЫЕМСТВА

Гісторыя ААТ «Белэнергарамналадка» пачалася ў 1957 годзе, калі ў сувязі з інтэнсіўным развіццём у нашай краіне энергасістэмы ў рэспубліцы было створана спецыялізаванае рамонтнае прадпрыемства «Беларусэнергарамонт». Колькасць персаналу тады складала каля 90 чалавек, але ўжо напрыканцы 1957 года павялічылася да 200 работнікаў. Першым дырэктарам прадпрыемства быў Яўген Аўруцін. Рамонтнае прадпрыемства паспяхова функцыянавала. У 1964 годзе ў айчыннай энергасістэме было створана спецыялізаванае наладачнае прадпрыемства «Беларусэнераналадка», якое ў 1973 годзе было далучана да «Беларусэнергарамонт». Менавіта тады ў нашай краіне з'явілася адзінае рамонтна-наладачнае прадпрыемства «Белэнергарамналадка». Такое аб'яднанне дазволіла выконваць рамонтныя і наладачныя работы ў комплексе, намаганнямі аднаго прадпрыемства, пад адзіным агульным кіраўніцтвам. Тады БЭРНам кіраваў Віктар Іванавіч Шаманоўскі. У 1982 годзе дырэктарам «Белэнергарамналадка» стаў Уладзімір Пятровіч Стайчанка, які кіраваў прадпрыемствам 19 гадоў. Менавіта па ініцыятыве У. Стайчанкі ў 1997 годзе прадпрыемства першым у энергасістэме было рэарганізавана ў адкрытае акцыянернае таварыства «Белэнергарамналадка».

Асобна трэба адзначыць, што, пачынаючы з сярэдзіны 70-х гадоў і цяпер, спецыялісты прадпрыемства актыўна ўдзельнічаюць у выкананні рамонтна-наладачных работ на замежных аб'ектах. Першым сур'ёзным замежным аб'ектам была электрастанцыя ў Нігерыі, дзе персанал прадпрыемства на працягу некалькіх гадоў выконваў пусканаладачныя работы па ўводзе ў эксплуатацыю энергетычнага абсталявання. Потым было шмат іншых аб'ектаў у Сірыі, Індыі, Іране і многіх іншых краінах.

СТАР. 4-5

Начальнік канструктарскага бюро Павел КУЗЬМІЦКІ (на пярэднім плане першы злева) і яго калегі: Рыгор БАНДАРЭЦ, Іосіф ШАМЕС, Ігар СУЧКОЎ, Андрэй ЛАЎРЫНОВІЧ, Раман РУСАК, Таццяна ГЕРАСІМОВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

ПРЫМЯНЕННЕ АДЗІНАЙ ТАРЫФНАЙ СЕТКІ Ў БЕЛАРУСІ БУДЗЕ МЕЦЬ РЭКАМЕНДАЦЫЙНЫ ХАРАКТАР

Адпаведны Указ № 181 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні дзяржаўнага рэгулявання ў галіне аплаты працы» падпісаў 10 мая кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Указам прадугледжаны шэраг мер па лібералізацыі пытанняў аплаты працы.

Так, дакументам надаецца рэкамендацыйны характар прымяненню Адзінай тарыфнай сеткі работнікаў Беларусі для аплаты працы работнікаў, наймальнікамі якіх з'яўляюцца камерцыйныя арганізацыі (як дзяржаўныя, так і прыватныя), у тым ліку банкі і індывідуальныя прадпрымальнікі. Рэкамендацыйны характар прымянення АТС не прывядзе да поўнай адмены яе выкарыстання пры выбары сістэм аплаты працы. Наймальнік мае права самастойна вызначаць гэтыя ўмовы — або на аснове АТС, або без яе.

Пашыраюцца правы наймальнікаў ва ўстанаўленні стымулюючых выплат работнікам (прэміі, надбаўкі).

Для ўзмацнення матэрыяльнай зацікаўленасці работнікаў у канчатковым выніку, праяўлення ініцыятывы і істотнага павышэння прадукцыйнасці і якасці працы зняты абмежаванні па сумах сродкаў, якія могуць быць накіраваны на выплаты стымулюючага характару работнікам камерцыйных арганізацый.

Наряду з лібералізацыяй дзяржаўнага рэгулявання ў галіне аплаты працы ва Указе змешчаны нормы, якія забяспечваюць недапушчэнне зніжэння наймальнікам заработнай платы работнікаў на момант увядзення новых умоў аплаты працы і захаванне гарантый, прадугледжаных заканадаўствам аб працы.

Указ уступае ў сілу з першага чысла месяца, які ідзе за месяцам яго афіцыйнага апублікавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр Лукашэнка перагледзіць работу Савета па развіцці прадпрымальніцтва ў Беларусі

Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў учора ў час наведвання СТАА «Хенкель Баўтэхнік» пад Заслаўем, перадае БЕЛТА.

«Я вельмі сур'ёзна думаю, як мадэрнізаваць Савет па прадпрымальніцтве, які працуе вельмі дрэнна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Я думаў, прадпрымальнікі будуць уносіць непасрэдна мне прапановы, у тым ліку па ўдасканаленні заканадаўства, падатковай сістэмы. Але такога няма», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Таму настаў час змяніць прынцыпы работы савета. «У бягучым годзе трэба падумаць, каб гэта кухня закруцілася, каб была зваротная сувязь з прадпрымальніцкай супольнасцю», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў склад савета неабходна ўключаць людзей, якія ўжо замацаваліся ў бізнэсе. «Прадпрымальнікі павінны выказваць альтэрнатыўны чыноўніцкаму пункт гледжання па пытаннях развіцця прадпрымальніцтва», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Учора Прэзідэнт наведаў СТАА «Хенкель Баўтэхнік» і азнаёміўся з работай гэтага прадпрыемства, створанага з удзелам замежных інвестыцый. Кіраўнік дзяржавы выслухаў меркаванне генеральнага дырэктара СТАА «Хенкель Баўтэхнік» Сяргея Навіцкага па многіх актуальных пытаннях развіцця вытворчасці ў Беларусі, у тым ліку па пытаннях падаткаабкладання, праблемных пытаннях на валютным рынку, па кадравых пытаннях.

Прэзідэнт агледзеў вытворчыя цэхі СТАА «Хенкель Баўтэхнік», у тым ліку цэх падрыхтоўкі сухіх сумесяў, лабараторыю, цэхі ўпакоўкі.

СТАА «Хенкель Баўтэхнік» — падраздзяленне будаўнічай хіміі канцэрна Henkel у Рэспубліцы Беларусь. Прадпрыемства створана ў 2004 годзе з мэтай арганізацыі вытворчасці імпартазамяшчальнай прадукцыі. Выкарыстанне лакальнай сыравіны дало магчымасць знізіць кошт прадукцыі на 15-20 працэнтаў у параўнанні з імпартнымі аналагамі. Прадукцыя кампаніі «Хенкель Баўтэхнік» адпавядае патрабаванням дзвюх сістэм стандартаў якасці — СТБ і Еўрапейскіх норм.

Прадпрыемства мае ўласную акрэдытаваную лабараторыю, што забяспечвае пастаянны высокі ўзровень якасці вырабленай прадукцыі. Прадукцыя Ceresit беларускай вытворчасці атрымлівае самыя высокія водгукі па якасці ад прафесіяналаў будаўнічага рынку Беларусі. Сярэдняспісачная колькасць работнікаў прадпрыемства — 139 чалавек. Сярэдняя зарплата на прадпрыемстве складае Br2,5 млн.

Аляксандр Лукашэнка заклікае прыватны бізнэс да большай актыўнасці. Гэта пытанне было закранута ўчора ў час наведвання кіраўніком дзяржавы ЗП «Косвік» у Заслаўі. У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка прапанаваў кіраўніку гэтага замежнага прадпрыемства разгледзець магчымасць стварэння такой вытворчасці ў любым іншым населеным пункце Беларусі. Прэзідэнт падкрэсліў, што дзяржава ў сваю чаргу гатова ўдзельнічаць у гэтым працэсе.

У той жа час Прэзідэнт патрабуе ад мясцовай улады большай актыўнасці па прыцягненні прадпрымальнікаў да інвеставання ў новыя вытворчасці. Кіраўнік дзяржавы таксама арыентаваў чыноўнікаў на большае выкарыстанне мясцовай сыравіны ў вытворчасці.

Замежнае прадпрыемства «Косвік» стваралася з удзелам канадскага капіталу і арыентуецца на выпуск паркету і паркетнай дошкі з дубу і ясеню. Упершыню масіўныя падлогі Koswick былі прадстаўлены на рынку ў 1995 годзе. Круглы лес, які кампанія выкарыстоўвае для вытворчасці паркету, нарыхтоўваецца пры санітарных высечках, і гэта не прыводзіць да скарачэння дубовых і ясеневых лясоў. Прадпрыемства цесна супрацоўнічае з мясцовымі арганізацыямі па ахове і падтрыманні навакольнага асяроддзя і лясных запасаў. Усе адходы вытворчасці ў выглядзе пілавіння і абрэзкаў перапрацоўваюцца: часткова спальваюцца ва ўласнай кацельні для абагравання памяшканняў, часткова перарабляюцца ў брыкеты і пелеты, якія шырока выкарыстоўваюцца ў якасці паліва для абагравання жылля.

У студзені—сакавіку бягучага года прадпрыемствам выраблена прадукцыі на суму Br10,2 млрд, што на 72,4 працэнта вышэй за аналагічны перыяд мінулага года. На 2011 год запланаваны аб'ём вытворчасці прадукцыі не менш як Br48 млрд. Прадпрыемства плануе таксама пашырыць геаграфію паставак прадукцыі і выйсці на новыя рынкі краін СНД. Экспарт прадукцыі ў 2011 годзе чакаецца ў аб'ёме не менш як $10 млн. ЗП «Косвік» мае шырокую дылерскую сетку па ўсім свеце і паспяхова экспартуе сваю прадукцыю ў Канаду, ЗША, Вялікабрытанію, Грэцыю, Германію, краіны Балтыі, Расію і іншыя.

Аляксандр Лукашэнка агледзеў цэхі склейкі, аддзелкі, упакоўкі, агледзеў выстаўку гатовай прадукцыі.

«...САМАЯ ЗНАЧНАЯ ПАДЗЕЯ Ў НАЙНОЎШАЙ ГІСТОРЫІ ЧАЛАВЕЦТВА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ну што ж, мы гатовы да ўсяго. Але не хацелася б. Не хацелася б не тое каб гарачай вайны, не хацелася б наогул ніякіх войнаў. Нам хацелася б, каб было спакойна, ціха, каб мы спакойна, ціха гадавалі сваіх дзяцей, развівалі сваю эканоміку, прамысловасць, сельскую гаспадарку, будавалі жыллё, а не разбуралі яго».

«Калі нас чуюць, калі ласка, мы адкрыты для гэтага дыялога. Калі нас не хочуць чуць, ну што ж, мы гэта прымаем да ведама», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем адзначыў: «Жудасна гучыць, я ў сродках масавай інфармацыі прачытаў: аказваецца, дзесьці ў Еўрапарламенце, яшчэ ў нейкай структуры разглядаецца беларускае пытанне. Гэта сведчыць аб тым, што мы так і не зрабілі ніякіх вывадаў з таго, што было ў той жахлівы час. На жаль, гэта так».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЛАРУСКА-ІЗРАІЛЬСКІЯ АДНОСІНЫ АКТЫЎНА ПАШЫРАЮЦЦА ПА ЎСІХ НАПРАМКАХ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль Шымона Перэса, прэм'ер-міністра Дзяржавы Ізраіль Біньяміна Нетаньяху і народ гэтай краіны з нацыянальным святам — Днём Незалежнасці.

Прэзідэнт Беларусі ў віншаванні Шымону Перэсу адзначыў, што беларуска-ізраільскія адносіны актыўна пашыраюцца па ўсіх напрамках. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што развіццё дыялога на вышэйшым узроўні ўмацуе супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«СУПРАЦОЎНІЦТВА СМІ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ Ў 2011 ГОДЗЕ ЗНАЧНА ПАШЫРЫЛАСЯ»

Супрацоўніцтва СМІ Саюзнай дзяржавы ў 2011 годзе значна пашырылася, прычым не толькі ў колькасным, але і, што больш важна, у тэматычным і якасным эквіваленце падачы матэрыялаў. Такое меркаванне выказала на пасяджэнні круглага стала «Дзіцячыя СМІ ў Саюзнай дзяржаве: праблемы і перспектывы» першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч, перадае БЕЛТА.

«Аднак нельга забываць галоўнае: колькі мы не пісалі б і не гаварылі б, колькі газет, часопісаў, тэлепраграм не выпускалася б, аснову ўсіх узаемаадносін Саюзнай дзяржавы неабходна фарміраваць з дзяцінства, з тых, каму цяпер 5-10 гадоў», — сказала Лілія Ананіч. У якасці прыкладу пазітыўнай работы з дзіцячай аўдыторыяй Лілія Ананіч прывяла выдавецтва «Пачатковая школа», якое выпускае шэсць назваў дзіцячых часопісаў пад агульным брэндам «Рюкзачок». «Вельмі часта моладзь чэрпае веды аб стандартах жыцця і сацыялізацыі менавіта са СМІ, у тым ліку з інтэрнэт-выданняў. І менавіта таму сёння асабліва востра паўстае праблема сацыяльнай адказнасці дзіцячых і маладзёжных СМІ», — падкрэсліла дырэктар выдавецтва «Пачатковая школа» Наталля Ваніна.

ГЕРОІ-ФРАНТАВІКІ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Капітан у адстаўцы Зінаіда Сцяпашка і генерал-маёр Валерый Гайдукевіч.

Сустрэча ветэранаў унутраных войскаў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны адбылася напярэдадні 9 мая ў вайсковай часці 3214. Ветэраны (а гэта ўсяго пяцьдзясят адзін чалавек) — тут частыя госці. Акрамя святочных дзён ім пастаянна аказваецца ўсебаковая падтрымка. Павіншаваць ветэранаў са святам Вялікай Перамогі прыехаў намеснік Міністра ўнутраных спраў — камандуючы ўнутранымі войскамі генерал-маёр Валерый Гайдукевіч.

Аб'ёмы фінансавання дзяржпраграмы інавацыйнага развіцця аптымізаваныя з Br94 да 58 трыльёнаў

Ва Урадзе

Шэраг важных пытанняў, якія вызначаюць далейшае эканамічнае развіццё краіны, быў разгледжаны ўчора на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі. У прыватнасці, на абмеркаванне ва ўрадзе быў прадстаўлены дапрацаваны праект Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця Беларусі на 2011-2015 гады.

Падчас дадатковай працы над праграмай у ёй былі вылучаны найбольш эфектыўныя і перспектыўныя праекты, якія патрабуюць максімальна хуткай рэалізацыі. Паводле слоў старшыні Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях Ігара Войтава, вельмі сур'ёзны акцэнт у праекце зроблены на развіццё і фарміраванне новых напрамкаў эканамічнай дзейнасці ў краіне і, перш за ўсё, гэта звязана з развіццём высокатэхналагічных галін — індустрыі інфармацыйных тэхналогій, авіякасмічнай прамысловасці, ядзернай энергетыкі, фармацэўтычнай прамысловасці і іншых. У праграме намечана выканаць 223 важнейшыя праекты па стварэнні новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў, якія маюць вызначальнае значэнне для інавацыйнага развіцця рэспублікі. Плануецца, што ў рамках праграмы будуць прынятыя два новыя законы і 9 указаў Прэзідэнта, накіраваныя на стымуляванне інавацыйнай дзейнасці і павышэнне зацікаўленасці прадпрыемстваў у гэтай сферы дзейнасці. «Мы намецілі, — паведаміў Ігар Войтаў, — 380 праектаў па стварэнні новых вытворчасцяў і прадпрыемстваў і ўкараненні на іх новых тэхналогій на падставе айчынных распрацовак».

Першапачаткова меркавалася, што на выкананне праграмы будзе накіравана каля 94 трыльёнаў рублёў. Аднак падчас дапрацоўкі праекта дакумента аб'ёмы фінансавання былі аптымізаваныя да 58 трыльёнаў. Прычым, зазначыў Ігар Войтаў, не ва ўрон асноўным мерапрыемствам праграмы. Плануецца, што 65 працэнтаў ад агульнага фінансавання інавацыйнай праграмы складуць замежныя інвестыцыі, 15 працэнтаў — уласныя сродкі прадпрыемстваў, 15 — сродкі беларускіх банкаў і 4,5 — сродкі мясцовых бюджэтаў.

Таксама на пасяджэнні Прэзідыума ішла гаворка аб перспектывах развіцця ў бліжэйшыя пяць гадоў вытворчасці айчынных лекавых прэпаратаў — разглядаўся праект праграмы развіцця канцэрна «Белбіяфарм». Старшыня канцэрна Міхаіл Чарапок адзначыў, што да 2015 года долю беларускіх лекаў на ўнутраным рынку неабходна давесці ў вартасным выражэнні да 50 працэнтаў. Летась гэтая доля склала 23,4 працэнта.

Асвойваць новыя лекавыя прэпараты мяркуецца не толькі ўласнымі сіламі, але і ў партнёрстве з вядомымі сусветнымі лідарамі.

А міністр энергетыкі Аляксандр Азярэц распавёў журналістам, што падрыхтоўка краіны да асенне-зімняга перыяду 2011/2012 года вядзецца па плане. Адказваючы на пытанне, ці паўплывала цяперашняя сітуацыя на ўнутраным валютным рынку на стварэнне неабходных рэспубліцы запасаў прыроднага газу, ён, у прыватнасці, заявіў, што паліва краіна атрымлівае ў поўным аб'ёме, у тым ліку для запампоўвання ў сховішчы. «Фінансавання дастаткова, каб выканаць мерапрыемствы, закласці неабходныя аб'ёмы мазуту і стварыць такія запасы прыроднага газу ў сховішчах, каб гэта ў выпадку форс-мажору забяспечыла нармальную стабільную працу эканомікі краіны», —канстатаваў міністр.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА, Яўгена ПЯСЕЦКАГА і Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Святкаванне Дня Перамогі ў Мінску.

Абзац

701 п'янага кіроўцу затрымалі ў мінулыя выхадныя супрацоўнікі ДАІ на дарогах Беларусі. У 48 ДТЗ загінула 10 чалавек, 52 атрымалі траўмы. Усяго зарэгістравана 1090 дарожна-транспартных здарэнняў з матэрыяльным уронам.

10 мая ў Гомелі рабочы-мантажнік прыватнага прадпрыемства забіў дырэктара ў службовым кабінеце. Злачынства было здзейснена прыкладна ў 10 гадзін, падазроны затрыманы. Раніцай на прадпрыемстве, якое займаецца мантажом сістэм кандыцыянавання і вентыляцыі, пасля правядзення планёркі рабочы-мантажнік пасварыўся з кіраўніком, нанёс яму нажавое раненне ў вобласць сэрца і сышоў. Пасля яго сыходу ў кабінет зайшоў інжынер і ўбачыў, што кіраўнік мёртвы. Працоўны раней судзімы не быў, яму 27 гадоў, дырэктару быў 41 год. Вядзецца следства.

Падатковыя органы Віцебскай вобласці спынілі нелегальную дзейнасць жыхара абласнога цэнтра, які спецыялізаваўся на інфармацыйным забеспячэнні здзелак з аўтамабілямі. За плату ён прапаноўваў будучым аўтаўладальнікам інфармацыю пра гісторыю эксплуатацыі і тэхнічны стан аўто з Амерыкі, якія іх зацікавілі. Мужчына размяшчаў адпаведную аб'яву ў інтэрнэце і перыядычным друку, пры гэтым дзейнічаў без дзяржаўнай рэгістрацыі. Грамадзяне пераводзілі безнаяўныя грашовыя сродкі на нумар рахунка абанента сотавай сувязі, які ўказаў парушальнік. Рашэннем гаспадарчага суда вобласці чалавек аштрафаваны на Br350 тыс., у яго канфіскаваны выяўлены даход ад незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці ў памеры Br1,2 млн.

Поўны абзац

Сяроднестатыстычны жыхар Вялікабрытаніі праводзіць у стане пахмелля сумарна больш за 5 гадоў жыцця, паведамляюць СМІ са спасылкай на вынікі даследавання, праведзенага вытворцамі безалкагольных напояў. У апытанні прынялі ўдзел больш за паўтары тысячы чалавек. Згодна з вынікамі апытання, у перыяд з 21 да 38 гадоў брытанцы ў сярэднім пакутуюць ад наступстваў ужывання алкагольных напояў 60 дзён на год. У перыяд з 38 да 46 гадоў сярэдняя колькасць «пахмельных» дзён у годзе — 45, а з 46 да 60 — 23 дні. У агульнай працягласці гэта складае 1926 дзён, альбо 5,27 года. Удакладняецца, што, згодна з апошнімі звесткамі, штогод брытанцы прагульваюць 13 млн працоўных дзён з-за пахмелля. Дарэчы, год таму былі апублікаваныя вынікі аналагічнага даследавання, згодна з якімі сяроднестатыстычны брытанец тройчы на месяц прыходзіць на працу з пахмелля.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ГЕНПРАКУРАТУРА НАСТОЙВАЕ НА ЗВАЛЬНЕННІ ГЕНДЫРЭКТАРА «БАРЫСАЎДРЭВА»

Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведамілі ў прэс-службе Генпракуратуры.

Ліст з прапановай датэрмінова скасаваць кантракт з генеральным дырэктарам ААТ «Барысаўдрэў» Генпракурор Беларусі Рыгор ВАСІЛЕВІЧ накіраваў старшыням назіральнага савета ААТ «Барысаўдрэў» і Беларускага вытворча-гандлёвага канцэрна лясной, дрэваперапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці. Прычына такога рашэння, як паведамілі ў Генпракуратуры, — невыкананне кіраўніком прадпрыемства абавязкаў па гарантаванні бяспечных умоў працы, неаднаразовае ігнараванне прадпісанняў органа дзяржаўнага пажарнага нагляду.

Так, падчас праверкі ў чэрвені мінулага года на гэтым прадпрыемстве супрацоўнікі Барысаўскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях выявілі 303 парушэнні правілаў і нормаў пажарнай бяспекі. Па выніках праверкі выдалі прадпісанне аб ліквідацыі дапушчаных парушэнняў, якія без уважлівых на тое прычын былі праігнараваны. Падчас пазапланавай праверкі, якая адбылася ў студзені гэтага года, акрамя раней выяўленых і яшчэ неліквідаваных парушэнняў, пажарныя інспектары выявілі яшчэ 194 парушэнні (усяго 497).

У прыватнасці, у цэху запалкавай вытворчасці трубы сістэмы пажаратушэння, змацаваныя на столі, праржавелі, мацаванні ў іх практычна адсутнічаюць, таму пры надзвычайных абставінах яны могуць абарвацца і траўмаваць работнікаў. На трубах, якія забяспечваюць падачу ў цэх вады і цеплыні, а таксама на падаконніках — шматсантыметровы слой драўнянага пылу. Гэта, як сцвярджаюць спецыялісты, пры пэўных абставінах будзе спрыяць стварэнню выбухованебяспечнай канцэнтрацыі пылапаветранай сумесі і наступленню цяжкіх наступстваў. На транспарцёры, які падае запалкі для фасоўкі, усталяваны свяцільнік са звычайнай лямпачкай напальвання без святлорассейвальніка. Пры наведванні цэха непасрэдна пад гэтай лямпай знаходзіўся пачак запалак (упаў з транспарцёра), які мог у любы момант загарэцца ад нагрэву лямпай.

Надзея ДРЫЛА.

Надвор'е

Прыпячэ да плюс 26, а напрыканцы тыдня — навальнічныя дажджы

Мяркуецца, што ўвесь бягучы тыдзень у Беларусі захаваецца даволі цёплае надвор'е, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

У сераду і чацвер наша краіна застанецца ў зоне павышанага ціску, таму захаваецца малавоблачнае і сонечнае надвор'е, толькі ў асобных раёнах Віцебскай вобласці магчымы невялікі дождж. Тэмпература паветра ўначы на чацвер 6—12, удзень у сераду і чацвер ад плюс 19 на поўначы да 26 цяпла на поўдні Беларусі. Сіноптыкі адзначаюць, што такі тэмпературны фон прыкладна на 3—6 градусаў вышэй за норму ў гэты час.

Уначы на пятніцу 7—14, удзень — 19—26 цяпла. У суботу ў асобных раёнах магчымы невялікія дажджы, удзень — 17—23, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да 25 цяпла. 15 мая маларухомы атмасферны фронт прынясе ў Беларусь часам даволі сур'ёзныя навальнічныя дажджы. Уначы будзе 5—12, удзень — 16—23, у Гомельскай вобласці — да 26 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне начальніку ўпраўлення электронных сродкаў масавай інфармацыі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ядранцаву Уладзіміру Іванавічу з выпадку напаткаўшага яго вялікага гора — смерці МАЦІ.

Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае шчырае спачуванне начальніку ўпраўлення электронных сродкаў масавай інфармацыі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ядранцаву Уладзіміру Іванавічу з выпадку напаткаўшага яго непапраўнага гора — смерці МАЦІ.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ООО «ГородСтрой», ***напечатанную 07 апреля 2011 года в газете «Звязда».***

В разделе «Информация о проекте» абзац 2 Объект долевого строительства после слов «а также офисные помещения» дополнить словами «и машино-места».

Подпункт 1 абзаца 5 дополнить словами «– машино-место, связанное с Объектом долевого строительства – максимальной стоимостью 87 500 000 рублей. Срок ввода в эксплуатацию – 2 квартал 2013 года.».

После абзаца 7 добавить абзац 8 следующего содержания:

«Окружающие конструкции Машино-места:

Стены – бетонные окрашенные;

Потолок – бетонный окрашенный;

Пол – асфальтобетон

Въезд в подземный гараж-стоянку оборудуется автоматическими воротами с дистанционным управлением»

Спорт

«ДНЕПР» НАРЭШЦЕ ПЕРАМОГ, А МІНСКАЕ «ДЫНАМА» ШУКАЕ НОВАГА ТРЭНЕРА

Афіцыйна пакуль пра адстаўку галоўнага трэнера мінскага «Дынама» Алега Васіленкі не аб'яўлена, прэс-служба клуба паведамляе, што ён рыхтуе каманду да матча з жодзінскім «Тарпеда», але ў размовах з журналістамі Юрый Чыж пацвярджае свае намеры развітацца найхутчэй з расійскім спецыялістам. Што датычыць матча паміж дынамаўцамі Мінска і Брэста, то тут нічыя — 1:1. Сталічны клуб працягвае займаць дзясятае месца ў турнірнай табліцы. На апошнім месцы па-ранейшаму магілёўскі «Днепр», праўда, восьмы тур стаў для клуба паспяховым — першыя тры ачкі прынёс матч з жодзінскім «Тарпеда» — 3:1 на карысць магіляўчан. На адзінаццатым месцы пакуль «Мінск», але і для гэтага сталічнага клуба тур аказаўся ўдалым: мінімальная перамога (1:0) над «Нёманам». Затое БАТЭ працягвае адрывацца ад канкурэнтаў. Учыніўшы разгром «Віцебску» (4:1), клуб працягвае лідзіраваць у турнірнай табліцы. «Гомель» святкаваў перамогу над «Белшынай» — 3:1. «Шахцёр» унічыю (1:1) згуляў з «Нафтанам». Турнірнае становішча: БАТЭ — 20 ачкоў, «Гомель» — 13, «Нёман» — 11, «Тарпеда—БелАЗ» — 11, «Белшына» — 11, «Шахцёр» — 11, «Віцебск» — 10, «Дынама» (Брэст) — 10, «Нафтан» — 9, «Дынама» (Мінск) — 9, «Мінск» — 9, «Днепр» — 5.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ЗАСТАЛІСЯ Ў ЭЛІЦЕ

У заключным матчы «рэлігейшн-раўнда» нашы хакеісты абыгралі каманду Славеніі (7:1) і занялі чатырнаццатае месца сярод шаснаццаці каманд, выканаўшы задачу-мінімум і захаваўшы прапіску ў найвышэйшым дывізіёне.

Нагадаем, што ў турніры на вылыванне беларусы правялі тры матчы — выйгралі ў Аўстрыі (7:2), прайгралі латышам (3:6) і перамаглі Славенію. Галоўны трэнер Эдуард Занкавец ацаніў выступленне сваіх падапечных на «два з плюсам»:

— У цэлым вынік нашага выступлення ацэньваю, вядома, як нездавальняючы. Ад нас усе чакалі больш паспяховага выніку, і мы сябе на яго настройвалі. Магчыма, гэта і сыграла з намі злы жарт. Мы ўжо рыхтаваліся да бітвы за выхад у чвэрцьфінал, але забылі, што трэба яшчэ прайсці кваліфікацыйны раўнд. Бачу прычыну такога выступлення і ў селекцыі. Аказалася, што тыя гульцы, якіх мы вырашылі ўзяць у апошні момант, згулялі лепш, чым хакеісты, у якіх не было сумненняў. У цэлым за наша выступленне магу паставіць адзнаку два з плюсам.

Не задаволены выступленнем і наш капітан **Міхаіл ГРАБОЎСКІ**:

— Я не чытаю газет і не гляджу тэлевізар, таму не ў курсе навін. Але я магу ўявіць, што зараз творыцца дома. Мы — хакейная дзяржава, у нас шмат стадыёнаў, але нам трэба больш працаваць з маладымі талентамі. У нашай краіне не так шмат зорак, але добрых гульцоў дастаткова.

Алена КРАВЕЦ.

АЗАРАНКА — ЧАЦВЁРТАЯ

На прэстыжным тэнісным турніры ў Мадрыдзе з прызавым фондам 4,5 мільёна долараў Вікторыя Азаранка выйграла спаборніцтвы ў парным разрадзе, а ў адзіночным дайшла да фіналу.

У пары з расіянкай Марыяй Кірыленка Віка выйграла ў фінале ў дуэта Квета Пешке (Чэхія) — Катарына Срэботнік (Славенія) — 6:4, 6:3. А вось у адзіночным разрадзе Азаранка ў фінале саступіла чэшцы Петры Квітавай, якая мае 18-ы рэйтынг, — 7:6, 6:4. Паспяховае выступленне Азаранкі дазволіла ёй падняцца ў рэйтынгу на 4-е месца. Напарадзе Каралін Вазняцкі (Данія), Кім Клійстэрс (Бельгія) і Вера Звонарова (Расія).

Подведены итоги рекламной игры «Счастливый ски-пасс Логойска», которая проводилась горнолыжным спортивно-оздоровительным комплексом «Логойск» с 3 февраля 2011 года по 10 мая 2011 года.

Победителями рекламной игры и обладателями призовых сертификатов от ЧУП «Альпика-спорт» стали:

Призовой сертификат на сумму 250 000 рублей:
Харитонов Максим, г. Минск, Яхницкая Валерия, г. Минск.
Призовой сертификат на сумму 150 000 рублей:
Блажко Дмитрий, г. Минск, Абрамчик Ариадна, г. Минск.
Подарочный сертификат на сумму 100 000 рублей:
Лукша Николай, г. Логойск, Дубровская Ольга, г. Минск.

ПОЗДРАВЛЯЕМ ПОБЕДИТЕЛЕЙ.

Благодарим Всех принявших участие в рекламной игре «Счастливый ски-пасс Логойска».

Свидетельство № 1845 от 01.02.2011 г., выданное Министерством торговли Республики Беларусь. УНП 601027788.

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество
«Сберегательный банк «Беларусбанк»,
расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 17 МАЯ 2011 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. Об утверждении изменения в Положение о службе внутреннего аудита ОАО «АСБ Беларусбанк».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 14 мая), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 17 мая) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – 14 мая 2011 года.

Телефоны для справок: (8 017) 218 84 12, 218 84 73.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ОБЪЯВЛЕНИЕ
О проведении хозяйственным судом Витебской области публичных торгов по продаже имущества, принадлежащего ЧТПУП «Торгтехносервис»
(Витебская область, г. Новополоцк, пер. Рижский, 5, УНП 300116365),
методом повышения начальной цены с минимальным первоначальным размером шага пять процентов от стоимости лота.

№ лота	Название и описание предметов	Начальная стоимость (с учетом НДС)
1.	Незавершенный строительством объект недвижимости с инвентарным номером 200/U-52081, двухэтажное кирпичное здание площадью 1 994,1 м.кв., назначение – магазин «Дары леса», расположенный по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 63А.	1 554 000 000

Время проведения торгов — 10 июня 2011 года, в 12.00, в хозяйственном суде Витебской области, каб. 324.

Первоначальный шаг торгов 5% от начальной стоимости лота.

В соответствии с Хозяйственным процессуальным кодексом Республики Беларусь, лицу, желающему принять участие в торгах, необходимо подать заявку в хозяйственный суд Витебской области, оформить подписку об отсутствии препятствий, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, для приобретения имущества, а также внести задаток – не позднее 24 часов, до момента начала проведения торгов денежные средства должны быть зачислены на счет суда.

Заявки принимаются в хозяйственном суде Витебской области в рабочие дни с 9.00 до 18.00.

Сумма задатка в размере 10% от начальной стоимости лота перечисляется на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО СБ «Беларусбанк» г. Витебск, код 259, УНП 300007670.

Сумма предоплаты, внесенная лицом, купившим с торгов имущество, зачисляется в счет покупной цены. Остальным участникам торгов внесенные ими суммы по их заявлению возвращаются в течение пяти рабочих дней после окончания торгов.

Победитель аукциона обязан возместить затраты суда на организацию и проведение аукциона.

По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться в отдел исполнения постановлений хозяйственного суда Витебской области по телефонам:
тел./факс: (80212) 49 13 42, (8 029) 150 24 10
(судебный исполнитель Халков Дмитрий Вячеславович)
и на сайт хозяйственного суда Витебской области www.court.by, e-mail:vitsud@tut.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 14 июня 2011 года в 11.00 по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, конференц-зал.

Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице Могилевского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества по следующим лотам:

Лот № 1 – отдельные помещения в капитальном строении на 4 этаже общей площадью 614,3 кв.м, в том числе отдельные помещения (38,3 + 5,0 + 559,5 + 4,2 кв.м) и вспомогательные площади (7,3 кв.м) по бульвару Юбилейному, д. 21 в г. Могилеве. Срок договора аренды – на неопределенный срок, но не менее 3-х лет; коэффициент по пункту 9.2. Указа Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 года № 518 «О некоторых мерах аренды и безвозмездного пользования имуществом» 3,0; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли, требуется капитальный ремонт.

Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 5 375 125 рублей; размер задатка составляет 537 513 рублей.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

Документы на участие в аукционе принимаются с 13.05.2011 года по 10.06.2011 в рабочее время (с 8.00 до 17.00) по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, каб. 401. Документы, поданные после 10.06.2011 года, не рассматриваются.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с 3012200007522 в филиале № 700 Могилевского областного управления АСБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700838273, Могилевский филиал РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- представляет копию платежного документа о перечисл

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«ЗА НАШУ ПЕРАМОГУ!»

Жыхары Ганцавічаў святкуюць Дзень Перамогі.

Святкаванне Дня Перамогі ў Мінску.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Шануй сваё!

У калекцыі сланімчанкі — французская чарніліца, партызанская лямпа і бязмен пушкінскай пары...

Звычайная трохпакаёвая кватэра ў сланімчан Валерыя Пятровіча і Ніны Міхайлаўны Анішчыкаў даўно ператварылася ў музей старых рэчаў XVIII—XX стагоддзяў. Чаго там толькі няма: і рарытэтныя прасы, і самавары, і званочкі, гадзіннікі, чайнікі, фотаапараты, чарніліцы, керагазы, кнігі... На днях з дазволу гаспадароў гэтай кватэры журналіст пабываў у гасцях у сям'і Анішчыкаў, каб насамрэч паглядзець калекцыю. Валерый Пятровіч быў на працы, а журналіста сустракала сама гаспадыня і заўзяты калекцыянер Ніна Міхайлаўна.

Самае ганаровае месцы ў кватэры Анішчыкаў займаюць прасы. Для іх, як і для многіх іншых экспанатаў, слонімскія калекцыянеры зрабілі спецыяльныя паліцы. Але нашу сустрэчу і гутарку мы пачалі не з прасаў, а запыталіся ў Ніны Анішчык: як узнікла гісторыя іх калекцыяніравання?

— Дзесьці ў 1976 годзе нам прапанавалі купіць партрэт індзейца. І мы за апошнюю савецкую дзясятку яго купілі. Партрэт гэты захоўваецца ў нашай кватэры да сённяшніх дзён. А потым да нас трапіў першы вугальны прас ад бабулі са Свіслацкага раёна. Потым я прывезла прас з Карэліі, пачалі прыносіць прасы сябры, суседзі, сваякі. Так і з'явілася ў нашай кватэры вялікая калекцыя прасаў. Цяпер у нас іх каля 200 штук, — прызналася Ніна Міхайлаўна.

— Якія прасы ў вашай калекцыі самыя каштоўныя?

— Для нас яны ўсе каштоўныя. Ёсць у нас прасы лідскія, пінскія, магілёўскія. Магілёўскі ложкавы завод некалі вырабляў і прасы. Раней у каго на вёсцы быў прас — гэта быў багаты чалавек. Гэтыя прасы ставілі на сурвэтку на стол пад абразом. У нашай калекцыі ёсць і бронзавы прас з альбярцінскага палаца Пуслоўскіх. Мы яго купілі гадоў дзесяць таму ў адной бабулі, якая працавала ў маладосці служанкай у Пуслоўскіх. Калі савецкія войскі прыйшлі ў Слонім у 1939 годзе, Пуслоўскія з'ехалі на Захад. А гэты каштоўны прас яны пакінулі служанцы на памяць. Цяпер ён у нашай калекцыі.

— Побач бачу і алюмініевы прас. А як маглі ім прасаваць бялізну, калі ён пры награванні мог расплавіцца?

— Вядома, алюмініевым прасам немагчыма прасаваць бялізну. Быў час, калі алюміній нельга было вывозіць за мяжу. Таму выраблялі такія прасы і спакойна перавозілі, як неабходную для сям'і хатнюю рэч.

— А цяпер раскажыце нам пра вашу калекцыю званочкаў.

— У нас іх няшмат. Але ёсць. Гучаць усе яны па-рознаму. Прымяняліся часцей за ўсё званочкі ў храмах. Ёсць нават званочкі з завода Васіля Ведзянеева з Ніжагародскай губерні Расіі.

— Ніна Міхайлаўна, а хто вы па прафесіі?

— Я скончыла гістарычны факультэт. Але больш за 30 гадоў адпрацавала ў Слонімскім медыцынскім вучылішчы. Выкладала сацыялогію, філасофію, паліталогію. А муж — інжынер-механік, але, як і я, вельмі любіць гісторыю і старыя рэчы.

— Кідаюцца ў вочы ў вашай калекцыі і розныя старыя падсвечнікі.

— Я люблю падсвечнікі. Нядаўна наша калекцыя папоўнілася старым падсвечнікам з-пад вёскі Азярніца Слонімскага раёна. Трапіла да нас і срэбная карона 1795 года з-пад вёскі Новадзявяткавічы.

— Цяпер раскажыце нам пра вашу калекцыю лямпаў, фотаапаратаў, вагаў, тэлефонаў.

— Лямпы ў нас усе розныя і вельмі простыя. Ёсць у нас лямпы пушкінскай пары, старыя лямпы чыгуначнікаў і шахцёрскія лямпы. І нават адна лямпа партызанская, драўляная. Яе нам прынесла адна бабуля і сказала, што лямпа яшчэ з вайны вісела ў каморцы. Яна там яе знайшла і перадала нам. Ёсць у нас і «лятучыя мышы» («кажаны»), якія выраблялі ў Савецкім Саюзе, у Кітаі і ў Германіі. Фотаапаратаў мы маем няшмат. Вось фотаапарат 1938 года, ёсць фотаапараты «Масква», «Змена», «Чайка» і іншыя. У калекцыі нашай ёсць англійскія вагі і бязмены. Адзін бязмен 1839 года. А вось гірка вагой 2 фунты для вагаў. Выпушчана яна была ў 1879 годзе. Калекцыя савецкіх тэлефонаў у нас — ваеннага часу. Праўда, ёсць і два тэлефоны 1943 года, амерыканскія, упакаваныя ў скураныя чахлы. Калекцыю дапаўняюць медныя кацялкі 1914 года, чайнік 1943 года і г.д. А вось такімі вялікімі падковамі падкоўвалі цяжкавагавых бельгійскіх коней «першырон». У гады вайны яны цягалі гарматы.

— Скажыце пару слоў пра калекцыю гадзіннікаў.

— Найбольш каштоўным з'яўляецца французскі гадзіннік 1905 года. Калі мы жылі з мужам на прыватнай кватэры, гаспадыня рабіла рамонт і хацела гэты гадзіннік выкінуць. Мы яго папрасілі ў яе, і яна нам аддала. Мы гадзіннік адрэстаўрыравалі, адрамантавалі, і ён працуе.

— У вашай кватэры нельга абмінуць калекцыю пішучых прыналежнасцяў.

— Іх у мяне шмат: ручак, пёраў, чарнілец. Сярод іх — і чарніліца паходная. Неяк я чытала кнігу пра Барадзіно, там было шмат ілюстрацый, звязаных з падзеямі 1812 года. Сярод ілюстрацый я і ўбачыла чарніліцу, якая ў Напалеона на стале стаяла. Такая ёсць і ў маёй калекцыі. Вядома, гэтая чарніліца не Напалеона, але такія былі ў французскіх салдат.

— Ніна Міхайлаўна, што ў будучым вы плануеце зрабіць са сваёй унікальнай калекцыяй?

— Мы марым стварыць у Слоніме музей простых рэчаў. Але ці збудзецца наша мара — не ведаю. Трэба, каб была зацікаўленасць і з боку мясцовай улады, якая нам дапамагла б. Калі гэтага не здарыцца, то мы сваю калекцыю перададзім дзецям і ўнукам у спадчыну. Справа ў тым, што да нас шмат прыходзіць школьнікаў, студэнтаў, каб паглядзець гэтыя старыя рэчы. Яны не толькі бачаць гэтыя старыя рэчы, але мы ім дазваляем іх патрымаць у руках, добра разгледзяць, папісаць старымі ручкамі і абмакнуць іх у чарніліцы, пазваніць званочкамі...

Сяргей ЧЫГРЫН.
Фота аўтара.

НА САМАЕ ГАЛОЎНАЕ СВЯТА

Дзень Перамогі ў Клімавічах.

Фота Таццяны ПАДЛІПСКАЙ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

70 ГАДОЎ ТАМУ НА ГЭТЫМ МЕСЦЫ...

ЯК ЗАЎСЁДЫ, брастаўчане 9 мая прыйшлі ў крэпасць. З самага ранку сюды павольна рухаліся патокі людзей: ветэраны, моладзь, сем'і з дзецьмі. Многія ішлі арганізаванымі калонамі, было відаць, што гэта працоўныя альбо студэнцкія калектывы. Цікава, што пасля завяршэння мітынгу і ўсіх афіцыйных мерапрыемстваў насустрач тым, хто выходзіў з легендарнай цытадэлі, таксама рухалася нямала гараджан. Тыя, хто не вельмі любіць удзельнічаць у масавых мерапрыемствах, ішлі сюды пасля. Але ўсё роўна ішлі, бо крэпасць — асаблівае месца для кожнага жыхара горада.

Сцяпан Каламіец, Любоў Варчанка.

І падчас выступлення **старшыні Брэсцкага аблвыканкама Канстанціна СУМАРА** прагучала тое, што апошнім часам ніяк нельга абысці: менавіта тут, на зямлі Брэсцкай крэпасці, 70 гадоў таму пачалася вайна, і тут вораг пацярпеў першае паражэнне. Крыху больш за месяц застаецца да гэтага асаблівага юбілею. І ўсё менш прыходзіць у крэпасць людзей, якія былі ўдзельнікамі вайны, сведкамі тых гераічных і трагічных падзей.

Вось што сказалі ветэраны, з якімі давялося пагутарыць за некалькі хвілін да пачатку ўрачыстасцяў.

Міхаіл Іванавіч ГРЫГАРЭНКА родам з Украіны, вайну сустрэў на мяжы з Афганістанам — быў пагранічнікам. На фронце — з 14 кастрычніка 1941 года. Вызваляў Тулу, Калугу, Серпухаў, Бранск, затым Хойнікі, Гомель, Бабруйск, Слуцк, Івянец, Навагрудак, Баранавічы, Брэст. У Брэсце прайшло ўсё пасляваеннае жыццё. У ветэрана трое дзяцей, чацвёра ўнукаў. Ён сказаў так: «З гадамі адыходзяць успаміны дэталяў, падрабязнасцяў, але застаецца галоўнае — адчуванне цяжару вайны, цяжару салдацкай працы. Кожны горад, які адстаялі, даваўся неверагоднымі намаганнямі, цяжкімі баямі, вялікімі стратамі баявых таварышаў. Не хочацца, каб пра гэта забываліся. Таму і прыходзім сюды, пакуль жывыя».

Сцяпан Савельевіч КАЛАМІЕЦ узначальвае гарадскую арганізацыю ветэранаў вайны Брэста. Ён сказаў так: «У горадзе нас засталося 714 чалавек. Далёка не ўсе могуць прыйсці на свята. Большасць з нашых таварышаў, на жаль, сустракае галоўнае свята кожнага франтавіка дома. Але савет ветэранаў Брэста праз грамадскія, моладзевыя арганізацыі стараецца прывеціць кожнага, нікога не пакінуць без увагі. Гэта вельмі важна сёння для любога ўдзельніка вайны — тое, што пра яго не забываюць».

Любоў Мікалаеўна ВАРЧАНКА 12-гадовай дзяўчынкай сустрэла вайну ў гарнізоне Брэсцкай крэпасці. Усё адбывалася на яе вачах. Цуд ужо тое, што яна засталася жыць. На яе вачах бацьку, малодшага камандзіра, разарвалі нямецкія аўчаркі. Тады яна стала дарослай... Яна і цяпер не можа гаварыць пра гэта спакойна, слёзы душаць. Супакойваецца, калі пераходзіць на іншую тэму:

«Я нядаўна стала прабабуляй. І чым болей жыву, чым больш размаўляю з цяперашняй моладдзю, тым дакладней разумею: мы павінны данесці да іх галоўную праўду вайны. А яны павінны зразумець, што жывуць толькі таму, што ў 45-м была атрымана перамога над фашызмам. Зараз мы маем дастаткова гістарычных крыніц, з якіх вынікае, што нямецкі фашызм меў на мэце вырашэнне славянскага пытання шляхам знішчэння большай часткі насельніцтва і ператварэння яго меншай часткі ў рабоў у прамым сэнсе слова. Таму наша перамога была не толькі ваеннай перамогай. Калі яны зразумеюць гэта, будзе вельмі добра».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

«Зара» на дняпроўскіх хвалях

У Магілёўскай вобласці 9 Мая адкрылі сезон навігацыі на Дняпры. На цеплаходзе «Зара» ад Магілёва да аграгарадка Александрыя Шклоўскага раёна пракаціліся ветэраны вайны разам са старшынёй Магілёўскага аблвыканкама Пятром Руднікам. Цеплаходу болей за тры дзясяткі гадоў, але «Зару» паставілі на ваду толькі пасля вялікага капітальнага рамонту. Судна на хаду, і хуткасць у 30 кіламетраў у гадзіну падыходзіць для камфортных рачных прагулак. Сёння маршрут турыстычнага цеплахода разлічаны на 2,5 гадзіны: ад рачнога порта ў Магілёве да Александрыі і назад, з прыпынкам на славутай шклоўскай Лысай гары. Будуць і новыя турыстычныя маршруты, з наведваннем заасада ў аграгарадку Буйнічы Магілёўскага раёна.

Ілона ІВАНОВА.

Твае правы

ДЗЕ ДЗЕЦІ — ТАМ І ГАРАНТЫІ

ТАКІЯ не надта прыемныя з'явы, як павелічэнне ў жанчын узросту для нараджэння дзіцяці і рост колькасці сем'яў з адным дзіцем, маюць даволі канкрэтную прычыну: усё больш бацькоў аддаюць перавагу ўласнай кар'еры. Прычым тут даводзіцца хіба што канстатаваць усім відавочны факт: наяўнасць дзіцяці, асабліва малога, сапраўды не спрыяе павышэнню канкурэнтаздольнасці на рынку працы. Аднак менавіта з улікам гэтага таксама нельга не заўважыць: заканадаўства вызначае для тых жа бацькоў з непаўналетнімі дзецьмі дадатковыя працоўныя гарантыі.

Пяць гадоў — толькі мінімум

Не сакрэт, што нежаданне нараджаць часам тлумачыцца даволі проста — думкамі аб рызыцы страты працоўнага месца. Аднак падобнае меркаванне памылковае. Наша заканадаўства катэгарычна забараняе наймальнікам усіх формаў уласнасці звальняць цяжарных жанчын.

— Да таго ж, паводле Указа кіраўніка дзяржавы № 180 ад 12 красавіка 2000 года, наймальнік абавязаны працягнуць або заключыць новы кантракт з працуючай жанчынай, якая знаходзіцца ў водпуску па цяжарнасці і родах, а таксама з маці, бацькам або апекуном, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, — не менш чым да тэрміну заканчэння гэтых водпускаў, — падкрэслівае **намеснік начальніка аддзела працы і зарплаты камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Яўген КАЗАКЕВІЧ**. — А надалей са згоды маці, бацькі ці апекуна, якія знаходзіліся ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і прыступілі да працы або пасля заканчэння тэрміну гэтага водпуску, той жа наймальнік павінен працягнуць або заключыць новы кантракт — да моманту, пакуль дзіцяці не споўніцца 5 гадоў.

Прычым гэта — толькі мінімум. Больш высокія гарантыі па працягу або заключэнні кантрактаў могуць вызначацца непасрэдна ў калектыўных дагаворах арганізацый. Адно, што пры гэтым неабходна мець на ўвазе: максімальны тэрмін дзеяння кантракта не можа перавышаць пяці гадоў.

Каму «лішні» выхадны?

Выхаванне дзяцей патрабуе часу, прычым часта тут «стандартных» выхадных недастаткова.

— Нялішне заўважыць, што маці, бацьку ці апекуну, якія выхоўваюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, на падставе заявы можа прадастаўляцца адзін дадатковы, свабодны ад працы дзень у месяц з аплатай па сярэднім заробку за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, — распавядае Яўген Казакевіч. — Апроч таго, маці або бацьку, якія выхоўваюць дваіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, на падставе заявы можа прадастаўляцца адзін дадатковы выхадны ў месяц з аплатай на ўмовах, прадугледжаных у калдагаворы. А маці, бацька ці апякун, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў або дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, пасля падачы пісьмовай заявы маюць падставы разлічваць на адзін дадатковы свабодны ад працы дзень у тыдзень з аплатай па сярэднім заробку на ўмовах, вызначаных Саветам Міністраў.

Прычым зноў жа: права на дадатковыя выхадныя можа быць выкарыстана маці, бацькам ці апекуном, або, як варыянт, такое права магчыма падзяліць паміж гэтымі асобамі па іх меркаванні. Адно, што тут варта заўважыць: калі ўзнікаюць падставы для прадастаўлення дадатковага выхаднога ў тыдзень і ў месяц адначасова, то скарыстацца такім выхадным магчыма толькі па адной з дзвюх падстаў — па выбары работніка.

— Часам таксама ўзнікае неабходнасць узяць водпуск без захавання зарплаты, таму трэба адзначыць: па жаданні работніка наймальнік абавязаны прадаставіць такі водпуск працягласцю да 14 каляндарных дзён жанчынам, якія маюць двух і больш дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў або дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, — кажа Яўген Казакевіч. — Што ж да водпуску без захавання зарплаты большай працягласці, то наконт яго прыйдзецца дамаўляцца з наймальнікам. А плюс да таго заўважым: парадак прадастаўлення і тэрміны такіх водпускаў могуць вызначацца ў калдагаворах арганізацый.

Калі працаваць — немагчыма

Працоўны кодэкс уводзіць забарону на прыцягненне да звышурочных работ у выхадныя і святочныя дні, а таксама накіраванне ў камандзіроўку цяжарных жанчын і жанчын з дзецьмі ва ўзросце да 3 гадоў. Гэтаксама цяжарным забараняецца начная праца. А жанчыны з дзецьмі да 3 гадоў могуць выходзіць на працу з 22 да 6 гадзін толькі пры ўмове асабістай пісьмовай згоды.

Нарэшце, варта падкрэсліць: жанчыны з дзецьмі ва ўзросце ад 3 да 14 гадоў або дзіцем-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў могуць прыцягвацца да начных і звышурочных работ, работ у выхадныя і святочныя дні, накіроўвацца ў камандзіроўку зноў жа выключна пры ўласнай пісьмовай згодзе.

— У гэтым выпадку неабходна звярнуць увагу на адзін момант, — працягвае Яўген Казакевіч. — Бацька, які выхоўвае дзяцей без маці, а таксама апякун ці папячыцель дзяцей адпаведнага ўзросту маюць такія ж правы на гарантыі заканадаўства, калектыўных дагавораў ці пагадненняў, як і жанчыны-маці.

«Зручны» час з дамовай

Даволі распаўсюджаная з'ява — неабходнасць «асаблівага рэжыму» працы. Скажам, у сувязі з неабходнасцю забіраць дзіця з садка бацькам больш зручна, калі іх працоўны дзень пачынаецца і заканчваецца раней, чым у іншых супрацоўнікаў арганізацыі.

— Закон не прадугледжвае нормы, паводле якой у выпадку неабходнасці наймальнік абавязаны змяняць рэжым працы бацькоў непаўналетніх дзяцей, — тлумачыць Яўген Казакевіч. — Аднак наконт змянення рэжыму работнік і наймальнік могуць проста дамовіцца — закон гэтага не забараняе. Дарэчы, пры гэтым заканадаўства прадугледжвае: наймальнік абавязаны вызначыць няпоўны працоўны дзень ці няпоўны працоўны тыдзень па просьбе жанчыны, якая мае дзіця ва ўзросце да 14 гадоў і ў тым ліку дзіця, якое знаходзіцца на папячэнні.

Аднак бывае і так: у сувязі з неабходнасцю даглядаць дзяцей узнікае патрэба ў звальненні. Ці можна тут ставіць пытанне аб датэрміновым скасаванні кантракта?

— Датэрміновае скасаванне кантракта па патрабаванні работніка магчымае ў сувязі з яго інваліднасцю ці хваробай, якія перашкаджаюць выкананню працоўных абавязкаў, у сувязі з парушэннем наймальнікам заканадаўства аб працы, умоў таго ж кантракта або калектыўнага дагавора, а таксама па іншых прычынах, уважлівасць якіх ацэньвае наймальнік, — адзначае Яўген Казакевіч. — Прычым у выпадку адмовы наймальніка ад звальнення можна паспрабаваць урэгуляваць гэта пытанне праз суд.

Сяргей ГРЫБ.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 27 мая 2011 года проводит 2-й повторный открытый аукцион на 8-м открытом аукционе по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Наработка в м/ч (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
4.	Самолёт Ан-24Б № 99902203, дв. Аи-24 с. 2 № Н4912105, дв. Аи-24 с. 2 № Н4012035, дв. ТГ-16 № АТ945005, 5 402 посадки, 3 КВР-1994 г.	н.п. Мачулищи, в/ч 06752	1969	5 118	650 000 000	65 000 000
5.	Вертолёт Ми-26 № 34001212099, дв. Д-136 № 2251364001029, дв. Д-136 № 2251362601143, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 612А8В010	н.п. Мачулищи, в/ч 06752	1986	590	3 680 000 000	368 000 000
6.	Вертолёт Ми-26 № 34001212131, дв. Д-136 № 2251364001063, дв. Д-136 № 2251364001064, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 722А8В017	н.п. Мачулищи, в/ч 06752	1987	594	3 870 000 000	387 000 000
7.	Вертолёт Ми-26 № 34001212104, дв. Д-136 № 2251364001067, дв. Д-136 № 2251364001068, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 622А8В006	н.п. Мачулищи, в/ч 06752	1986	593	3 680 000 000	368 000 000
8.	Вертолёт Ми-26 № 34001212018, КАУ-140 № 82110014030, КАУ-140 №821100140032, КАУ-140 №821110140041, КАУ-140-01 № 821033010004, дв. ТА-8В № 042А8В058, 1 КВР-1990 г.	н.п. Мачулищи, в/ч 06752	1983	1 774	2 270 000 000	227 000 000

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 27 мая 2011 года проводит 6-й повторный открытый аукцион на 8-м открытом аукционе по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Наработка в м/ч (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
41	Грузовой Урал-43202 ш. 094988, дв. 240127, 3 кат.	н.п. Заслоново, в/ч 71327	1988	129 714	11 000 000	1 100 000
42	Грузовой бортовой КрАЗ-250 ш. 583093, дв. 037281, 4 кат.	г. Ст. Дороги, в/ч 48668	1987	21 207	15 000 000	1 500 000
43	Автошасси МАЗ-5334 ш. 5905, дв. 629012, 4 кат., кузов-фургон КМ-500, б/номера	н.п. Лесная, в/ч 52215	1979	81 193	18 000 000	1 800 000
44	Грузовой Урал-43202 ш. 041265, дв. 052415, 3 кат.	г. Новогрудок, в/ч 14103	1985	163 371	11 000 000	1 100 000
47	Автоцистерна АЦ-8-5334 ш. 31317, дв. 039003380, с/о А587, 2 кат.	г. Гродно, в/ч 2141	1981	83 773	59 000 000	5 900 000
48	Автотопливомасло-заправщик АТМЗ-5-4320 ш. 032406, дв. 699329, с/о 1703, 2 кат.	г. Гродно, в/ч 2141	1984	51 935	33 000 000	3 300 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00, **27 мая 2011 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 часов 25 мая 2011 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **27 мая 2011 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в Центре банковских услуг № 701 ОАО «БПС Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

БЭРН: КАЛЕКТЫЎ УНІКАЛЬНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ, СУЧАСНЫ БРЭНД І ДОБРАЕ ІМЯ

Майстар Валянцін ІСАЕЎ і галоўны інжынер участка Аляксандр БУЧЫК вызначаюць аб'ём рамонтных работ.

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

— Гэта даволі складаныя задачы. Вашы спецыялісты маюць дастатковую кваліфікацыю?

— У нашым прадпрыемстве інжынерны цэнтр мае каля 300 спецыялістаў сапраўды вышэйшай кваліфікацыі. Па пускавой, рэжымнай наладцы энергетычнага абсталявання, аказанні розных паслуг эксплуатацыйнаму персаналу, па функцыянаванні сапраўды магутнага абсталявання — падобнага прадпрыемства такога высокага ўзроўню, спецыялізацыі і кваліфікацыі ў нашай краіне больш няма. Ёсць іншыя падобныя падраздзяленні, аднак якасць іх паслуг і сфера дзейнасці значна вузейшая і крыху не тая.

— Моцны калектыў такіх прафесіяналаў павінен карыстацца стабільным попытам не толькі на тэрыторыі нашай краіны, але і за мяжой...

— Так. Справа ў тым, што на постсавецкай прасторы, пасля развалу Саюза, мы цалкам захавалі свой патэнцыял. Падобныя моцныя арганізацыі былі ў Савецкім Саюзе і на тэрыторыі Расіі. Аднак гэтыя структуры ў Расіі з цягам часу згубілі свае пазіцыі, бо жорсткі рынак іх прыціснуў вельмі моцна. БЭРН цалкам захаваў кваліфікаваны персанал, неабходны тэхналагічны ўзровень. Сёння мы не проста падтрымліваем гэты ўзровень, але і крочым наперад — займаемся пераўзбраеннем і развіццём.

Раней пусканаладачныя работы мы выконвалі толькі па дробязі, а галоўным чынам займаліся рэжымнай наладкай. Нашы спецыялісты аказвалі паслугі па дапамозе эксплуатацыйнаму персаналу абслугоўваць абсталяванне. Рабілі выпрабаванні абсталявання, распрацоўвалі праграмы эксплуатацыі, складалі інструкцыі і гэтак далей.

Упершыню сур'ёзны вопыт па пусканаладачных работах мы атрымалі за мяжой. У Нігерыі спецыялісты прадпрыемства напрацавалі неабходны вопыт на новым абсталяванні і падцягнулі сваю кваліфікацыю. Потым каля 10 гадоў запар мы ажыццяўлялі пуск энергетычных блокаў адзін за адным ужо ў Іране. Гэта было ў тыя хвацкія 1990-я гады. Буйны іранскі кантракт дазволіў захаваць персанал. Работнікам мы тады за мяжой не вельмі шмат (і разам з сутачнымі) плацілі — недзе 1000 долараў. Аднак, калі ў краіне ўсе атрымлівалі недзе 100 долараў, а тут 1000 «зялёных»... Вы ведаеце, да нас чарга са спецыялістаў стаяла, каб зарабляць такія грошы. У 1991—2000 гадах мы падцягнулі кваліфікацыю персаналу за мяжой, цалкам захавалі калектыў і стварылі моцную каманду. Разам з тым, БЭРН тады ў Іране выконваў даволі складаныя задачы па пуску блокаў магутнасцю 300 мегават. Сёння на базе шматгадовага вопыту працы на замежных аб'ектах, у тым ліку іранскага станоўчага вопыту, мы маем магутны інжынерны цэнтр, які цяпер выконвае вельмі сур'ёзныя праекты ўжо і ў Беларусі.

— Калі мы закранулі тэму заробкаў, то заўважу, што ў вашай сістэме заробкі і цяпер добрыя...

— Наша акцыянернае таварыства працуе па прынцыпе гаспадарчага разліку. Кожны напрамак у БЭРНе павінен самастойна зарабляць грошы і сам сябе забяспечваць. Вядома, што асобным структурам мы дапамагаем, аднак прынцып гаспадарчага разліку абавязкова дзейнічае. Менавіта таму кожны напрамак імкнецца перспектыўна развівацца, а не спіць у шапку і чакае датацый. Рамонт энергетычнага абсталявання забяспечвае фінансамі сваю структуру, мантаж ці наладка — сваю. Калі сярэдні заробак па прадпрыемстве складае прыкладна 2 млн 100 тысяч рублёў, то гэта не гаворыць аб тым, што ўсе нашы супрацоўнікі атрымліваюць аднолькавыя грошы.

— У вас ёсць магчымасць ажыццяўляць гібкую фінансавую палітыку і плаціць высокакваліфікаваным і перспектыўным спецыялістам такія грошы, каб у іх не было нейкіх бытавых праблем...

— Так, мы спрабуем гэта рабіць. Аднак бывае, што тыя ці іншыя напрамкі «прабуксоўваюць». Напрыклад, існуе тэндэнцыя, што рамонтных работ для нас стала менш. Гэта звязана з тым, што ў энергетычнай сістэме ўводзіцца ў дзеянне новае абсталяванне, акрамя таго, прысутнічае жорсткая эканомія затрат на вытворчасць на прадпрыемствах аблэнерга, Мінскэнерга і г.д. Тады першы артыкул расходаў, які ідзе пад скарачэнне, датычыцца рамонтных работ. Такія скарачэнні паўплываюць і на нашу дзейнасць. Робіцца менш работ, а гэта ў сваю чаргу б'е па заробках.

— У гэтым выпадку кіраўніцтва прадпрыемства павінна шукаць выйсце?

— Гэта мы і робім. Менавіта таму мы асвойвалі раней і працягваем цяпер ажыццяўляць мантажныя работы тым жа персаналам, які займаўся рамонтам. Мы зараз спрабуем замясціць рамонтныя работы. На прынцыпе дзеяння паміж рамонтнымі і мантажнымі работамі не існуе вялікай розніцы, калі параўноўваць па фізічных затратах. Акрамя таго, 10 гадоў таму мы за мяжой ужо працавалі і не толькі ў Іране. Цяпер за мяжой мы карыстаемся не проста ўпэўненым, а нават вялікім попытам. Толькі за 2010 год намі было выканана 27 кантрактаў у іншых краінах. Самы вялікі попыт на нашы паслугі існуе з боку Расіі. Шмат чаго робім у Літве. Упершыню летась мы працавалі ў Фінляндыі. Год таму рэканструкцыю турбіны ажыццяўлялі ў Грэцыі. Былі заказы ў Эстоніі. Мы шукаем перспектыўныя кантракты ў розных краінах свету. Але ўсё ж галоўны наш заказчык у Расіі.

— У сённяшніх складаных для сусветнай эканомікі ўмовах менавіта Расія зарабляе шмат нафтавалюты. Расіяне гатовыя цяпер плаціць за вашы паслугі добрыя грошы? Гэта выгаднае для вас супрацоўніцтва?

— Па тых работах, якія расійскім заказчыкам неабходныя, яны гатовы плаціць нармальныя грошы. Мы ў Расіі за капейкі не збіраемся працаваць. Нашы расцэнкі павінны пакрываць затраты і забяспечваць канкурэнтныя заробкі сваім работнікам. Калі БЭРНу прапаноўваюць нейкі праект з малым фінансаваннем, то мы проста адмаўляемся, бо няма сэнсу. Сёння мы маем магчымасць выбіраць з некалькіх прапаноў больш «смачныя» праекты. Асабліва гэта датычыцца інжынерных распрацовак.

— Праца за мяжой прадугледжвае часам даволі працяглыя камандзіроўкі. Вашы работнікі павінны мець пэўны ўзровень самакіравання?

— Тут існуе іншы стрымліваючы фактар. Праца ў энергетыцы адказная, небяспечная, таму трэба мець усе магчымыя дазволы, сертыфікаты акрэдытацый лабараторый, атэстацыі персаналу, у першую чаргу зваршчыкаў. У Расіі трэба быць членам самаарганізавальнай арганізацыі. Дык вось... Наспеў час, калі неабходна было б узаемна прызнаваць на прасторы дзвюх саюзных дзяржаў і беларускія, і расійскія ліцэнзіі. Навукова-тэхнічная база ў нас аднолькавая, яна нам засталася ў спадчыну ад Савецкага Саюза. А сёння атрымліваецца так, што спачатку мы пацвярджаем сваю кваліфікацыю (праз дазволы, ліцэнзіі на выкананне работ, сертыфікаты) у Беларусі, а потым плацім вялікія грошы і атрымліваем падобныя дазволы ўжо ў Расіі. Разам з тым вядома, што ў Расіі такія дазволы напрамую атрымаць бывае даволі праблематычна нават тады, калі ўсё для гэтага ёсць. Тады патрэбна наймаць нейкую спецыяльную арганізацыю, якая можа паскорыць працэс атрымання гэтых самых дазволаў...

Створана саюзная дзяржава, ствараецца эканамічны саюз некалькіх краін, Мытны саюз, аднак... Упэўнены, што ў рамках гэтых саюзаў павінны дзейнічаць уніфікаваныя дазволы на выкананне тых ці іншых работ.

— У чым вы бачыце перспектыву развіцця прадпрыемства?

— У першую чаргу, мы маем сур'ёзны намер развіваць уласныя напрамкі па вытворчасці прадукцыі для патрэб энергетыкі. Гэта датычыцца праграмы лакалізацыі вытворчасці па вырабе, кацельных установак для спальвання мясцовых відаў паліва ў Рэспубліцы Беларусь. Пра гэта асобна заўважыў кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падчас наведвання Пружанаў.

Наша прадпрыемства будзе актыўна ўдзельнічаць у гэтай праграме. Збіраемся інвесціраваць у гэтую праграму вялікія фінансавыя сродкі. Грошы будуць накіроўвацца ў пераснашчэнне такой вытворчасці па афарбоўцы абсталявання, стварэнне сушыльнай камеры, у тэхналогію па вырабе мембранных панэляў для катлоў, у сістэму трубазгінальнага абсталявання. Мы ўжо шмат грошай уклалі ў гэты напрамак. Напрыклад, па сістэме плазмы, розных сучасных метадаў апрацоўкі катлоў і г.д. Мы разлічваем у гэты напрамак інвесціраваць прыкладна 5—6 млрд рублёў уласных грошай ці з выкарыстаннем крэдытных рэсурсаў. Разлічваем узяць крэдыт у памеры не больш чым 2 млрд рублёў, каб сёлета і ў наступным годзе гэтую вытворчасць падрыхтаваць і наладзіць вытворчасць прадукцыі для патрэб энергетыкі. Галоўным чынам, гэта кацельнае абсталяванне.

Падобны напрамак плануе наладзіць і Белазёрскі энергамеханічны завод. Упэўнены, што рынак гэтага абсталявання мы пачнём асвойваць сумесна. Сёння яно цалкам закупляецца за мяжой. Самастойна, без дапамогі ўжо вядомых вытворцаў такога абсталявання, сапраўды цудоўную «ляльку» на спальванні мясцовых відаў паліва мы не зробім. Трэба абавязкова мець дакладную сучасную тэхналогію па абслугоўванні гэтага абсталявання і дакументацыю на такія катлы. Таму сёння мы вядзём перамовы з фінскай кампаніяй «Рэнова» аб стварэнні сумеснай вытворчасці па вырабе катлоў і канструкцый. Такія катлы будуць устанаўлівацца і мацавацца на паўночнай міні-ЦЭЦ г. Віцебска. Катлы сапраўды якасныя. Мы іх ужо паглядзелі і дакладна «памацалі». Разлічваем, што пастаўка гэтых катлоў стане для фінскага боку інвестыцыйным укладам у сумеснае з намі вытворчасць. Дакладна аб формах супрацоўніцтва паміж бакамі трэба дадаткова дамаўляцца. Перамовы будуць нялёгкія. Мы мяркуем, што гама абсталявання па гэтым напрамку ў нас ужо ёсць, нешта яшчэ дабавім і... У нас ёсць кваліфікаваныя кадры, вытворчыя плошчы, і мы збіраемся атрымаць тэхналогію і дакументацыю. Пасля стварэння сумеснага прадпрыемства існуе перспектыва і далейшага развіцця такой вытворчасці, каб потым якасныя энергетычныя ўстаноўкі, ужо адаптаваныя да нашых умоў, магчыма было не толькі пастаўляць на тэрыторыю Беларусі, але і прадаваць за мяжу. Попыт на такое абсталяванне існуе сёння ў межах Мытнага саюза — у Расіі і Казахстане. Існуе верагоднасць і наладжвання зваротнай сувязі паставак. Фіны нам кажуць, што, калі ў Беларусі пачнуць вырабляць асобныя якасныя вузлы такога абсталявання, тады ёсць магчымасць прадаваць нейкія прыборы ці вузлы нават спажыўцам Еўрасаюза. А гэта сапраўды аб'ёмны рынак. Ужо зараз мы маем дазвольныя дакументы на пастаўку такога абсталявання ў краіны Еўрасаюза. Гэта не пустыя словы, а рэальная перспектыва.

Напрыклад, цяпер мы ўдзельнічаем у тэндары на пастаўку параперагравальнікаў на Літоўскую ГРЭС. Там даволі сур'ёзны кантракт. Было б добра яго атрымаць.

На гэтым участку доследнай вытворчасці электратэхнічнага цэха працуе мантажніца Любоў ЛЫСАКОЎСКАЯ, ёй даручана паянне пячатных плат.

— Галоўныя аб'екты, якімі ганарыцца БЭРН?

— Па дзяржаўнай праграме ажыццяўлення вытворчасці кацельнага абсталявання па спальванні мясцовых відаў паліва першы наш аб'ект быў зроблены на Беларускай ГРЭС, затым у Жлобінскіх электрычных сетках. Там намі былі праведзены мантаж і наладка міні-ЦЭЦ на базе кагенерацыйных установак. Выканалі пусканаладачныя работы па ўводзе ў эксплуатацыю міні-ЦЭЦ у Вілейцы і Асіповічах.

Акрамя гэтага, удзельнічалі па субпадрадзе ў мадэрнізацыі і будаўніцтве блокаў ПГУ Бярозаўскай ГРЭС. Летась былі завершаны работы на Мінскай ЦЭЦ-3, дзе ажыццяўлялася пусканаладка ПГУ-215 МВт. Забяспечылі пуск кагенерацыйнай установкі і міні-ЦЭЦ на заводзе «Інтэграл», дзе быў створаны даволі складаны энергатэхналагічны комплекс з мантажом газаагрэгатаў, халадзільных установак і ўвогуле ўсёй інфраструктурай па цепла- і водазабеспячэнні. Цяпер у якасці генпадрадчыка ажыццяўляем будаўніцтва міні-ЦЭЦ на базе кагенерацыйнай установкі на Паліморы.

У Расіі мы з'яўляемся пастаяннымі партнёрамі, і штогод карыстаюцца нашымі паслугамі на фірме «Поўначсталь» («Северсталь») (Чарапавец), дзе мы рамантуем катлы і турбіны. Сёлета існуе магчымасць атрымаць кантракт з акцыянерным таварыствам «Тулачармет», дзе будзе ажыццяўляцца мантаж магутнага энергетычнага абсталявання. Летась наша прадпрыемства рабіла там рамонт турбіны на ЦЭЦ-ПВС. Сёлета спадзяёмся перамагчы ў гэтым тэндары.

Расійскія аб'яднаныя генерыруючыя кампаніі АГК-3 і АГК-6 з'яўляюцца нашымі пастаяннымі партнёрамі, дзе мы выконваем шмат заказаў. На Чарапавецкай ГРЭС у горадзе Суворавe плануем сёлета рамантаваць адразу дзве турбіны.

Сёння нашым партнёрам стала фінская кампанія «Energico Oy», дзе летась спецыялісты прадпрыемства выконвалі заказы па дзвюх турбінах. Сёлета працягваем перамовы па рамонце яшчэ адной турбіны ў Фінляндыі.

Разам з літоўскім партнёрам фірмай «Ліетэмас» беларускія энергетыкі выконвалі рамонт абсталявання і мантаж на Каўнаскай ЦЭЦ і Літоўскай ГРЭС. Асобна БЭРН супрацоўнічае з незалежнай арганізацыяй, якая з'яўляецца вытворцам электрычнасці, фірмай «Вільнюс-энергія».

Сёння мы ўдзельнічаем у тэндары па Смаленскай ГРЭС, дзе запланаваны рамонт катла. Такія заказы нам спадабаюцца, калі яны побач і не вельмі дробныя. Увогуле мы працуем там, куды нас запрашаюць (чытай — паважаюць, — С.К.) і дзе прапануюць добрыя грошы.

— У вас ёсць магчымасць зарабляць валюту за мяжой. Разам з тым, галоўнае, каб валютныя плюсы былі па ўзроўні выдаткаў за мінусы. Гэтымі днямі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўсе прадпрыемствы ў краіне павінны імкнуцца зарабляць за мяжой больш, чым там купляць. Гэта павінна закрануць усе напрамкі дзейнасці суб'ектаў гаспадарання, у тым ліку паслугі і тавары.

— Гэта сапраўды правільная пастаноўка пытання для ўсіх буйных прадпрыемстваў Беларусі. Усяго па 38 дагаворах у 2010 годзе па лініі замежных кантрактаў ААТ «Белэнергарамналадка» атрымала за выкананы аб'ём тавараў і паслуг 3 млн 621 тыс. долараў ЗША. План таварыства па экспарце быў выкананы, бо ў параўнанні з 2009 годам аб'ём экспарту склаў 280 працэнтаў і на 4 працэнты перавысіў узровень дакрызіснага 2008 года.

Калі асобна не спыняцца на рублёвых даходах нашага акцыянернага таварыства, тады заўважу, што летась станоўчае сальда БЭРНа выключна па валюце складала плюс 2,1 млн долараў. Дзяржава ў гэтым выпадку толькі выйграе, бо 30 працэнтаў атрыманай за мяжой валюты мы прадаём Нацбанку краіны.

Разам з тым, каб не адчуваць сябе бедным сваяком на знешніх рынках у сферы энергетыкі, наша прадпрыемства павінна мець пэўны запас уласнай валюты. Валюта патрэбна для забеспячэння структурных падраздзяленняў нашых спецыялістаў за мяжой. У нас шмат камандзіровак, дзе валюта патрэбна на дарогу і сутачныя... За валюту за мяжой афармляюцца ліцэнзіі і дазволы на правядзенне работ, набываецца новае сучаснае абсталяванне. Валюта патрэбна для забеспячэння вытворчых гарантый прадпрыемства. Напрыклад, фінам мы далі гарантыю якасці сваіх паслуг на год, а для забеспячэння гэтай гарантыі павінны мець на банкаўскім рахунку 50 тыс. USD (лінія банкаўскай гарантыі).

— У Беларусі плануецца пабудаваць АЭС з выкарыстаннем самых перадавых тэхналогій...

— Мы спадзяёмся ўдзельнічаць у будаўніцтве айчыннай атамнай электрастанцыі. Заявілі аб сабе як арганізацыі, якая патэнцыяльна можа ажыццяўляць шэраг работ у сферы энергетыкі. Плануецца, што арганізацыяй будаўніцтва станцыі будзе займацца расійская структура «Саюзатамэкспарт». Сёння расійская фірма фарміруе пералік прадпрыемстваў, што будуць удзельнічаць у будаўніцтве станцыі. Патрабаванні ў іх вельмі сур'ёзныя. Неабходна запоўніць анкету аб сабе, дзе трэба распісаць усё недзе на 15—20 лістах. На другім этапе, прыкладна ў маі—чэрвені, прадугледжаны аўдыт, калі прадпрыемства наведаюць эксперты расійскай фірмы, якія і праверацьпраўдзівасць агучанай інфармацыі. Сёння мы такую працэдуру праходзім, каб удзельнічаць у будаўніцтве атамнай станцыі ў Беларусі. Калі трапім у гэты спіс, тады нас чакае вельмі адказная і сур'ёзная праца.

— Што б вы сказалі сваім работнікам аб тым, як будзе жыць калектыў БЭРНа заўтра?

— Час у нас зараз складаны. Адбываюцца розныя змены ў эканоміцы, аднак... Як бы ні было складана, прадпрыемства выстаіць і не згубіць сваіх пазіцый. Упэўнены, што перспектыва ў БЭРНа добрая і мы будзем рухацца толькі наперад. Для гэтага ў нас усё ёсць: добра дзейнічае цудоўны менеджмент, на прадпрыемстве шмат высокакваліфікаваных спецыялістаў, ёсць заказы, імідж і, галоўнае, ёсць добрае імя, якое мы стваралі гадамі.

Наша імя добра вядома не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Цяпер БЭРН паважаюць у Расіі. Нас зараз ужо добра ведаюць і ў Фінляндыі, ды і ўвогуле — усе партнёры-вытворцы энергетычнага абсталявання, дзе мы выконвалі рамонт, пуск ці наладку тэхналагічных комплексаў і вузлоў.

Сёння БЭРН ведаюць як сапраўды сур'ёзную кампанію, якая ніколі нікога не падвядзе. Менавіта таму нашы работнікі могуць быць упэўнены ў тым, што заўтрашні дзень у нас ёсць, ёсць перспектыва, ёсць рух наперад, ёсць будучыня.

Беларускіх рамонтнікаў добра ведаюць і ў далёкім Брацку

— Асноўныя рамонтныя работы ААТ «Белэнергарамналадка» пачынаюцца менавіта ўвесну, калі ацяпленне ў дамы падаваць ужо не трэба і ўзнікае магчымасць ажыццяўляць масавую рамонтную кампанію ў энергасістэме Беларусі, — расказвае намеснік галоўнага інжынера па рамонце і мантажы БЭРНа Аляксандр Зубовіч. — Мы, як галоўная арганізацыя па рамонце паравых і вадагрэйных катлоў, таксама спецыялізуемся на рамонтах розных тыпаў энергетычных турбін любой складанасці, прымаем самы непасрэдны ўдзел у рамонтах айчыннай энергасістэмы.

— Ваша дзейнасць складаецца з даволі цяжкіх, складаных і адказных мерапрыемстваў, якія патрабуюць ад работнікаў высокай кваліфікацыі...

— Так, на любым узроўні правядзення рамонтных работ, ад слесараў на аб'ектах, інжынераў, што займаюцца распрацоўкай тэхналогій на выкананне рамонтаў, і да кіраўніцтва прадпрыемства — усе павінны мець адпаведную высокую кваліфікацыю. А па-іншаму працаваць у нашай сістэме і нельга, бо... Вы толькі ўявіце турбіну, дзе 3 тысячы абаротаў у хвіліну, іншыя высокадакладныя магутныя энергетычныя агрэгаты. Так, нашы спецыялісты сапраўды лічацца, бадай, самымі лепшымі прафесіяналамі-рамонтнікамі ў энергасістэме краіны... Усімі значнымі рамонтамі ў Беларусі займаюцца менавіта спецыялісты БЭРНа.

— Неаднаразова з боку вашых спажыўцоў чуў пра ўнікальных спецыялістаў БЭРНа, якія могуць рамантаваць усё і нават больш...

— Вядома, што рамонтная служба мае вядучых спецыялістаў, без якіх БЭРНу было б складана падтрымліваць тэхналагічныя паказчыкі на сённяшнім узроўні. Магу адзначыць такую аперацыю, як замена металічных дымавых труб на кацельнях. У нас ёсць прафесіяналы, якія спецыялізуюцца на гэтым напрамку. У Светлагорскім філіяле такім унікальным спецыялістам з'яўляецца праграб Ігар Варабей. Такімі складанымі работамі на вышыні ў свой час займаўся галоўны інжынер Гродзенскага філіяла Сяргей Кастэнка, які працаваў майстарам і прарабам. З гэтага філіяла вызначу брыгадзіра Антона Малышку.

Сярод тэхнолагаў назаву інжынера-тэхнолага I катэгорыі Анатоля Пашкевіча і вядучага інжынера Аляксандра Сердзюкова, якія лічацца нашымі «залатымі» кадрамі, што займаюцца распрацоўкай тэхналогіі на рамонт і мантаж энергетычнага абсталявання, якія потым выконваюцца лінейным персаналам. Ёсць маладыя, але даволі адукаваныя і талковыя інжынеры: Сяргей Сянько (турбініст), начальнік турбіннага бюро Міхаіл Клешчык і іншыя. У турбіннай сферы сёння працуюць і патрыярхі беларускай энергасістэмы, якія амаль усё жыццё аддалі БЭРНу. Самаму сталаму ветэрану сёння 81 год. Гэта Генадзь Рукавішнікаў, які працуе і цяпер. Паспяхова працуе на прадпрыемстве і Леанід Арлёнак (77 гадоў). Яны цяпер перадаюць свой вопыт моладзі.

— Вашы аб'екты знаходзяцца толькі ў Беларусі?

— Часткова так. Першапачаткова мы былі створаны як рамонтная арганізацыя для мясцовых патрэб, аднак з цягам часу пачалі выходзіць са сваімі паслугамі і за межы краіны. Практычна ва ўсіх буйных гарадах Беларусі БЭРН мае свае рамонтныя філіялы. Гэта сапраўды зручна, калі, напрыклад, на Магілёўскай ЦЭЦ-2 мы маем свой філіял, намаганнямі якога закрываем рамонтныя работы ўсяго рэгіёна.

Сёння мы пачалі шмат чаго рамантаваць у Расіі. Геаграфія нашых работ у Расіі складае ад Смаленска і далей на ўсход да самай мяжы зямлі рускай. Апошнія работы былі выкананы намі ў г. Брацку на буйным цэлюлозна-кардонным камбінаце. Гэта былі сур'ёзныя рамонты. Спачатку мы ажыццяўлялі замену вертыкальнага вадзянога эканамайзера на содарэгініцыйных катлах даўжынёй 25 метраў і вагой 14 тон. Выконваючы першую задачу, мы нават трапілі ў мясцовую прэсу, што было для нас прыемным сюрпрызам. Кіраўніцтву камбіната спадабалася якасць нашага рамонту, таму нас запрасілі зноў. Цяпер у вельмі сціслыя тэрміны неабходна было зрабіць на катле замену параперагравальніка. Шчыра, мы не зусім былі ўпэўнены, што гэтага часу нам хопіць, аднак... Нашы спецыялісты распрацавалі тэхналогію, і дзякуючы дакладнай арганізацыі і кваліфікацыі работнікаў БЭРНа замена абсталявання была зроблена так, як таго патрабаваў заказчык. Расіяне былі вельмі задаволены. Цяпер кіраўніцтва камбіната ўсім сваім калегам у рэгіёне расказвае аб тым, што калі ў энергетыцы рамантуюць беларусы з БЭРНа, то ўсё будзе як трэба, бо яны — беларусы — за свае словы заўсёды адказваюць.

Намеснік начальніка цэха наладкі электратэхнічнага абсталявання Міхаіл ЧУРЫЛАЎ.

Дыягнастычны цэнтр электратэхнічнага абсталявання — адзін з лепшых на прасторы СНД

Намеснік начальніка цэха наладкі электратэхнічнага абсталявання Міхаіл ЧУРЫЛАЎ:

— Яшчэ ў былыя гады, да развалу Саюза, наша прадпрыемства разглядалася як палігон па ўкараненні першых узораў электратэхнічнай прадукцыі. Мы і цяпер маем цалкам закончаную вытворчасць, якая пачынаецца з праектавання і канструявання і заканчваецца мантажом, наладкай і ўключэннем прыстасаванняў аўтаматыкі, размеркавальных сістэм і іншага абсталявання непасрэдна на аб'ектах энергасістэмы. Больш за тое, наш цэх можа выконваць любыя работы па наладцы і ўводзе ў эксплуатацыю рознага электратэхнічнага абсталявання, незалежна ад вытворцы.

Сёння цэх выпускае каля 40 электратэхнічных вырабаў. Самым вялікім попытам у спажыўцоў карыстаюцца розныя нізкавольтныя камплектныя прыстасаванні для сістэм пераменнага току станцый, падстанцый і кацельняў. Ёсць попыт і на нізкавольтныя камплектныя прыстасаванні пастаяннага току (так званыя шчыты пастаяннага току розных канфігурацый) для энергетычнай галіны.

Цяпер мы вырабляем і шэраг такіх электратэхнічных вырабаў, якія не маюць ці не мелі да апошняга часу аналагаў у практыцы айчыннай і замежнай энергетыкі. Напрыклад, ёсць у нас такая аўтаматыка вызначэння і лакалізацыі замыкання на зямлю электрасеткі з ізаляванай нетраллю.

Толькі на ААТ «Белэнергарамналадка» ў Беларусі вырабляюцца выпрамляльныя ўстаноўкі для зарадкі ці падзарадкі акумулятарных батарэй для энергетыкі.

У свой час менавіта намі была распрацавана і ўпершыню прыменена ў энергетыцы лічбавая абарона кантактаў пастаяннага току. Гэтая сістэма вырабляецца на прадпрыемстве з 2003 года. Тады мы былі першымі на прасторах СНД і нават сярод краін далёкага замежжа. Сёння мы ўжо шмат выпусцілі такіх установак і працягваем штогод іх вырабляць, бо яны карыстаюцца добрым попытам у нашых спажыўцоў.

Асобным напрамкам з'яўляецца дыягностыка электратэхнічнага абсталявання. Напрыклад, у нас цяпер развіваецца дыягностыка асноўнага электратэхнічнага абсталявання — генератараў, трансфарматараў, размеркавальных прыстасаванняў. Дыягностыка робіцца такім чынам, каб дасканала ведаць сапраўднае становішча стану абсталявання ў кожны канкрэтны момант часу, каб потым зрабіць выснову аб яго далейшай эксплуатацыі. Такім чынам, з'явілася магчымасць планаваць правядзенне капітальнага рамонту асобных блокаў ці катлоў у энергетыцы. Сёння ў дыягностыцы мы выкарыстоўваем розныя даволі нестандартныя і перадавыя спосабы. Гэта тармаграфія, вымярэнне частковых разрадаў, вымярэнне шчыльнасці пакетаў сталі ў трансфарматарах вібра-акустычным метадам і г.д. Увогуле на прасторы СНД такіх дыягнастычных цэнтраў, як у нас, ёсць яшчэ толькі тры — на «Запарожтрансфарматары», у Маскве і ў Пермі.

Яшчэ адным напрамкам з'яўляецца стварэнне цэнтра па наладцы сучасных складаных прыстасаванняў абароны аўтаматыкі. Гэты напрамак мы развіваем даволі глыбока, ды і канцэрн «Белэнерга» звяртае на яго шмат увагі.

На базе гэтага цэнтра мы ў будучым павінны будзем прымаць заключэнне аб тым, ці магчыма прасоўваць далей на айчынны рынак энергетычнай сістэмы тыя ці іншыя электратэхнічныя прыстасаванні, або яны нас па нейкіх параметрах не задавальняюць. Гэта робіцца для таго, каб абараніць рынак беларускай энергетычнай сістэмы ад маральна састарэлых прыбораў і прылад, а таксама ад абсталявання сумнеўнай якасці.

Трапілі ў «маскоўскую абойму»



Начальнік участка рэалізацыі замежных кантрактаў і праектаў Барыс СТАРАВОЙТАЎ.

Начальнік участка рэалізацыі замежных кантрактаў і праектаў АСК ТП Барыс СТАРАВОЙТАЎ:

— Наш участак арганізуе вытворча-наладачныя работы на замежных аб'ектах. Ужо з 2006 года мы больш працуем у Расіі. Першым нашым аб'ектам тады была электрастанцыя ў добра вядомым дзелавым цэнтры «Масква-Сіці». Аўтаномная электрастанцыя будавалася двума этапамі. Першая чарга станцыі была спраектавана спецыялістамі швейцарскай фірмы «Альстом» на іх абсталяванні. Тады спецыялісты БЭРНа займаліся наладкай цепламеханічнага абсталявання пасля яго мантажу. Другая чарга станцыі праектавалася ўжо профільным маскоўскім інстытутам. У гэтым выпадку інжынерам БЭРНа давялося кіраваць усімі працэсамі наладкі, каардынаваць дзейнасць усіх падраздзяленняў і арганізацый, каб дасягнуць станоўчага выніку. Сёння станцыя паспахова працуе, нясе поўную нагрузку і мае добрыя паказчыкі па тэхнічна-эканамічным напрамку і ў сферы надзейнасці. Гэта сведчыць пра тое, што якасць нашай наладкі адпавядае сучаснаму ўзроўню эксплуатацыі такога абсталявання. Гэта пра тое, што было.

Цяпер мы працуем на новым аб'екце ў сталіцы Расіі. На Маскоўскай ЦЭЦ-26 (ААТ «Мосэнерга») будуецца парагазавы блок ПГУ-400 МВт, куды пастаўкі абсталявання ў поўным аб'ёме ажыццяўляе зноў жа швейцарская фірма «Альстом». Гэта ўжо больш сучаснае і магутнае абсталяванне, аднак беларускія спецыялісты ўжо былі, як кажуць, з абсталяваннем гэтай фірмы амаль на «ты». Увогуле на гэтай унікальнай энергетычнай станцыі прымяняецца сапраўды арыгінальныя тэхнічныя рашэнні. Мы, у сваю чаргу, сутыкаючыся з такой тэхналогіяй, шмат чаго для сябе адкрылі і даведаліся, як рашаюцца асобныя тэхпытанні за мяжой. Сёння энергетычны блок прайшоў паспяховыя іспыты і нясе нагрузку 400 МВт.

Паўторна нас у Маскву запрасілі да супрацоўніцтва таму, што спецыялісты БЭРНа паказалі сябе толькі з лепшага боку. У галоўным мегаполісе Расіі замацавацца на энергетычным рынку вельмі складана, бо існуе вялікая канкурэнцыя з боку мясцовых спецыялізаваных арганізацый. Інжынерная эліта БЭРНа ў чарговы раз даказала свой высокі прафесіяналізм. Сёння ў Маскве нас ужо добра ведаюць як адказных і кваліфікаваных спецыялістаў.

Спадзяёмся, што і ў будучыні паслугі нашага таварыства будуць карыстацца добрым попытам у Маскве і ўвогуле ў Расіі. Цяпер у Расіі ажыццяўляецца даволі інтэнсіўнае будаўніцтва электрастанцый. Толькі ў Маскве плануецца паставіць яшчэ тры падобныя парагазавыя блокі, як на ЦЭЦ-26.

Другім станоўчым момантам нашага супрацоўніцтва ў Маскве з'яўляецца магчымасць непасрэдна на практыцы, пры наладцы замежнага абсталявання, удасканальваць свае прафесійныя здольнасці, пашыраць кругагляд, развівацца да ўзроўню самых навейшых распрацовак.

Другім напрамкам нашага ўчастка з'яўляецца распрацоўка праектаў аўтаматызаваных сістэм кіравання тэхналагічнымі працэсамі (АСК ТП). Напрамак для нашага прадпрыемства даволі малады, таму тут шмат канкурэнтаў сярод іншых беларускіх арганізацый. Сапраўды добрых праграмістаў у Мінску хапае, таму і гэтая тэма на БЭРНе актыўна развіваецца.

Напрыклад, мы зрабілі адзін з праектаў па АСК ТП, які быў удала рэалізаваны на Мазырскай станцыі. Там была ажыццёўлена аўтаматызацыя работы трох энергетычных катлоў вялікай магутнасці. Днямі будзе завершаны праект па АСК ТП для паравой турбіны, якая будзе рэканструявацца на Мазырскай станцыі. Непасрэдна цяпер нашы спецыялісты працуюць на Мінскай ЦЭЦ-2, на блоку ПГУ-32,5 МВт паставак кітайскага абсталявання. Мы дапамагаем кітайскім работнікам укараняць сістэму АСК ТП.



Начальнік участка метралогіі Юрый КОШЫН.

Лабараторыя па метале – галоўная ў энергетыцы

Адным са структурных падраздзяленняў інжынернага цэнтра ААТ «Белэнергарамналадка» з'яўляецца міжсістэмная лабараторыя кантролю металу і зваркі.

— Такой менавіта Міжсістэмнай лабараторыі па метале ў Беларусі больш няма, — адзначыў начальнік Міжсістэмнай лабараторыі Уладзімір Алдакушын. — Акрамя таго, што мы з'яўляемся галоўнай лабараторыяй металаў у энергетыцы — метадычна кіруем і ўсімі падобнымі лабараторыямі ўсіх электрастанцый і цеплавых сетак у краіне, аднак працуем і ў іншых галінах прамысловасці (машынабудаванне, нафтахімія і г.д.).

Лабараторыя падзелена на тры групы: першая датычыцца неразбуральнага кантролю, другая — гэта металазнаўства, металаграфічныя іспыты і разбуральныя іспыты і група хімічнага аналізу.

На ўсе віды неразбуральнага і разбуральнага кантролю дзейнасць лабараторыі сертыфікавана. Увогуле міжсістэмная лабараторыя кантролю металу і зваркі акрэдытавана Дзяржстандартам Рэспублікі Беларусь на незалежнасць і тэхнічную кампетэнтнасць у адпаведнасці з патрабаваннямі СТБ ІСО/МЭК 17025 на ажыццяўленне неразбуральнага кантролю, механічных іспытаў, металаграфічных даследаванняў асноўнага металу і зварных злучэнняў. У лабараторыі працуе высакакласны спецыяліст — кандыдат тэхнічных навук, вядучы інжынер Каролік В.А., які займаецца разлікамі індывідуальнага рэсурсу абсталявання ТЭС, падрыхтоўкай экспертных заключэнняў па працягванні тэрміну эксплуатацыі паравых турбін, параправодаў і іншага энергаабсталявання.

Старшыня прафсаюзнага камітэта ААТ «Белэнергарамналадка» Дзмітрый Жук адзначае, што па лініі дзіцячага аздараўлення прафсаюзы БЭРНа задавальняюць пуцёўкамі ўсіх ахвотных нават на летні перыяд. Уласных устаноў гэтага профілю ў таварыства няма, але адміністрацыя заключае дагаворы з іншымі буйнымі прадпрыемствамі сталіцы, у якіх ёсць аздараўленчая база. За летні сезон па лініі прафсаюзаў набываецца каля 50 такіх пуцёвак. Работнік аплачвае толькі 15 працэнтаў ад сабекошту такой пуцёўкі, астатнюю частку плаціць прафкам.

Прадпрыемства выдзяляе прафкаму 0,15 працэнта ад фонду зарплаты таварыства. З гэтых грошай купляюцца пуцёўкі, навагоднія падарункі, арганізуюцца святочныя вечары, спартыўна-аздараўленчыя мерапрыемствы. Прафкам арандуе ў басейне 2 дарожкі два разы ў тыдзень, а па асобным графіку — сучасную трэнажорную залу. Згодна з калектыўным дагаворам прадпрыемства, прафсаюзны камітэт можа даваць работнікам матэрыяльную дапамогу. За мінулы год работнікі БЭРНа атрымалі ад прафсаюзаў матдапамогу ў памеры каля 55 млн рублёў. Матэрыяльная дапамога даецца па розных прычынах: калі нехта сур'ёзна захварэў і гэта патрабуе грошай на дарагія лекі, нарадзілася дзіця, адбыўся пажар ці нейкая іншая нестандартная жыццёвая сітуацыя. У галоўным офісе прадпрыемства функцыянуе сучасны пункт аховы здароўя першай медыцынскай дапамогі.

Унікальнымі спецыялістамі не нараджаюцца – іх «вырошчвае» БЭРН

Інжынеры-канструктары Таццяна КІРЭЕВА і Ірына КАРАЛЬКОВА.

У акцыянерным таварыстве «Белэнергарамналадка» паспяхова функцыянуе Інжынерны цэнтр, які, па сутнасці, з'яўляецца тэхналагічнымі «мазгамі» прадпрыемства. У складзе цэнтра знаходзяцца цэх наладкі цепламеханічнага абсталявання, цэх наладкі электратэхнічнага абсталявання, участак рэалізацыі замежных кантрактаў і праектаў АСК ТП, міжсістэмная лабараторыя кантролю металу і зваркі.

— Самым буйным падраздзяленнем інжынернага цэнтра з'яўляецца цэх наладкі цепламеханічнага абсталявання, — расказвае намеснік начальніка гэтага цэха Сяргей Крамарэнка. — Цэх мае мноства напрамкаў. Напрыклад, турбінны ўчастак складаецца з груп рэгулявання, вібрацыі, наладкі пераменных рэжымаў турбін і групы выпрабавання турбін. Займаемся выпрабаваннем і наладкай абсталявання на электрастанцыях і іншых энергааб'ектах.

— Сёння самым важным напрамкам у нас з'яўляецца выкананне пусканаладачных работ па ўводзе ў дзеянне энергааб'ектаў, якія прапісаны ў Рэспубліканскай комплекснай праграме мадэрнізацыі асноўных вытворчых фондаў. Цяпер па гэтай праграме мы працуем на Мінскай ЦЭЦ-2, дзе ажыццяўляем увод у эксплуатацыю 2 энергаблокаў кітайскай вытворчасці ПГУ-32,5 МВт кожны. Такога абсталявання ў нашай краіне да гэтага часу яшчэ не было. Ажыццяўляем рэканструкцыю блока ПГУ на Бярозаўскай ГРЭС. Плануем прымаць удзел па тэхдапамозе заказчыку пры ўводзе ў эксплуатацыю кітайскіх энергетычных блокаў магутнасцю 400 МВт на Мінскай ЦЭЦ-5. Абсталяванне тут для нас новае, таму наладка патрабуе не толькі ўпэўненых глыбокіх ведаў, але часам і нетрадыцыйных рашэнняў.

На Мінскай ЦЭЦ-2 складанай наладкай кіруе Сяргей Мікалаевіч Савін. Увогуле ў гэтай брыгадзе шмат высокакваліфікаваных спецыялістаў. Гэта, напрыклад, вядучы інжынер па наладцы КІПіА Сяргей Паляшчук, інжынер першай катэгорыі па наладцы катлоў Аляксандр Барнатовіч, вядучы інжынер па наладцы турбін Ігар Шапашнікаў, інжынер-тэхнолаг па наладцы турбін Пётр Жылін і іншыя.

Увогуле ў нашым цэху працуе 125 спецыялістаў, дзе практычна ўсе маюць вышэйшую тэхнічную адукацыю, акрамя 6 слесараў і 2 тэхнікаў.

Асобна адзначу тое, што ў нас працуе шмат сапраўды ўнікальных вузкіх спецыялістаў, якія вядомыя на ўсю энергасістэму Беларусі. Напрыклад, у падраздзяленні групы вібрацыі паравых турбін кіраўніком працуе Аляксандр Аляксандравіч Пісараў. Гэта самая вядомая група па такім напрамку, яна абслугоўвае часам усю энергасістэму краіны і не толькі. Групу звычайна выклікаюць у якасці такой своеасаблівай пажарнай каманды па вібрадыягностыцы і вібраналадцы турбін. Работа вельмі складаная і адказная. Такія спецыялісты працуюць не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, у краінах далёкага замежжа. Напрыклад, днямі спецыялісты гэтай групы былі накіраваны ў камандзіроўку ў Іран. Паслугі такіх спецыялістаў каштуюць нятанна, але іх ужо добра ведаюць, таму і заказваюць.

У нас ёсць эксклюзіўная група, якая займаецца пытаннямі выкарыстання паліва. Спецыялісты групы распрацоўваюць нарматыўныя характарыстыкі па расходзе паліва для энергасістэмы па эксплуатацыі энергаабсталявання... Інтэлектуальна-тэхнічны патэнцыял гэтай групы вельмі высокі.

Увогуле ў нашым цэху вельмі шырокі дыяпазон работ. Ёсць уласнае канструктарскае бюро, дзе мы робім уласныя праекты і распрацоўваем канструктарскую дакументацыю. Напрыклад, у складзе праектаў ажыццяўляюцца канструктарскія распрацоўкі — такія, як мадэрнізацыя катла агрэгата, іншыя ўнікальныя тэхналагічныя навінкі. У складзе цэха працуе акрэдытаваная хімічная лабараторыя, дзе робіцца аналіз вады, масел, паліва і інш., а таксама лабараторыя аховы навакольнага асяроддзя, дзе ажыццяўляецца экалагічнае нарміраванне выкідаў шкодных рэчываў. Сёння цэх загружаны на ўсе 100 працэнтаў.

З гонарам адзначу, што ў наш цэх цягнецца ўладкавацца на працу сур'ёзная таленавітая моладзь, якая сапраўды цікавіцца тэхнікай. У нас для маладых спецыялістаў ёсць перспектыва прафесійнага росту і... магчымасць атрымліваць добрыя заробкі. Разам з тым заўважу, што геніямі не нараджаюцца — каб стаць сапраўды ўнікальным спецыялістам, трэба ў нашай моцнай брыгадзе адпрацаваць не менш як 5—7 гадоў.

Цяпер на БЭРНе працаваць стала і цікава, і выгадна. Раней мы працавалі па лакальных дагаворах. У апошнія 3—4 гады кіраўніцтва прадпрыемства пачало рабіць акцэнт на буйныя комплексныя генпадрадныя дагаворы. Выкананне буйных заказаў дазваляе нам развівацца і ў тэхнічным, і ў фінансавым напрамках. Так, рэалізацыя дзяржпраграмы па стварэнні энергетычных установак па спальванні мясцовых відаў паліва дазваляе аднаўляць тэхналогію да сучаснага ўзроўню еўрапейскага энергетычнага абсталявання.

Начальнік аддзела маркетынгу Арцём САРОКА (першы справа) з супрацоўнікамі Вячаславам ШЫМАНСКІМ, Галінай САЛЬНІКАВАЙ, Алесяй ТАНЧУК.

Кіраўнік службы якасці Яўген ПАЎЛЮКОЎ:

У БЭРНа амаль суцэльная сертыфікацыя плюс дзейная прэмія ўрада РБ па якасці

У адпаведнасці з патрабаваннямі сістэмы менеджменту якасці Таварыства, згодна са стандартам ISO 9001:2008, уся сістэма арыентаваная на спажыўца. Цесная сувязь са спажыўцом устанаўліваецца яшчэ на стадыі падрыхтоўкі конкурснай дакументацыі і наступным заключэннем дагавораў, дзе мы спрабуем прадугадаць пажаданні спажыўца, дакладна ўстанаўліваючы і вызначаючы ўсе патрабаванні да прадукцыі (работ).

Падчас правядзення работ мы своечасова рэагуем на ўсе моманты незадаволенасці спажыўца, выказаныя ім вусна або пісьмова, якія ў нас вызначаюцца як скаргі. Па скаргах праводзіцца расследаванне, дзе вызначаюцца прычыны ўзніклай неадпаведнасці, што прывялі да абгрунтаванай незадаволенасці спажыўцоў. За якасць выкананых работ або вырабленай прадукцыі спажывец выстаўляе адзнаку ў акце выкананых работ, а ў выканаўцы работ у сувязі з гэтымі адзнакамі дыферэнцуецца памер прэміі.

Па выніках закрытых дагавораў аддзел маркетынгу, як незалежнае падраздзяленне Таварыства, праводзіць анкетаванне спажыўцоў нашай прадукцыі. Вынікі анкетавання (у адпаведнасці з дзейнай працэдурай) мы ацэньваем як задаволенасць спажыўца па некалькіх складніках. У выніку мы маем аб'ектыўныя статыстычныя звесткі задаволенасці спажыўцоў і магчымасць сістэмнага рашэння па павышэнні гэтай задаволенасці.

На міжнародным форуме «Беларускі дом — 2011» былі прадстаўлены тавары народнага спажывання, вырабленыя на ААТ «Белэнергарамналадка». Для наведнікаў іх прадстаўляла інжынер па маркетынгу Алеся ТАНЧУК.

Аб БЭРНе расказваецца на 16 мовах у 27 краінах свету

Начальнік аддзела маркетынгу ААТ «Белэнергарамналадка» Арцём САРОКА адзначае, што спецыфіка таварыства вельмі разнапланавая, таму маркетынгавая палітыка будуецца з улікам падтрымкі ўсіх падраздзяленняў.

— Асноўным напрамкам аддзела з'яўляецца інфармацыйная палітыка, — падкрэслівае Арцём Анатольевіч, — калі мы паведамляем сваім патэнцыяльным заказчыкам аб тым, што робіцца на БЭРНе, аб новых распрацоўках, аб ужо выкананых работах. Распаўсюджванне такой інфармацыі ажыццяўляецца па лініі электроннай сувязі, шляхам прамой паштовай рассылкі, праз удзел у спецыялізаваных выставах, у тым ліку за мяжой. Ужо традыцыйна на працягу трох апошніх гадоў мы актыўна ўдзельнічаем у выставе «Энергетыка і электратэхніка» ў Санкт-Пецярбургу. У выніку было заключана дылерскае пагадненне з кампаніяй «Росмаш», якая дапамагае рэалізоўваць электратэхнічную прадукцыю на расійскім рынку — у прыватнасці, у паўночна-заходнім рэгіёне РФ. Летась наведвалі Маскву на выставе «Электра-2010», дзе добра аб сабе заявілі.

На сайце ААТ «Белэнергарамналадка» (www.bern.by) на прафесійным узроўні актуалізуюцца навіны прадпрыемства, пастаянна абнаўляецца інфармацыя аб нашых магчымасцях. Існуе зваротная сувязь з заказчыкамі. Пастаянна працуем з электроннымі гандлёва-інфармацыйнымі парталамі — у прыватнасці, з міжнароднай гандлёвай пляцоўкай, дзе цалкам размешчана інфармацыя аб нашым прадпрыемстве. Адразу інфармацыя аб БЭРНе падаецца на рускай мове, а потым аўтаматычна перакладаецца на 16 замежных моў і накіроўваецца ў 27 краін свету.

Нашай службай створаны прэзентацыйны фільм аб прадпрыемстве, які на выставах разам з іншай рэкламнай інфармацыяй прапануецца патэнцыяльным кліентам. Гэты фільм-прэзентацыя кожны год абнаўляецца. Асобна адзначу, што на прадпрыемстве паспяхова працуе цэх, які займаецца выпускам тавараў народнага спажывання... З пункту гледжання сацыяльнай прадукцыі мы з'яўляемся вытворцам сушыльнікаў ручнікоў, поручняў і агароджаў з нержавеючай сталі. Сёлета атрымалі статус звання «Лепшыя тавары года-2010» у галіне сушыльнікаў ручнікоў з нержавеючай сталі першымі з вытворцаў на рынку РБ гэтай прадукцыі. Даволі шырока выкарыстоўваюцца нашы поручні і агароджы на такіх аб'ектах, як падземны горад «Сталіца», у гіпермаркеце «Бігс», на станцыях метро і ў шматлікіх установах адукацыі, культуры і аховы здароўя.

У Музеі працоўнай славы прадпрыемства захоўваюцца дакументы і экспанаты, якія распавядаюць пра поспехі прадстаўнікоў розных пакаленняў. На гэтых здымках вы бачыце старшыню Савета ветэранаў ААТ «Белэнергарамналадка» Мікалая Ільіча РАМАНОВІЧА і бібліятэкарку Марыну ПАБЯГАЙЛУ; інтэр'ер музея.

Дырэктар філіяла «Белэлектрарамонт» Глеб ГРЫГАРЭНКА:

«Адзіная ў Беларусі сучасная ўстаноўка па апрацоўцы трансфарматараў працуе менавіта ў нас»

Міжсістэмная лабараторыя кантролю металу і зваркі. Мікраструктуры металу вывучае інжынер-металазнаўца Сяргей ЛІСОЎ.

— Работнікі нашага філіяла займаюцца рамонтам генератараў, электрарухавікоў любых габарытаў і трансфарматараў, магутнасцю трансфарматараў ад 2 кВт да 200 тысяч кВ/ампер і напружаннем ад 220 В да 330 кВ. Рамонт трансфарматараў да 4-га габарытаў ажыццяўляецца на базе прадпрыемства. Большыя па габарытах трансфарматары і іншае электраабсталяванне рамантуецца непасрэдна на станцыях і падстанцыях. Рамантуем любыя генератары, дзе мы абмежаваны толькі грузапад'ёмнымі механізмамі. Генератары вагой да 15 тон рамантуем на вытворчых плошчах прадпрыемства, а ўсе астатнія — на месцы ўстаноўкі.

Работы спецыялісты філіяла выконваюць і ў Беларусі, і за мяжой. У прыватнасці, мы ўжо неаднаразова выконвалі заказы па рамонце трансфарматараў і генератараў у Расіі і Літве.

Чаму запрашаюць менавіта нас? Бо мы захавалі адпаведны ўзровень тэхналогіі і высокаадукаваны персанал. Акрамя таго, у апошнія гады мы не гублялі час дарэмна. Куплялі новае абсталяванне. Напрыклад, летась набылі сучасную ўстаноўку па апрацоўцы трансфарматараў, ачыстцы ў іх масла і цвёрдай ізаляцыі. У Беларусі ёсць толькі адна такая ўстаноўка, і яна працуе ў нас.

Спецыялісты філіяла «Белэлектрарамонт» могуць ажыццяўляць і ўнікальныя рамонтныя работы. Напрыклад, на Лукомльскай ГРЭС рабілі замену абмоткі статара пасля поўнага яе зносу з далейшым павелічэннем магутнасці генератара ад 300 МВт да 320 МВт. Гэта ўжо не зусім рамонт, а цэлая мадэрнізацыя з поўнай заменай ротара і сістэмы ахалоджвання.

Галоўная задача нашага філіяла — займацца ўдасканальваннем тэхналагічнага працэсу па рамонце асноўнага электраабсталявання.

УНП 100345505.

Віктар ПАЗНЯКОЎ, Сяргей КУРКАЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

ФІЛІЯЛЫ ААТ «БЕЛЭНЕРГАРАМНАЛАДКА»

■ **«Інжынерны цэнтр»** — 220012, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 18. Тэл. (+375 17) 293 53 55.
■ **«Белэлектрарамонт»** — 220012, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 22. Тэл. (+375 17) 293 53 26.
■ **«Энергазапчастка»** — 220012, г. Мінск, вул. Мантажнікаў, 20. Тэл. (+ 375 17) 506 02 70.
■ **«МТРЦ-1»** — 220021, г. Мінск, Мінская ЦЭЦ-3, вул. Амельянюка, 4. Тэл. (+375 17) 246 17 22.
■ **«МТРЦ-2»** — 220019, г. Мінск, Мінская ЦЭЦ-3, вул. Мантажнікаў, 6. Тэл. (+375 10) 506 02 40.
■ **«Гроднаэнергарамонт»** — 230003, г. Гродна, вул. Скідзлеўская шаша, 18. Тэл. (+375 152) 75 54 21.
■ **«Лукомльэнергарамонт»** — 211162, г. Новалукомль, Лукомльская шаша, 10. Тэл. (+375 2133) 3 83 69.
■ **«Магілёўэнергарамонт»** — 212035, г. Магілёў, пр. Шмідта, 106. Тэл. (+375 222) 32 20 93.
■ **«Бабруйскэнергарамонт»** — 213800, г. Бабруйск, вул. Чэхава, 98а. Тэл.(+375 225) 43 14 63.
■ **«Светлагорскэнергарамонт»** — 247434, г. Светлагорск, вул. Леніна, 1-Б. Тэл. (+375 2342) 2 70 10.
■ **«Гомельэнергарамонт»** — 246043, г. Гомель, вул. Барыкіна, 132. Тэл. (+375 232) 41 70 02.

Эл. пошта: www.bern.by, e-mail: mail@bern.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	**Здание линейно-технического участка и право заключения договора аренды земельного участка**
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Шоссейная, 11/1
Продавец недвижимого имущества	РУП «Белтелеком», тел.: (0162) 20 28 88, (01643) 4 52 31
Сведения о предмете аукциона	Здание одноэтажное, 1969 г.п., площадь – 141,8 кв.м, склад, уборная, сети водопровода, теплоснабжения, ввод электрический, асфальтобетонная площадка, заборы с воротами и калиткой. Земельный участок площадью 0,1407 га использовать для производственного и социального обслуживания населения; срок аренды – 20 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб.	156 930 791
Сумма задатка, руб.	15 693 000
Организатор аукциона	***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: (0162) 23 12 63, 20 87 85, www.brest-region.by***

Аукцион состоится **14 июня 2011 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538; срок внесения суммы задатка – по 13 июня 2011 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

6. Консолидированным участником – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

7. Уполномоченным лицом консолидированного участника (его представителем) – доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе.

8. Представителем заявителя, уполномоченного лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель), уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:

подписать протокол аукциона в день аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка; внести в местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, 413 фонд «Брестоблимущество» по рабочим дням с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по 13 июня 2011 года включительно.

На сваёй скуры

ПЕРАГНАЦЬ МАШЫНУ З ЛІТВЫ

Як за мяжой мы шукалі «свежае» аўто па выгадным кошце? Частка 1.

Журналіст «Звязды» разам са сваёй сяброўкай выправіўся за мяжу па машыну. Задача амаль утапічная: выбраць добры варыянт і пры гэтым зэканоміць грошы.

Але як не нарвацца на канструктар?

Распачынаем аповед пра аперацыю «Перагоншчык». Вось як гэта было...

Шукаць машыны па аўтамабільных сайтах мы не пераставалі і ў нашым атэльчыку. За 25 еўра на дваіх мы мелі і душ у нумары, і інтэрнэт.

У 2012 годзе абяцаюць канец свету. Але для беларусаў гэта не самае страшнае. Бо з першага ліпеня 2011-га пагражаюць увесці новую размытнёўку на аўтамабілі з замежжа. І калі гэта здарыцца (стоадсоткавых гарантыяў пакуль ніхто не дае), машыны злёту падаражэюць на тысячы долараў. А цэны на некаторыя аўто падскочаць удвая.

Таму беларусы апантана кінуліся перапраўляць у краіну патрыманыя аўто.

У інтэрнэце з'явілася інфармацыя пра сутачныя заторы, пра бойкі на мяжы.

Усе гэтыя выпрабаванні асабіста я абмінуў: паспеў набыць для сябе машыну адразу ж пасля Новага года, да з'яўлення чутак пра магчымую размытнёўку. А вось мая сяброўка Крысціна вымушана была вырашаць аўтамабільнае пытанне гэтай вясной.

Дзяўчына за пяць гадоў вадзіцельскага стажу змяніла ўжо шэсць машын. Апошнюю, імклівую БМВ-траечку (2002 год выпуску, рухавік 2500 см³), нядаўна выгадна прадала і на гэты раз захацела малюсенькі аўтамабільчык, але з магутным, пражэрлівым матэрам. Любіць сяброўка арыгінальныя варыянты.

— *Валошын, не хачу аддаваць «перагонам» лішнія грошы. Паехалі разам па машыну за мяжу*, — прапанавала сяброўка. — *Знойдзем нешта цікавае, заадно архітэктуру пафатаграфуем, у кавярнях патусім...*

— *Дык паехалі*, — разважыў я і выправіўся збіраць дарожную торбу.

* * *

Сяброўка ведала, які з мяне перагоншчык. Сёлета ўвосень разам з калегам ездзіў па машыну ў Баварыю (нумары «Звязды» за 19, 20 і 23 лістапада мінулага года). Нагуляліся па Нюрнбергу і Фюрце, дзе выбралі дызельны «Сітраэн С3», які перагналі ў Беларусь. З прыгодамі. Бо аказалася, што ў машынцы няспраўная турбіна (вырашэнне праблемы ў нас каштуе 400 долараў). Без турбіны на загружаных і вузкіх польскіх дарогах нам прыйшлося няпроста.

Машыну такі перагналі. Праз нейкі час па прыездзе калега без праблем прадаў яе і набыў сабе добры ўніверсал павышанай праходнасці «Хюндай».

Па выніках тых публікацый, з дапамогай чытацкіх водгукаў і парад прафесійных перагоншчыкаў мы склалі спіс з асноўных памылак. І стварылі схему, як найбольш бяспечна і выгадна набыць аўтамабіль...

І вось цяпер перада мной і маёй сяброўкай стаяла новая баявая задача: сваімі высілкамі прывезці добрую машыну. Задача ўскладнілася тым, што машыну сабраліся купляць у Літве. У той самай суседняй Літоўскай Рэспубліцы, якая славіцца сваімі аўтамайстрамі, якія з трох аўтамабіляў могуць сабраць адзін. Як не разбіць галаву, звяліўшыся з абламанага сука? Як зрабіць правільны выбар і не набыць груду ламачча? Выйсце было знойдзена.

ПОШУКІ ВАРТЫХ ПРАПАНОЎ

Машыну шукал праз літоўскі сайт auto.plius.lt. Па сваёй структуры рэсурс падобны на беларускія, расійскія ды нямецкія аналагі. Ёсць рускамоўная версія.

Вялікая колькасць аб'яў тут — прапановы ад разнастайных фірмаў, якія зарабляюць продажам машын. Ёсць нямала прапаноў ад прыватных гандляроў, якія з гэтага жывуць. А якая задача ў гандляра? Любымі сродкамі «ўпіхнуць» вам машыну. Няхай сабе для гэтага трэба будзе назваць сапарухнелы конскі воз «Ролс Ройсам». Падыдуць усе сродкі.

Хоць не адмаўляю, што і праз літоўскія фірмы, і праз рынкі, і на камісійных пляцоўках можна набыць добрае аўто. Але для гэтага ў машынах неабходна дасканала разбірацца. А з мяне такі ж аўтамабільны спец, як з курыцы буйвал.

Таму прыдумляем хітрую стратэгію.

Па-першае, варыянт шукаем толькі па прыватных прадаўцах, сярод якіх спрабуем ідэнтыфікаваць прыстойных людзей. Па-другое, нас цікавяць нестандартныя бензінавыя рухавікі, моцныя і пражэрлівыя. Такімі машынамі нашы перагоншчыкі амаль не цікавяцца. Яны ў асноўным пераганяюць дызелі, а з бензінавых рухавікоў выбіраюць не самыя моцныя: так і размытнёўка атрымліваецца таннейшай, і пакупнікі нашы на распаўсюджаныя рухавікі больш клююць.

І гэта стратэгія выбару спрацавала. З аднаго боку, беларусы выграбаюць з Літвы ўсе магчымыя машыны, маладзейшыя за 10 год. Цягнуць у краіну вераніцы тралаў з аўто, вырываюць тавар з рукамі. З іншага боку, па аб'явах наконт такіх нестандартных машын беларусы амаль не тэлефануюць.

Знаходзім арыгінальны чырвоны кабрыялет «Міцубішы Кольт» у Каўнасе, тэлефануем, але машыну цягам дня прадалі камусьці з Літвы. Гэтак жа з-пад носа сцягнулі купэшную «Опель Астру» і хэтчбэк «Мазда-3».

А вось «Сітраэн С4» і «Міні Купер» былі гатовыя ехаць у Беларусь.

— *Але не падабаюцца мне гэтыя перцы*, — зрабіла высновы Крысціна пасля тэлефонных размоваў з прадаўцамі. — *Занадта нахвальваюць гэтыя машыны: і стан у іх ідэальны, і прабег малы. Хлусяць, напэўна.*

— *Мутныя. Вельмі падобныя на некаторых нашых каючых з аўтарынка*, — пагадзіўся я. — *Давай шукаць далей.*

Пошукі прывялі да нечаканага варыянту ў Вільні: «Сітраэн С2» 2006 года выпуску з нестандартным рухавіком (1600 см³ і 122 конскія сілы). Сама машынка маленькая, можна падымаць замест гантэлі. А рухавік такой сілы, што магчыма

Такім мы пабачылі на літоўскім сайце «Сітраэн С2», які збіраліся паглядзець у першую чаргу. Матор 1600 см³, 122 конскія сілы, магчымы разгон за 200 км/г, 2006 год выпуску.

Нас цікавяць нестандартныя бензінавыя рухавікі, моцныя і пражэрлівыя. Такімі машынамі нашы перагоншчыкі амаль не цікавяцца. Яны ў асноўным пераганяюць дызелі, а з бензінавых рухавікоў выбіраюць не самыя моцныя: так і размытнёўка атрымліваецца таннейшай, і пакупнікі нашы на распаўсюджаныя рухавікі больш клююць.

ўсталёўваць на мініэвэны. Разганяецца больш як да 200 км/г. Добра.

Для падстрахоўкі знайшлі яшчэ два варыянты непадалёк ад Вільні — «Пежо 206» і «Сеат Леон».

У сяброўкі загарэліся вочы.

ЯКІЯ ЦЭНЫ НА ХАРЧАВАННЕ, ПРАЕЗД І ПРАЖЫВАННЕ?

Дабіраючыся да Вільні на маім дызельным «Опелі Астра Н», мы, напэўна, паўтарылі дасягненне Івана Сусаніна.

Ехаць з беларускай сталіцы да Вільні — 180 км. Але мы вырашылі дабірацца праз Польшчу. Менавіта на мяжы з гэтай краінай Крысціне мусілі паставіць першы штамп у пашпарце. У выніку дарогу пераадолелі ўтрая большую, чым варта. Пры гэтым здорава затрымаліся на польскай мяжы, прастаялі тры з паловай гадзіны. Хоць і чаргі асаблівай не было.

Праязджаючы па вузенькіх мініяцюрных дарожках праз польскі Аўгустаў, заскочылі ў супермаркет, дзе за 30 злотых (каля 8 еўра) набылі прадуктаў — напоі, хлеб, сыр, салаткі.

Пакрысе даехалі да былой польска-літоўскай мяжы непадалёк ад горада Лаздзія. Стаяла цемрадзь, і тым больш загадкавым выглядаў некалі вялікі памежны пункт пропуску. Некалі і тут, напэўна, стаялі пяцігадзінныя чэргі. А сёння на гэтым месцы — апусцелыя мытныя будынкі, якія нагадваюць фільмы пра апакаліпсіс і захоўваюць памяць пра часы, калі Літва не ўваходзіла ў склад Еўрасаюза.

Праўда, на тэрыторыі былога пункта пропуску нам усё ж сустрэўся «козлік» з памежнікамі, якія могуць выбарачна спыняць машыны, правяраць пашпарты, страхоўкі і затрымліваць нелегальных мігрантаў. У раёне былога прапускнога пункта самотна туляцца некалькі абменнікаў, дзе можна абмяняць злотыя на літы.

— *Пустая мяжа — мара для нашых саляравозаў. Рабі хоць па васемнаццаць ходак на дзень*, — рэзюмавалі мы, аглядаючы непатрэбныя ўжо мытныя канструкцыі шырока расплюшчанымі вачыма.

Але столькі па еўрапейскіх дарогах, натуральна, не наездзішся. Тое ж дызельнае паліва каштуе пад паўтара еўра (!). 95-ы бензін — нязначна даражэйшы. Таму перад тым, як заехаць у Еўрасаюз, мы заправілі поўны бак майго «Опеля», чаго з гакам хапіла на ўсю вандроўку...

Стомленыя, апоўначы мы заехалі ў Вільню і з дапамогай навігатара знайшлі вуліцу Укмергес. Тут, на першым паверсе аднаго з новых шматпавярховікаў, знаходзіцца прыватны атэль «Мара». Знайсці яго не так і проста: няма нават шыльдачкі з назвай.

Гэту начоўку мы адшукалі праз міжнародны сайт booking.com, дзе хапае варыянтаў з гатэлямі і хостэламі па ўсёй Еўропе.

Наш атэльчык стаўся сюрпрызам: сучасны пакой, з новай мэбляй, з душам і прыбіральняй, інтэрнэтам. «Мара» займае крыло на першым паверсе новага шматпавярховіка. Двухмесны пакой на суткі каштаваў ўсяго 25 еўра. На восем нумароў атэля ёсць кухня — з посудам, лядоўняй.

Гаспадыня па імені Марына, як аказалася, жыла ў гэтым жа шматпавярховіку. Засяленне адбываецца круглыя суткі. Гаспадыні трэба скінуць эсэмэску на мабільны, і яна цягам некалькіх хвілін спускаецца ў двор.

Калі такія цэны, чаму б не спыніцца ў мілым атэльчыку і не пераначаваць па-людску, каб назаўтра на свежую галаву выбраць машыну?

— *Спачатку тут планаваліся офісы, але грукнуў сусветны фінансавы крызіс*, — адказвае ветлівая гаспадыня на нашу хвальбу. — *Тады вырашылі заняцца атэльным бізнэсам. І справа пайшла. Нават сёння, у будні дзень, вы занялі апошні нумар. Справа ад вас сінгапурцы, злева — пара з Нідэрландаў...*

Харчуемся, праглядаем аўтамабільныя сайты, чытаем іншыя навіны.

— *Трасца ў бок!* — сінхронна ўскрыкнулі мы з Крысцінай, даведаўшыся пра ліквідацыю Усамы бін Ладэна. Памянулі дзеяча бутэлькай чылійскага чырвонага віна. Пасля яе няўхільна заснулі, як тыя асілкі на печы. Заўтра нас чакаюць вялікія справы.

НАБЫЦЦЁ МАШЫНЫ СУМЯСЦІЛІ З ТУРЫСТЫЧНАЙ ПРАГРАМАЙ

Адпачывалі мы, як кажуць, па-панску. Да дзесяці гадзін раніцы. Пасля — душ, зялёная гарбата з латышскімі глазіраванымі сыркамі...

Насупраць нашага атэльчыка — гіпермаркет «Максіма». Ідзём туды, выбіваем талончык у мясцовым банку і з паўгадзіны чакаем у чарзе, каб памяняць долары на літы.

Купляем літоўскую сім-карту і кладзём на рахунак трошкі літаў (у эквіваленце пяці долараў). Нарэшце каля дванаццатай гадзіны тэлефануем прадаўцу «Сітраэна С2» Арунасу.

— *Вой! А я думаў, што вы пажартавалі, калі сказалі, што прыедзеце*, — амаль без акцэнту адказаў наш прадавец і прадыктаваў адрас. — *Я зараз катаюся па справах фірмы. Усё хутка вырашу і чакаю вас у сваім офісе.*

Дзве гадзіны чакання? Пра такое немагчыма казаць, калі гаворка вядзецца аб Вільні. Культавы горад для кожнага нармальнага беларуса. Грэх не пагуляць па старадаўніх вулачках тутэйшага старога месца. Адсюль кіраваў вызвольным антыцарскім паўстаннем наш Кастусь Каліноўскі. Тут жа ён быў арыштаваны царскімі жандарамі і закатаваны. У Вільні працаваў Францыск Скарына. Тут выходзілі першыя беларускія газеты, ствараліся нашы першыя музеі. Горад непарыўна звязаны з гісторыяй Беларусі.

У 1939 годзе Сталін выключыў Вільню са склада БССР, а ў 1940 годзе легендарны горад стаў цэнтрам Літоўскай ССР.

Сёння віленчукі валодаюць адразу некалькімі мовамі — сучаснай літоўскай, польскай, рускай, многія разумеюць па-беларуску. Гэты горад сваёй міжкультурнай непаўторнасцю дасць фору любой еўрапейскай сталіцы.

Мы паабедалі ў рэстаране ля дома, дзе жыў і працаваў Скарына. Пасля прагуляліся да легендарнага Касцёла Святой Ганны.

— *Згодна з легендай, калі гэты храм пабачыў Напалеон Банапарт, то сказаў: «Я б паклаў яго ў хусціначку і перанёс у Парыж»*, — выхваляюся я ведамі перад сяброўкай. — *Тым не менш, французы ў 1812-м самі і спалілі драўлянае аздабленне ўнутры касцёла Святой Ганны...*

За гэтай гістарычнай байкай нас заспеў званок ад гаспадара «Сітраэна» Арунаса: «Прыязджайце...»

З гэтага моманту мы настроіліся на сур'ёзны лад, насупілі лбы і паехалі на пільны агляд «Сітраэна С2». Галоўная фаза баявой аперацыі «Перагоншчык» набліжалася да развязкі. Але якую машыну нам прад'явіць Арунас?

(Працяг будзе.)

P.S. ***Праўда пра «Сітраэн С2», які мы збіраліся купіць, шакавала. Аднак гэта нас не спыніла — літоўскі «добры варыянт» урэшце быў-такі выбраны.***

Які метад мы распрацавалі, каб збіць цану, калі ў машыне няма да чаго прычапіцца? Ці прастаялі мы на мяжы ў сутачных чэргах? Як афармілі машыну і як зрабілі размытнёўку? Колькі мы зэканомілі на машыне, прыгнаной з Літвы? Пра ўсё гэта ў заўтрашнім нумары «Звязды».

Яўген ВАЛОШЫН.
Фота Крысціны ЛАСКІ.
Мінск—Аўгустаў—Вільня.

«І бізнэсовец прачытаў на памяць верш Алега Лойкі пра Слонім!»

У маі вядомаму беларускаму пісьменніку і літаратуразнаўцу Алегу Лойку споўнілася б 80 гадоў

Сябры і паплечнікі Алега Антонавіча плануюць неўзабаве выдаць кнігу ўспамінаў пра пісьменніка. Кніга будзе багатая на рарытэтныя фотаздымкі, структурна і стылістычна будзе нагадваць кнігі пра Уладзіміра Калесніка «Пасланец Праметэя», што выдалі ў Брэсце, і пра Уладзіміра Караткевіча «Быў. Ёсць. Буду». З Уладзімірам Караткевічам, дарэчы, Алег Лойка вельмі сябраваў. У 2008 годзе, ужо моцна хворы на цукровы дыябет, усё-ткі завяршыў свой раман-эсэ пра Караткевіча «Уладзімір Караткевіч, альбо Паэма Гарсія Лойкі». Менавіта так, Гарсія Лойкам называў Алега Антонавіча Уладзімір Караткевіч, майстар і аматар перайначваць прозвішчы сваіх сябрукоў.

Літаратуразнавец Анатоль ВЕРАБЕЙ, калега і сябра Алега Антонавіча, цяпер узначальвае працу над кнігай пра Алега Лойку:

— У мінулы панядзелак я вяртаўся з Гродзеншчыны ў Мінск. На спадарожнай машыне мяне падвозіў жыхар Слоніма. Мы разгаварыліся. Ехалі каля мястэчка Дзярэчын, дзе некалі была рэзідэнцыя Сапегаў, пра Агінскага разгаварыліся. Калі мы пад'язджалі да Слоніма, мой спадарожнік (а ён сам бізнэсовец) прачытаў мне верш Алега Лойкі пра Слонім. І мне так было прыемна! Некалі Адам Міцкевіч марыў, каб яго кнігі трапілі пад стрэхі. Паэзія Алега Лойкі трапіла пад стрэхі, народ ведае яго вершы.

За сваё жыццё Алег Лойка выпусціў 101 кнігу, большасць з якіх былі кнігамі паэзіі. Яго раманы «Французык Скарына, або Сонца Маладзіковае» і «Як агонь, як вада» пра Янку Купалу выйшлі ў знакамітай серыі ЖЗЛ у Маскве. Алег Лойка пераклаў на беларускую мову творы Гётэ, Шылера, Поля Верлена. Ён адзін склаў гісторыю беларускай літаратуры ад самага пачатку і да пачатку XX стагоддзя.

— Ён застаўся ў нашай культуры як жывы чалавек, які, калі трэба, мог і на баяне сыграць, і песню праспяваць, — распавядае сябар Алега Лойкі **літаратуразнавец Вячаслаў РАГОЙША**. — Ён застаўся як паэт і празаік, гісторык і тэарэтык літаратуры, як перакладчык. Яго ўнёсак у айчынную літаратуру проста бясцэнны.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

ЖЫЦЦЁ ІДЗЕ СВАІМ ШЛЯХАМ

Парламент Беларусі ў першым чытанні прыняў праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях і гарантыях правоў грамадзян пры іх ужыванні».

Гэты закон выклікаў пратэст з боку каталіцкага Касцёла, а затым «пробны камень» ад РПЦ кінуў протаіерэй Георгій Рой і даў рэлігійна-этычную экспертызу законапраекту («Жыццё — гэта падарунак Бога», «Звязда» 7.05.2011).

Сутнасць праблемы

Калі ў сям'і няма дзяцей (напрыклад, жанчына не можа дзіця вынасіць), то сёння ёсць магчымасць вырашыць гэтую праблему з дапамогай медыкаў. Яйцаклетка жонкі апладняецца семенем мужа, і эмбрыён закладваецца іншай жанчыне — сурагатнай маці, якая і выношвае чужое дзіця, а калі тое народзіцца, то дзіця забіраюць біялагічныя бацькі.

Здараецца, што мужчына не можа мець дзяцей, і тады ёсць магчымасць выкарыстаць донарскае семя...

Вось супраць гэтага і выступае царква. У сваім артыкуле протаіерэй Г. Рой робіць, найперш, націск на этычны бок праблемы. Ды і ў свеце няма адназначнага падыходу да сурагатнага мацярынства.

У кожнай краіны свая этыка

Сурагатнае мацярынства забаронена ў шэрагу краін — гэта Нарвегія, Швецыя, Швейцарыя, Германія, Аўстрыя, у некаторых штатах Амерыкі... А вось у Вялікабрытаніі, Аўстраліі, Даніі, Канадзе, Нідэрландах... дазволена толькі некамерцыйнае мацярынства. Сурагатная маці за нараджэнне чужога дзіцяці не павінна браць грошы. У некаторых краінах (Бельгія, Ірландыя, Фінляндыя) сурагатнае мацярынства існуе, а вось законаў, якія яго рэгламентуюць, там няма.

Але ёсць шмат краін, дзе на камерцыйнай аснове прымяняюцца рэпрадуктыўныя тэхналогіі. Можна гэта рабіць у большасці штатаў Амерыкі, ПАР, Расіі, Украіне....

А як да гэтай праблемы ставіцца Сусветная медыцынская асацыяцыя (СМА)? У адпаведнасці з Брусельскай дэкларацыяй (1985 г.) СМА, адносіны да сурагатнага мацярынства адмоўныя з-за эксплуатацыі жанчын, якія выступаюць у ролі платных інкубатараў. Менавіта магчымасць камерцыялізацыі сурагатнага мацярынства і насцярожвае многіх. Гэтаму моманту таксама ўдзяляе ўвагу аўтар публікацыі ў нашай газеце.

За ўсё трэба плаціць?

Законапраект, які разглядае Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, мае адметнасць ужо тым, што закон не навязваецца грамадскасці, а толькі надае існуючай з'яве юрыдычнае афармленне, бо рэпрадуктыўныя тэхналогіі прымяняюцца ў Беларусі ўжо не адзін год.

А зараз пра камерцыйны бок справы. Мяне заўсёды падкупляе празрыстасць і яснасць у адносінах паміж людзьмі. Калі яны існуюць, то ёсць магчымасць пазбегнуць непаразуменняў. На добро ты адказаў добром, а за тавар ці паслугу заплаціў, таму адпадаюць многія праблемы. Усё мае сваю цану. Жанчына дала згоду вынасіць чужое дзіця і атрымаць за гэта, напрыклад, 20 мільёнаў рублёў — што ў гэтым кепскага? Сям'я будзе гадаваць сваё дзіця, а сурагатная маці атрымае агавораную суму, і ўсе бакі павінны быць задаволены. А закон дае магчымасць юрыдычна замацаваць здзелку. Цынічна, але ясна...

«Пры этычнай ацэнцы сурагатнага мацярынства мы можам сказаць, што яно цалкам параўнальнае з практыкай пакупкі і продажу дзяцей. Дзіця робіцца таварам», — заяўляе протаіерэй. Лічу, што гэта не так: для біялагічных бацькоў гэта не тавар, а сваё родненькае дзіцятка. На такі крок ідуць тыя пары, якія моцна жадаюць мець сваё дзіця.

Ці вось яшчэ такі пасыл. *«У нашым выпадку адбываецца абуральная падмена паняццяў, калі за азначэннем сапраўды высакародная уласцівасці хаваюцца вельмі спрэчныя з пункту погляду этыкі дзеянні карыслівага характару»*. І аўтар артыкула здзіўляецца: «Па якіх прычынах заканадаўцы не жадаюць назваць рэчы сваімі імёнамі?»

Мне здаецца, што трэба назваць.

Дык вось, мне асабіста здаецца, што малітва стала самым хадавым таварам, і святары паўсюдна выкарыстоўваюць гэты тавар, які, дарэчы, не мае гарантыі. За асвячэнне хаты ці аўтамашыны — 50 тысяч, а за пахаванне нябожчыка — 200 тысяч рублёў (цана можа вагацца).

На мой погляд, святарам і багасловам не трэба асабліва ціснуць на этыку, бо, як піша Г. Рой, «гандаль ёсць гандаль». Адзін мае заробак на малітве, а сурагатная маці — на тым, што народзіць чужое дзіця.

Мой апанент шкадуе і сурагатную маці, якая *«ў большасці выпадкаў перажывае пакутлівы псіхалагічны стрэс, аддаючы народжанае ёю дзіця»*.

Жанчына свядома ідзе на такі крок і мае за сваю «паслугу» вялікія грошы, і няма чаго яе шкадаваць — ніхто не прымушаў. Нарадзіла, грошы атрымала — і бывай, дарагая! А як па-іншаму? Гэта да таго, што сурагатная маці згодна з беларускім законам будзе пазбаўляцца ўсякіх правоў на дзіця. Але протаіерэй Г. Рой абураецца, што, паводле закона, прызнаецца магчымасць аплаты здзелкі паміж генетычнымі бацькамі і сурагатнай маці, а гэта быццам бы пярэчыць разумнаму этычнаму погляду на праблему вартасці.

Беларускі праект закона ўжо тым добры, што ў адносіны бакоў уносіць яснасць. У тых краінах, дзе сурагатнае мацярынства дапускаецца не на камерцыйнай аснове, зроблена гэта для супакаення сумлення. Афіцыйна за нараджэнне дзіцяці жанчына можа нічога не атрымаць, але аддзякаваць ёй заўсёды можна, што, як правіла, і робіцца. Не будзем крывадушнічаць наконт «разумнага этычнага погляду».

Калі малітва — зварот до Усявышняга — мае цану, то і за выношванне чужога дзіцяці трэба плаціць. І яшчэ раз нагадаю: за ўсё неабходна плаціць! Я не асуджаю святароў, якія бяруць за малітву грошы, — я выступаю супраць ханжаства.

Дзіця не выбірае

«Пры выкарыстанні донарскіх палавых клетак парушаецца прынцып адзінства і непарушнасці сямейнай пары. У працэсе зачацця ўдзельнічае трэці бок» ці «ўсякі чалавек мае права ведаць, хто яго бацькі», — сцвярджае протаіерэй Г. Рой.

А калі сямейная пара ўзяла пакінутае немаўля з радзільнага дома і ўсынавіла яго? Зроблена было гэта тайна, каб ніхто з блізкіх і знаёмых не ведаў. Гэты крок прадыктаваны толькі жаданнем, каб чужое дзіця стала родным. Як у такім выпадку быць? Трэба будзе з часам усё дзіцяці расказаць? А можа не, і тады для ўсіх будзе лепш? Хіба тайна ўсынаўлення не ахоўваецца законам? Калі ўсынаўляецца чужое дзіця, то трэці бок тут таксама прысутнічае. Чыё яно?

Дзіця бацькоў не выбірае. Біялагічныя бацькі нарадзілі і забылі (добра, што не выкінулі на сметнік), а чужая сям'я выгадавала. Дык да якіх бацькоў адносіцца біблейскі запавет: «Паважай свайго бацьку і маці...» — да біялагічных, якія дзіця кінулі, ці тых, што выгадавалі?

І не трэба плакацца, што пры сурагатным мацярынстве «разбураецца» сама існасць мацярынства і бацькоўства, што дзіця ў будучым будзе пакутаваць і пытацца: «Хто мая сапраўдная мама?» Не трэба ціснуць на свядомасць, што ад дзіцяці могуць адмовіцца ўсе, — дзяржава не адмовіцца.

А колькі немаўлят пакідаюць у радзільных дамах! Народзіць, падпіша паперы, што адмаўляецца, — і пайшла. І гэтыя дзеці ў будучым будуць пакутаваць і ціквіцца сваімі бацькамі? Але чамусьці гэта не так трывожыць апанента. Можа, таму, што такіх дзяцей у нас шмат?

А наконт таго, што ўтойванне донараў у бліжэйшыя дзесяцігоддзі можа прывесці да блізкародных шлюбаў, то рэпрадуктыўныя тэхналогіі — не такая ўжо і пашыраная з'ява. Ці многія з нас ведаюць усю сваю радню? Напрыклад, я магу пералічыць толькі стрыечных братоў і сясцёр, ды родных пляменнікаў, а астатніх не пералічыць, і дзе яны... Сваяцкія сувязі рвуцца, бо дзеці не сядзяць пры бацьках — жыццё стала імклівым.

Дарэчы, дзеці Адама і Евы перажаніліся паміж сабою — гэта калі прытрымлівацца біблейскага сюжэту. Праўда, выгнаны за забойства брата Каін ажаніўся з чужой, а гэты факт сведчыць, што і да Адама з Евай людзі на зямлі існавалі. Накладкі бываюць...

Судзіце не па словах...

Забаронай нічога не дабіцца, бо калі не дазволіць сурагатнае мацярынства ў Беларусі, то гэта можна будзе зрабіць у той жа Расіі.

Цікава, а чаму царква дапусціла прыняцце закона аб ДРТ у Расіі?

Жыццё ідзе сваім шляхам, і тое, што за дзве тысячы гадоў царква не здолела накіраваць яго ў адпаведнасці са сваімі догматамі, толькі сведчанне гэтаму.

Мне думаецца, трэба не так хвалявацца лёсам эмбрыёнаў, а найперш — лёсам кінутых дзяцей. Чамусьці клопат пра іх ускладзены толькі на дзяржаву? А хіба святары не павінны быць сярод кінутых, абяздоленых?

У свой час царква выступіла супраць абортаў. І што? Словы, словы, словы...

А хіба ў Святым Пісанні не сказана: «Судзіце не па словах іх, а па справах»?

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

23 мая 2011 года в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Минскэнергострой».

Повестка дня:

1. О сделках Общества.

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.
Начало регистрации в 11.30.

УНП 100008291

К сведению акционеров ОАО «Технолит Полоцк»!

Открытое акционерное общество «Технолит Полоцк» сообщает, что согласно решению внеочередного общего собрания акционеров в период по 06 июня 2011 г. будет осуществляться выплата дивидендов в следующем порядке:

- акционерам – работникам общества – в кассе общества или путём перечисления на вкладные счета;
- сторонним акционерам – физическим лицам – почтовым переводом или путём перечисления на вкладные счета;
- юридическим лицам – путём перечисления на расчётный счёт.

Тел. для справок 42 23 69.

Дыскусійная трыбуна

«Калі я не патрэбны Беларусі, буду працаваць на іншыя краіны»

Аўтар і кіраўнік «Млына моды» Саша Варламаў расказаў «Звяздзе», чаму праект больш не можа існаваць у былым фармаце

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Калі мы толькі пачыналі працаваць, трэба было ствараць сістэму падрыхтоўкі дызайнераў. Вядома, мы абапіраліся на вучэбныя ўстановы. Міністэрства адукацыі ў гэтым выпадку было вельмі дарэчы — прафесійная падрыхтоўка дызайнераў, канструктараў, швачак.

Але прадстаўленне моды — іншая рэч. Гэта павінна быць ужо ў межах Міністэрства культуры. Бо Міністэрства адукацыі часта патрабуе: абгрунтуй колькасць пражэктараў на сцэне, абгрунтуй колькасць мадэляў на сцэне, абгрунтуй колькасць вядучых... Тое, што відавочна, зразумела і натуральна для Міністэрства культуры, абсалютна незразумела для Міністэрства адукацыі.

«Млын моды» як народны дыпламат

— Больш за тое, я лічу, што павінна далучыцца і Міністэрства замежных спраў — мы і так з імі працуем. Калі мода вывозіцца за мяжу, дзе прэзентуе краіну, усе паказы адкрываюць прамовы беларускіх паслоў. Гэта ўжо народная дыпламатыя. Практычна ва ўсіх краінах, дзе мы бываем, усюды праводзім лінію Беларусі. Тут жа паўстае і пытанне сумеснай працы з тэлебачаннем. Самы галоўны спосаб пранікнення моды — гэта тэлебачанне. Яно выступае як рухавік новых беларускіх імёнаў. Відавочна, узнікае пытанне саюза з Беллегпрамам, таму што на прадпрыемствы лёгкай прамысловасці павінны прыходзіць маладыя дызайнеры. І моладзь павінна ведаць і разумець, што іх чакаюць і яны патрэбныя, інакш — навошта іх выпускаюць?

«Апошнія 12 гадоў я і мая каманда не атрымліваем ніводнай капейкі заработнай платы. Гэта смешна — людзі працуюць практычна задарма».

«Людзі працуюць задарма»

— Такім чынам узнікае шэраг праблем, з якімі трэба разабрацца. У тым выглядзе, у якім сёння існуе «Млын моды», ён далей не працягне. Восем гадоў гэты праект я вёў сам, але тады ў нас былі спонсары. Апошнія 12 гадоў я і мая каманда не атрымліваем ніводнай капейкі заработнай платы.

НА ЧУЖЫХ ПАМЫЛКАХ

...Пачуў па радыё песню «Где-то на сопках багульник цветет» і ўспомніў...

Мы, супрацоўнікі Мінскага абласнога камітэта па экалогіі, выехалі неяк у лес на адпачынак. Збіралі хто што мог: лекавыя расліны, грыбы, буякі. А я па натуры — чалавек вясёлы, таму пры гэтым яшчэ і спяваў (трэба ж скарыстацца магчымасцю, бо ў горадзе ды на працы песню ж не зацягнеш: падумаюць, што хлебануў чаго). Зрэшты, яно і тут «падкалолі»:

— І калі гэта вы паспелі?.. — спытала ў мяне начальніца.

— Што паспеў? — не адразу дайшло.

— Ды чарыцу кульнуць.

Я толькі рассмяяўся.

Зрэшты, захмялець у тым лесе і без чаркі можна было: галава кругам ішла — ад дурману нейкага. Адна з каляжанак патлумачыла, што пахне багун — вечназялёная расліна сямейства верасовых.

Нешта яшчэ пра яе распавядала, але я не дужа ўнікаў. Запомніў толькі, што багун — гэта проста цудадзейны сродак ад молі! Таму бачыць яго пад нагамі, можна сказаць, трымаць у руках і не нарваць, не прывезці дамоў я, вядома ж, не мог...

Вярнуўшыся ў Мінск, адразу ж палез у антрэсолі, дастаў адтуль сваю новую шапку з лісы, з усіх бакоў абклаў яе галінкамі багуну, зверху ўсё абкруціў паперай і са спакойнай душой паклаў на месца. Думаў, што ўжо цяпер за шапку сваю (а яны ў той час былі і страшэнна дэфіцітнымі, і не менш дарагімі) магу не хвалявацца...

Што я і рабіў: толькі праз месяц-другі, калі паціснулі сапраўдныя халады, палез на антрэсолі. Не чакаючы сюрпрызаў, дастаў пакунак з шапкай, спакойна разгарнуў паперу і...

Шчасце, што на падлозе стаяў (з табурэткі злез), а то з перапуду, відаць, долу зваліўся б! Відок у маёй шапкі быў — горай не прыдумаць: месцамі зеўралі пралысіны, поўсць ад скуры адстала...

Я вачам уласным не верыў: як жа так? Мне ж не абы хто — паважаны чалавек — казаў, што багун засцерагае ад молі! Што гэта — цудадзейны, надзейны сродак... Няўжо ж падмануў?

На працу я нёс сваю шапку ў руках. Адразу ж падаўся да той каляжанкі — не, не сварыцца, бо не мужчынская гэта справа, — «падзякаваць» за параду.

А... не атрымалася, таму што ва ўсім, як аказалася, вінаваты сам. Багун — расліна ядавітая. Таму, пакладзеная звонку, яна, безумоўна ж, засцерагала футра ад молі, аднак пры гэтым паспяхова... «ела» яе сама. Яго ўнутр, у сярэдзіну шапкі, трэба было пакласці!

...Цяпер вы гэта ведаеце. І памылкі маёй не паўторыце! Ці не так?

Уладзімір Шулякоўскі,
г. Мінск.

РАДНЯ

Мая гісторыя крыху сумная, але што праўдзівая — факт!

Даўным-даўно, яшчэ ў пазамінулым веку, нарадзілася ў адной сям'і трое сыноў — раслі, нечаму навучаліся, думалі пра жаніцьбу. Двое старэйшых нават шукалі ўжо багатых нявест, але дзе ж ты іх знойдзеш, калі сам не такі... А вось малодшы прыгледзеў сабе добрую дзяўчыну ды і ажаніўся. Дружна зажылі, як людзі. Да таго ж гаспадар, апроч іншага, яшчэ шыць умеў. Таму неўзабаве нейкія грошы ў сям'і з'явіліся, і хапіла іх, каб «купіць» малога сынка, потым — трохі зямлі, распачаць будаўніцтва дома.

Аднак мары іх аб ім, аб мірным жыцці так і не збыліся: пачалася вайна і... Акурат 9 мая 1945 года жонка з сынам атрымалі пахаванку.

Не перадаць, як ім цяжка было — і ў той дзень, і ў бязлі наступных! Хапала і голаду, і холаду, і болю, але ж (ці не самае крыўднае) не мелі яны аніякай падтрымкі з боку бацькавых братоў. Горш за тое...

Адзін з дзядзькоў губны гармонік аднекуль прывёз. І трэба ж — пляменнік згледзеў яго, ды ніякіх цацак не бачыўшы... (Ну, хіба што самаробная драўляная шабля ў яго была ды бляшанка ад нямецкіх кансерваў — замест мячыка.) А тут — гэткі цуд: гармонік! Ды бліскучы, прыгожы! А грае як!

— Прыйдзеш другім разам, — аддам, — убачыўшы, як загарэліся вочкі мальца, субожыўся родзіч.

Малы ледзь прыждаў таго разу — ледзь перажыў ноч! Ён ужо ўяўляў, як пакажа гармонік сваім сябрукам, як дасць усім патрымаць, як навучыцца іграць... Таму да дзядзькі прыбег рана-раненька.

— Ну што — па гармонік? — спытаўся той і ўжо хацеў аддаваць, але другі тут жа спыніў яго: ты што, маўляў, ён жа да вечара зломіць...

Дзядзька запытальна паглядзеў на пляменніка, потым на гармонік і... паклаў яго назад — туды, дзе ўзяў.

Сэрца дзіцяці ледзь не разарвалася ад крыўды, ад болю! Хлопчык плакаў уголас, плакаў наўзрыд!.. Маці ледзь супакоіла, ледзь давяла яму, што ён ужо не малы, а хутка і зусім ужо вырасце, вывучыцца і тады купіць не нейкі там маленькі губны гармонік, а сапраўдны, вялікі, навучыцца іграць, і будзе чуваць яго — на ўсю акругу, не меней!..

Школу і сапраўды хлопчык скончыў добра — з сярэбраным медалём, паступіў у інстытут, праўда, вучыцца паехаў у старых бацькавых ботах і ў паддзёўцы. Так што неразумныя дзяўчаты ў горадзе паказвалі на яго пальцамі і смяяліся, але ён на гэта навучыўся не зважаць, бо ведаў, што нічога іншага маці-калгасніца прапанаваць яму не можа. Маглі дзядзькі, у якіх па-ранейшаму не было ні жонак, ні дзяцей, але ж не хацелі — не далі ні рубля. Што заставалася рабіць — падпрацоўваць, па начах выгружаць вагоны, каб купіць сабе больш-менш прыстойнае адзенне, абутак і многае іншае, з неабходнага, з патрэбнага для жыцця...

Ды што там — нават баян ён купіў! Праўда (і на жаль!), не сабе, а... свайму сынку, які, што цікава, нарадзіўся ў Дзень Перамогі, 9 мая — роўна праз 20 гадоў пасля вайны!

...А што да «радні» яго, да дзядзькоў, то яны свой век так і зжылі — бабылямі.

Спачатку адзін памёр, потым другі. Хаваць іх прыйшлося... пляменніку, бо павінен — сваяк.

Валянціна Пабягайла,
г. Ляхавічы.

ПА-БРАЦКУ

...Я тады яшчэ студэнтам быў, жыў на адну стыпендыю. Гэта значыць, з голаду не пух, але есці хацеў пастаянна. Таму з найвялікшай ахвотай ездзіў у вёску, з яшчэ большай — да сваіх заможных стрыечных сясцёр.

Адна з іх жыла на Мядзельшчыне, недалёка ад возера Рудакова. Сама працавала настаўніцай, муж — аграномам у калгасе. Ды і гаспадарку неслабую мелі, таму і пачастункі ў іх доме былі адпаведнымі: паляндвічка, кумпячок, каўбаска, мяса...

Дык вось, прыехаў я неяк да іх у госці, наеўся — ад пуза (шкада, што нельга было ў запас...), пацягнула да возера.

Збіраліся туды не на гадзіну, не на дзве, таму з сабой прыхапілі посцілкі (паляжаць), сумкі з мяснымі прысмакамі, да іх — качанчык квашанай капусты, гурочкаў, цыбулькі, ну і, вядома ж, пляшку гарэлкі (які без яе «культурны адпачынак»?). Прыйшлі (гэта ад іх кіламетры са два), уладкаваліся — пазагаралі, пакупаліся. Значыць, можна і перакусіць ужо? На абрус расклалі прысмакі...

— А давайце яшчэ разок акунёмся, — прапануе раптам сястра. — Апетыту сабе нагонім...

Акунуцца дык акунуцца, нагнаць дык нагнаць. Хто супраць?

Народу на пляжы было няшмат, усе свае, як кажуць, таму варту ля «стала» мы не пакідалі... І на гадзіннік — колькі там плёхаліся — таксама не глядзелі. Думаю, хвілін пятнаццаць прайшло, не больш, бо возера там глыбокае, вада халодная...

Але ж і сагрэцца ў нас было чым. Так што павылазілі на бераг, хуткім крокам рушылі да абруса і... Яшчэ «на подступах» панямелі. Не, пляшка на месцы была, капуста з агуркамі таксама, а вось усе мясныя прысмакі як карова языком злізала. І ўсе ж свае... І ніхто як быццам не падыходзіў...

Сталі азірацца яшчэ і яшчэ раз— і такі ўбачылі злодзея. Ён — невялічкі рыжанькі сабачка — сядзеў між кустоў і смачна аблізваўся: трэба разумець, дзякаваў нам за шчодры пачастунак.

Што заставалася нам? Толькі рассмяяцца, бо з'еў жа той жулік не ўсё: нам таксама пакінуў — і выпіць, і закусіць.

П. Браток,
г. Мінск.

...ЯКІ БАЦЬКА — ТАКІ СЫН

Ёсць дынастыі настаўнікаў, музыкаў, дактароў... Ёсць — жартаўнікоў. То я спярша пра старэйшага, пра бацьку.

Уявіце сабе: на дварэ зіма, мужык з жонкай (і, мякка кажучы, не маладыя ўжо) запрэгліся: цягнуць на санках мяшок мукі, час ад часу спыняюцца: цяжка ім...

Дзядзьку Сяргею — таксама цяжка, бо ногі — ну, зусім не трымаюць, не ідуць, а трэба! Вось ён і... уваліўся ў тыя санкі. Сужэнцы ж не пачулі (назад не азіраюцца) — цягнуць ды сварацца між сабой:

— Ды ўпірайся ты крыху! — крычыць мужык, — а то я адзін цягну...

— Не, гэта я цягну, — пярэчыць кабета, — а ты толькі выгляд робіш!

Спрэчка — ледзь не да бойкі! А «пасажыр» тым часам ужо даехаў: скок на зямлю і кажа:

— Дзякуй, людцы, за дастаўку! І за канцэрт...

Вазніцы мігам да згоды прыйшлі — шмат цікавага (праўда, не для друку) сказалі ў адказ... На што дзядзька Сяргей толькі зазначыў: «Калі ўзяўся «руляваць» — глядзець трэба і спераду, і ззаду».

...Сын яго, мусіць, так і рабіў, бо працаваў прафесійным кіроўцам. Прычым перавозіў не цэглу, а людзей — на прыгарадным аўтобусе.

(Тут трэба, мусіць, сказаць, што ў тыя 80-я хадзілі яны да самых глухіх хутароў і па некалькі разоў на дзень...) Аднак у «вадзіл» былі і вольныя хвіліны. Тады яны збіраліся разам у салоне нейкага аўтобуса і рэзаліся ў храпа — на грошы.

Дык у той дзень яшчэ Толіку, што называецца, «папёрла»: карта — ну, як па заказе ішла!

А тут як на ліха дыспетчар: ты што, маўляў, сабе думаеш, што дазваляеш?! Народ нервуецца! Ужо дваццаць хвілін у рэйсе павінен быць...

Што тут будзеш рабіць?! Кінуў чалавек гульню, падаўся ў бок аўтобуса. А там жа сапраўды пасажыры. І вядома ж, злыя. Значыць, падваляць па першае чысло...

Рашыў схітрыць: здалёку прыкінуўся п'яным, у лукатку дайшоў да аўтобуса, ускараскаўся ў салон, пытаецца:

— А што — «вадзілы» яшчэ няма?

— Няма! — кажуць пасажыры.

— ...Ну і на фіг ён здаўся! Без яго абыдземся! — зароў Толік, гэпнуўся ў вадзіцельскае крэсла, павярнуў ключ — запусціў рухавік.

Што тут пачалося!.. Пасажыры з віскатам, з крыкам кінуліся з салона.

...У той жа дзень гэтага гумарыста пагналі з работы: начальства, трэба разумець, жарт не ацаніла. А вы?

Адно — паўтараць яго я шчыра не раіў бы.

А. Ліпень,
Іўеўскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

У Віцебску на вуліцы Талстога пасяліўся святы Крыспіна. Скульптуру ахоўніку ўсіх шаўцоў і гарбароў, які стаў пакутнікам у Францыі тысячу гадоў таму, усталявала віцебскае абутковае прадпрыемства «Марко». Адлітая яна з бронзы і прывезена з-за мяжы, але вобраз святога цалкам адпавядае зборнаму партрэту работнікаў віцебскага абутковага прадпрыемства.

Фота Аляксандра ХІТРОВА, *БЕЛТА.*

Приложение № 1

Считать недействительными бланки строгой отчетности согласно прилагаемому перечню:

Вид бланка	серия	с номера	по номер
Квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) форма-1СУ	КС	655324	655325
	КС	655387	655395
	КС	655634	655634
	КС	655641	655641
	КС	655660	655662
	КС	714441	714441
	КС	714454	714454
	КС	714464	714464
Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу	МТ/2400	002441	002445
	МТ/2400	002455	002457

УНП 806000273

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

РЭСПУБЛІКАНСКІ-21

Конкурс праводзіўся намі сумесна з ГА «Беларуская федэрацыя шашак» і быў адкрытым. У ім удзельнічалі складальнікі міні-праблем з Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы і Беларусі. Яны прадставілі 47 задумак на 100-клетачнай дошцы. Іх разгледзелі галоўны суддзя У. Матус (Расія), суддзі І. Івацка (Украіна) і В. Шульга (Беларусь), кансультанты Э. Акер (Галандыя), А. Гімбутас (Літва) і інш. У выніку лаўрэатамі сталі Г. Андрэеў з Латвіі (7,5 ачка), В. Студзянцоў з Літвы (7,25), В. і Е. Факанавы з Украіны (па 6,5) і В. Грабенка з Беларусі (6,375). Ім будзе ўручана кніга міжнародных гросмайстраў У. Матуса і Е. Зубава «Гранды России» (Москва, Графпресс, 2008), а таксама адпаведныя дыпломы БФШ.

У рамках нашага **бліца-61/3** пазнаёмцеся з пераможнай канструкцыяй Генадзя Андрэева:



Белыя: 10, 14, 17, 24, 34, 41, 48 (7). **Чорныя**: 18, 23, 28, 32, 36, 44 (6). Выйгрыш.

НОВЫ МАТЫЎ

Ён дэманструецца ў заданні № 3 конкурсу рашэнняў шашачных пазіцый «Пагода ў доме-8». Легальнасць пачатковай расстаноўкі дакажаецца — дамка b6-a5 (d8:b6) дамка a5:c7 (f6:b6):



Белыя: a3, d6, g3, g5, h4, h6 (6). **Чорныя**: b6, d4, e3, e5, f4, f8, g7, h2 (8). У белых матэрыяльная меншасць, але яны выкарыстоўваюць сваю тактычную перавагу. Паспрабуйце зрабіць гэта і вы.

АЎТАРСКІ-14/12

Яго працягвае міжнародны майстар Віктар Шульга (Мінск):

Белыя: 31, дамкі 4, 25 (3). **Чорныя**: 5, 21, 26, 37, дамка 42 (5). Перамога белых.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі»**.

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

Бліц-58/6 (М. Грушэўскі): h6, e3! (d4) c7, e3x і па-за конкурсам: № 6: I-II g5, f6, e3! (d4) c7, e3x. II g3? (b8 III)=. III (e3-f4?) b8, f6, e3 (g1) b8-a7 (d4) c7x. I f6? (g1IV)=. IV(g7?) c5, e3 (d4) c7, e3x.

Аўтарскі-14/8 (В. Шульга): 17-12, 11, 33:24, 43, 33, 4(17A), 6x. A(7) 1x. Легальнасць: 32-28 (27-31).

І ЦАРСКІЯ МАНЕТЫ БРАЎ

Віцебскі рэкецір, які браў даніну за права гандляваць на рынку, у ліку іншага — манетамі царскіх часоў, а таксама... узнагародамі.

Як паведаміла «Звяздзе» **Марына ШАЎЧЭНКА, пракурор аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў па крымінальных справах і аналізе судовай практыкі пракуратуры Віцебскай вобласці,** 45-гадовы рэкецір ужо асуджаны. Ён навадзіў жах на тых, хто гандляваў на вельмі папулярным у Віцебску Полацкім рынку.

Адзін з яго «падапечных» займаўся купляй, продажам і абменам манет, марак, нагрудных знакаў і гэтак далей. Дык вось, у якасці платы (бо грошай расплаціцца не было) зламыснік браў у яго і манеты, і маркі і нагрудны знак «Выдатнік Савецкай Арміі». Пасля затрымання дома ў рэкеціра знайшлі таксама ордэн «Чырвонай Зоркі», медаль «За абарону Масквы».

Дарэчы, затрымалі рэкеціра «на рабочым месцы» — на рынку адразу пасля атрымання чарговай платы. Толькі не ведаў ён, што долары «памецілі».

Падчас следства высветлілася, што рэкецір — яшчэ і наркаман. Каб атрымаць неабходныя яму лекі ў аптэках, атрымліваў іх па чужых рэцэптах. У ліку іншага яму інкрымінавалася і захоўванне псіхатропных рэчываў.

За сваю актыўную крымінальную дзейнасць рэкецір па сукупнасці пакаранняў пазбаўлены волі тэрмінам на шэсць гадоў. За дротам яго будуць лячыць ад наркаманіі.

ДЫРЭКТАР ПАДМАНУЎ БАНК

Упраўленнем дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Віцебскай вобласці заведзена крымінальная справа ў адносінах да дырэктара віцебскага закрытага акцыянернага таварыства, які злачынным шляхам легалізаваў матэрыяльныя каштоўнасці на суму 200 мільёнаў рублёў.

Як стала вядома праваахоўным органам, гэтыя каштоўнасці бізнэсмен атрымаў у выніку вымантачвання крэдыту ў адным з банкаў за сыравіну, якую быццам бы набывае ў камерцыйнай структуры. Пакуль вядзецца следства, падрабязнасці махінацыі не афішуюцца.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗБІЎ ПАДВОДУ

Недалёка ад пасёлка Целяханы Іванцэвіцкага раёна мікрааўтобус «дагнаў» падводу. Ад удару воз перавярнуўся, 70-гадовы кіроўца падводы загінуў на месцы. 67-гадовая жанчына, якая ехала з ім, з траўмамі дастаўлена ў бальніцу. Аварыя здарылася ў цёмны час сутак, на возе не было святлоадбівальных элементаў. І кіроўца мікрааўтобуса, паводле папярэдняй версіі, позна заўважыў падводу.

Яна СВЕТАВА.

Нобелеўскі лаўрэат гуляў за футбольную каманду «Альбярцін»

Расійскі фізік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Жарэс Алфёраў пабываў у Слоніме і ў Жыровічах.

Такая паездка для вядомага фізіка не была выпадковай. Справа ў тым, што пасля вайны кардонна-папяровы завод у пасёлку Альбярцін (цяпер мікрараён горада) каля Слоніма адбудоўваў і Іван Алфёраў, бацька Жарэса Алфёрава. Разам з Іванам Алфёравым у Альбярціне часта была і яго сям'я. Будучы Нобелеўскі лаўрэат першы раз наведаў Альбярцін у 1945-м, калі яму было 15 гадоў. Потым прыязджаў часта: сям'я любіла тут адпачываць. Ды і бацька фізіка вельмі добра сябраваў з галоўным інжынерам прадпрыемства Самуілам Фарберам. У 1949 годзе Жарэс Алфёраў выступаў нават за мясцовую футбольную каманду «Альбярцін», стаяў на варотах. Апошні раз сям'я Алфёравых была ў Альбярціне ў 1966 годзе. Праз 45 гадоў вядомы расійскі фізік зноў наведаў Альбярцін.

Сяргей ЧЫГРЫН.

ВНИМАНИЕ!

Фонд «Витебскоблимущество» сообщает,
что в извещение об аукционе, назначенном на 25.05.2011 года
(извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.04.2011 года № 75 (26939)),
ВНОСЯТСЯ ИЗМЕНЕНИЯ:
начальная цена продажи предмета аукциона по лоту № 4 составляет 10 953 852 рубля,
сумма задатка по лоту № 4 составляет 1 095 380 рублей.

г. ВИТЕБСК **14.06.2011**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ НА АУКЦИОНЕ С ПРИМЕНЕНИЕМ В ХОДЕ ТОРГОВ МЕТОДА ПОНИЖЕНИЯ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Минимальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка за участие в торгах, рублей
1.	Здание бывшего пункта централизованного наблюдения, расположенное по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, г. Дисна, ул. Советская, 10, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 211/С-8654 (здание неустановленного назначения – пункт централизованного наблюдения), одноэтажное кирпичное, 1987 г. постройки, общая площадь 36,7 кв.м, объем 152 куб.м, фундамент б/бетонный, перекрытие ж/бетонное, крыша а/волнистая. Земельный участок с кадастровым номером 223351000001000037, площадь 0,0133 га для размещения административного здания, срок аренды 50 лет.	14 413 044	3 609 009	14 368 210
2.	Здание административно-хозяйственное с колодцем и асфальтобетонным покрытием и сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, расположенные по адресу: Витебская область, Бешенковичский район, г.п. Бешенковичи, ул. Володарского, 49, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объектов недвижимости: - капитальное строение с инвентарным номером 231/С-8416 – одноэтажное бревенчатое здание, фундамент бутовый, перекрытия деревянные утепленные, крыша шиферная, общая площадь 128,9 кв.м, 1988 г. постройки; пристройка кирпичная; холодная пристройка кирпичная; колодец, ж/б кольца; дворовое покрытие – асфальт, общая площадь 776 кв.м; - капитальное строение с инвентарным номером 231/С-8415 – одноэтажное кирпичное здание, фундамент бутовый, перекрытия железобетонные, крыша шиферная, общая площадь 75,4 кв.м, 1988 г. постройки. Земельный участок: площадью 0,1468 га для обслуживания административного здания и построек, кадастровый номер 220555100001001826, срок аренды – 55 лет. Ограничения в использовании земельного участка – охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В площадью 0,0230 га, охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В площадью 0,0096 га. Использование – для обслуживания административного здания и построек.	83 955 653	26 039 173	
3.	Здание склада с рампой, расположенное по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Боровая, д. 11, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 250/С-27777 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), одноэтажное кирпичное, 1985 г. постройки, фундамент бетонный, перекрытие ж/бетонное, крыша рулонная, общая площадь 1030 кв.м, объем 5232 куб.м, бетонная рампа, площадь 95 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 243500000001001208 для содержания и обслуживания здания вещевого склада, площадь 0,4656 га, срок аренды 25 лет. Использование – под специализированное здание здравоохранения и предоставления социальных услуг.	332 677 887	163 931 303	

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон-факс в г. Витебск: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

Продавец: по лотам №№ 1–2 – Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, контактный телефон в г. Витебске (0212) 487687.

по лоту № 3 – Государственное учреждение «Борисовское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», контактный телефон в г. Витебске (0212) 36935.

Условия пользования земельными участками:

по лотам №№ 1–2: заключение победителем аукциона с райисполкомом договора аренды и осуществление государственной регистрации права аренды на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка;

по лоту № 3: заключение победителем аукциона договора аренды земельного участка с Полоцким горисполкомом и осуществление государственной регистрации права аренды на земельный участок в двухмесячный срок после получения решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Аукцион состоится 14 июня 2011 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

1. Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица, индивидуальные предприниматели Республики Беларусь и иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество». Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают заверенную банком копию платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона, а также:

юридическое лицо – резидент Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

индивидуальный предприниматель – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе и заключении соглашения организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – нотариально заверенная доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов **13.06.2011** по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 14.06.2011 с 14.00 до 15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.**

2. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.

Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495. Внесение задатка в сумме **14 368 210** рублей дает участнику право на участие в торгах по всем лотам. **Если имеет место превышение задатка, внесенного победителем аукциона, над ценой продажи единого предмета аукциона, сумма превышения подлежит возврату в течение 5 рабочих дней** со дня проведения аукциона.

3. Регистрация участников производится без предоставления информации о намерении приобретения конкретного объекта.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи объектов республиканской собственности на аукционах с применением метода понижения начальной цены, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками. Аукцион по каждому объекту начинается с объявления месторасположения, краткой характеристики объекта, его начальной и минимальной цены. При наличии двух и более участников, желающих приобрести объект по начальной цене, аукционист повышает цену с установленным шагом, пока по новой объявленной цене аукционный номер поднимает один участник, которого объявляют победителем. Если по начальной цене аукционный номер поднял только один участник – аукционист объявляет победителем этого участника. Если после объявления начальной цены ни один участник не поднял свой номер, аукционист понижает цену в соответствии с шагом аукциона до момента, когда один из участников не поднял аукционный номер по объявленный цене. Этот участник объявляется победителем. Объект не может быть продан по цене ниже минимальной цены, опубликованной в настоящем извещении. Задатки участникам, не ставшими победителями, возвращаются в течение 5 рабочих дней. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; **не позднее 10 дней** со дня принятия решения исполнительного комитета о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и расходы, связанные с формированием земельного участка **в сумме 3 миллионов рублей по каждому лоту**; **не позднее 12 дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи до 13.06.2011 включительно.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА

Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, пр. Черняховского, 9.

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка	Функциональное назначение земельного участка	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения
1	Земельный участок с кадастровым номером 221287012101000663, площадью 0,1563 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, аг. Новка, ул. Вишневая, 8	Для строительства и обслуживания жилого дома	Возможность подключения централизованного газо- и водоснабжения. Ограничений в использовании нет.	12 874 534	1 287 400 бел. руб. на р/с 3600314100017 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Новкинский сельский исполнительный комитет
2	Земельный участок с кадастровым номером 221282909101000121, площадью 0,1730 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, д. Пестуница, ул. Заозерная, 4Б	Для строительства и обслуживания жилого дома	Возможность подключения централизованного водоснабжения, участок примыкает к асфальтированным дорогам и улицам. Ограничения в использовании: водоохранная зона водного объекта вне прибрежной полосы (оз. Пестунское).	3 066 229	306 600 бел. руб. на р/с 3600314060014 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебск, код 239, УНП 300965239, код платежа 04901, получатель платежа: Зароновский сельский исполнительный комитет

Дата, время и место проведения аукциона – 16.06.2011 в 15.00 по адресу: г. Витебск, пр.Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов – 10.06.2011 до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка	Функциональное назначение земельного участка	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения
1	Земельный участок с кадастровым номером 221887008601000091, площадью 0,1699 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Пальминский с/с, д. Хоботы, ул. Центральная, д. 2А	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания	Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения в использовании: охранная зона линий электропередач напряжением до 1000 В, водоохранная зона водного объекта вне прибрежной полосы оз. Вымно.	1 342 006	134 200 бел. руб. на р/с 3600316087000 в ЦБУ 207 г. Городок ф-л 200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300066527, код платежа 4901. Получатель платежа: Пальминский сельисполком
2	Земельный участок с кадастровым номером 221887008601000090, площадью 0,2087 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Пальминский с/с, д. Хоботы, ул. Центральная, д. 38А	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания	Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения в использовании: водоохранная зона водного объекта вне прибрежной полосы оз. Вымно.	1 648 480	164 800 бел. руб. на р/с 3600316087000 в ЦБУ 207 г. Городок ф-л 200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300066527, код платежа 4901. Получатель платежа: Пальминский сельисполком

Дата, время и место проведения аукциона – 14.06.2011 в 15.00 по адресу: г. Городок, ул. Пролетарская, 2, Городокский районный исполнительный комитет. Окончательный срок подачи документов – 08.06.2011 до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр.Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка	Функциональное назначение земельного участка	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения
1	Земельный участок с кадастровым номером 240100000002006384, площадью 0,0870 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Школьная, 28	Для строительства и обслуживания жилого дома	Возможность подключения централизованного газо- и водоснабжения. Ограничения в использовании: охранная зона линий, сооружений связи

Zамор'е

Падрыхтаваў Іван КУПРАВАС.

Самы танны спосаб пахудзець

Амерыканскія навукоўцы даказалі, што жанчыне вельмі лёгка пахудзець у тым выпадку, калі яна аказваецца перад пагрозай фінансавага краху.



Вучоныя з універсітэта Карнегі-Мелана ў Пітсбургу пацвердзілі сваю гіпотэзу выпрабаваннямі на людзях. На працягу васьмі месяцаў эксперты назіралі за паводзінамі 57 забяспечаных мужчын і жанчын ва ўзросце ад 26 да 58 гадоў. Падчас гэтага выпрабавання навукоўцы выявілі, што практычна ўсе жанчыны, якія адчувалі страх перад стратай грошай, худзелі. А вось у мужчын рэакцыя была трохі іншая: у гэтай экстрэмальнай сітуацыі скінуць вагу ўдалося толькі 12 працэнтам падыспытных. Навукоўцы прыйшлі да высновы, што прамая залежнасць паміж вагой і страхам страты грошай уласцівая прадстаўніцам жаночага полу.

Як паказаў эксперымент, добраахвотнікі, якія апынуліся перад пагрозай банкруцтва, імкнуліся да абмежавання ў ежы, а таксама да актыўных фізічных дзеянняў. Цяпер дыетолагі паставілі сабе задачу высветліць, якія адмоўныя наступствы могуць быць у гэтай незвычайнай «дыеты». У апошні час амерыканскія навукоўцы сур'ёзна вывучаюць праблему атлусцення і пастаянна прыдумляюць новыя спосабы пахудзець. Адным з нядаўніх адкрыццяў даследчыкаў з ЗША стала тое, што знізіць вагу дапаможа халодная вада: для таго, каб пахудзець, трэба штодня піць каля двух літраў вады тэмпературай не вышэй за 22 градусы па Цэльсію. Пры гэтым арганізм расходуе энергію на тое, каб нагрэць вадкасць, у якой калорыі адсутнічаюць, і траціць каля 50 кілакалорый. Для большай эфектыўнасці навукоўцы раяць выпіваць паўлітра вады перад сняданкам і яшчэ паўтара літра за цэлы дзень. Эксперты ўдакладнілі, што пры «штодзённым спажыванні двух літраў вады за год можна страціць да пяці кілаграмаў тлушчу».

Forbes назваў самыя незвычайныя ў свеце віды гарэлкі

Вада з айсберга, кветкі гібіскуса, казінае малако, смарагды, кафеін і іншыя складнікі самых незвычайных гарэлак планеты — усё гэта трапіла ў адмысловы алкагольны рэйтынг, апублікаваны Forbes.ru.

Forbes.ru адзначае, што сёння вытворцы не стамляюцца шукаць новыя спосабы здзівіць пакупніка, і дзякуючы багатай фантазіі алкагольных кампаній зараз на прылаўках крамаў можна знайсці гарэлку, градус якой павышаецца больш чым удвая, а таксама гарэлку, якая становіцца ігрыстай на манер шампанскага або змяняе свой колер на чорны. Безумоўна, канстатуе выданне, усе гэтыя хітрыкі не робяць гарэлку больш бяспечнай для здароўя.

11 ГАТУНКАЎ ГАРЭЛКІ, ЯКУЮ, НА ДУМКУ FORBES, НЕ СОРАМНА ПАСТАВІЦЬ НА СТОЛ:

1. Гарэлка з ажыны і кветак гібіскуса Chambor.
2. Ігрыстая гарэлка O_2 Sparkling Premium Vodka.
3. Мангольская гарэлка архі «Герой Чынгізідаў».
4. Бульбяная гарэлка Chase
5. Чорная гарэлка Blavod.
6. Самая дарагая гарэлка ў свеце — DIVA Premium Vodka.
7. Самая паўднёвая гарэлка ў свеце 42 Below.
8. Гарэлка з айсберга Iceberg.
9. Французская вінаградная гарэлка Ciroc.
10. Самая моцная гарэлка ў свеце Pincer Shanghai Strength.
11. Самая «падбадзёрлівая» гарэлка ў свеце V2.

Ясі — і лежачы, і стоячы!

Original Shirt Plate — гэта футболка для гультаяватых і маларухомых людзей, якім «у аблом» не толькі ўстаць з ложка, але і пайсці паесці на кухню.

Арыгінальная ідэя заключаецца ў тым, што талерка на футболцы размешчана такім чынам, што зграбнаму чалавеку карыстацца ёю будзе вельмі няёмка. Кампанія выпускае футболкі-талеркі рознага дыяметра і аб'ёму: адмыслова для Дня падзякі (у яе зручна пакласці індычку), для амататараў ласункаў і печыва, для прыхільнікаў смажаных крыльцаў — увогуле, на любы густ і колер.

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



7				3			2	
6	1	3		2				
		2	4					
	9	6					5	
8		7				6		9
	2					8	3	
					5	4		
				7		5	1	8
	5			6				7

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетці, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

«Дзеці вайны» на паштовым канверце

РУП «Белпошта» прэзентавала новы памятны канверт з выявай магілёўскага помніка «Дзецям вайны».

28 красавіка новы канверт, які выраблены накладам у 20 тысяч, прадставілі ў Магілёўскім філіяле «Белпошты». Яго можна выкарыстоўваць у межах Беларусі і пры адпраўцы лістоў і паштовак за мяжу.

Помнік «Дзецям вайны» быў адкрыты ў Магілёве 3 ліпеня 2009 года да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ён усталяваны на ахвяраванні людзей. Цяпер у Магілёўскай вобласці жывуць каля 2 тысяч чалавек, — былых малалетніх вязняў.

Ілона ІВАНОВА.

3	5	8	1	6	4	2	9	7
9	6	4	3	7	2	5	1	8
2	7	1	9	8	5	4	6	3
4	2	5	7	9	6	8	3	1
8	3	7	2	5	1	6	4	9
1	9	6	8	4	3	7	5	2
5	8	2	4	1	9	3	7	6
6	1	3	5	2	7	9	8	4
7	4	9	6	3	8	1	2	5

Адказы на сканворд + судоку

Па гарызанталі: Труба. Пасасюк. «Ліка». Арна. Мэр. Бокс. Шпат. Армяк. Жвавы. Фае. Абак. Бэра. Рака. Аост. Мята. Ага. Клямар. Афарына. **Па вертыкалі:** Альба. Конка. Рацо. Кавалерыя. Брамс. Мараж. Фарш. Ацабэма. Пагана. Армада. Ручка. Кіт. Танк. Рубя. Арэал. Нарост. Кастрка. Дата. Суд. **Адказы:** адказаў гл. у тэлыцы.

Ну і ну!

Выбрыкі акрабата

КАНДЫДАТ У МАЙСТРЫ СПОРТУ ПА АКРАБАТЫЦЫ АДТОЧВАЎ НАВЫКІ НА ЧУЖЫХ АЎТАМАБІЛЯХ

Вяртаючыся дадому пасля праведзенага ў кампаніі сяброў вечара, паводле звестак прэс-афіцэра Фрунзенскага РУУС Алы Галубовіч, 19-гадовы нецвярозы мінчанін вырашыў прадэманстраваць майстар-клас на дваровай аўтастаянцы: для акрабатычных скокаў ён выбраў прыпаркаваныя машыны.

Спачатку дасталося «Маздзе», на капоце, а потым і на даху якой раптоўна апынуўся спартсмен. Далей ён разышоўся больш: з «Маздзе» пераскочыў на «Опель», затым — на «Вольва V40», з гэтага аўтамабіля — на «Рэно-Лагуну», пакідаючы ўвагнутасці на кузаве. Між іншым, акрабатычныя эцюды часам перарываліся падзеннем юнака на асфальт з-за выпітага спіртнога, але гэта яго не спыняла. У выніку такой своеасаблівай «трэніроўкі» чатыры аўтамабілі былі сур'ёзна пашкоджаны: урон ацэньваецца ў больш як 8,5 мільёна рублёў. У дачыненні да хлопца заведзена крымінальная справа, яму пагражае да 3 гадоў пазбаўлення волі.

Ігар ГРЫШЫН.

Курэнне і сумленне

5 мая ўвечары супрацоўнікі МНС выехалі на тэрміновы выклік: на балконе на 8-м паверсе дома на вуліцы Гогаля ў Магілёве вісіць на руках мужчына. З дапамогай аўталесвіцы выратавальнікі паспяхова знялі 31-гадовага мужчыну, які быў у нецвярозым стане. Ён патлумачыў, што курыў на балконе і палез праз поручні, каб пераканацца, што выкінуты незатушаны акурак не трапіў на балкон суседзяў на ніжнім паверсе. Але сіл вярнуцца самастойна на свой балкон у сумленнага курыльшчыка не хапіла, давялося чакаць дапамогі.

Ілона ІВАНОВА.

Фота Магілёўскага абласнога УМНС.

СЁННЯ

Месяц

Першая квадра 10 мая.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.15	20.58	15.43
Віцебск —	4.59	20.53	15.54
Магілёў —	4.59	20.53	15.54
Гомель —	5.08	20.38	15.30
Гродна —	5.31	21.12	15.41
Брэст —	5.38	21.06	15.28

Імяніны

Пр. *Ганны, Жанны, Марыі, Яны, Аўсея, Віталя, Кірылы, Максіма.*

К. *Міры, Ігната, Кірылы, Францішка, Якуба.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

11 мая

Дзве даты

1890 год — нарадзіўся Глеб Паўлавіч Глебаў, вядомы беларускі акцёр, народны артыст Беларусі і СССР. З 1926 года ў Беларускім тэатры імя Я. Купалы, у гады вайны ўзначальваў тэатральную франтавую брыгаду. У гісторыю беларускага тэатра ўвайшоў як выдатны майстар камедыйнага жанру. Здымаўся таксама ў кінафільмах: «Канстанцін Заслонаў», «Несцерка», «Палеская легенда» і інш. Лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР (1941, 1948).

1939 год — пачаўся ўзброены канфлікт паміж СССР і Японіяй каля ракі Халхін-Гол на тэрыторыі Манголіі. Найбольш значныя баявыя дзеянні адбыліся ў канцы жніўня. Канфлікт закончыўся поўным разгромам 6-й асобнай арміі Японіі. Гэта ў немалой ступені паспрыяла таму, што Японія так і не адважылася ўступіць у вайну супраць Савецкага Саюза ў 1941 годзе .

Цытата дня:

«Нашы пункты гледжання супадаюць. Пытанне толькі ў тым, чый з чыім».

Станіслаў Ежы Лец (1909—1966), польскі пісьменнік-сатырык.

ВІЛЫ

Вілы — прылада сялянскай працы, прызначаная для таго, каб збіраць і пераносіць сена, салому, гной і інш. У народнай культуры разам з іншымі вострымі жалезнымі рэчамі яны ўваходзілі ў лік надзейных абярэгаў.

- Часам вілы выкарыстоўвалі для абароны ад навальніцы, граду, маланкі. Для гэтага іх выносілі на двор і клалі крыж-накрыж перад парогам хаты.
- Каб спыніць ураганны вецер, які мог нарабіць шмат шкоды для гаспадаркі: паламаць дрэвы, сарваць стрэхі з хат і інш., выконвалі магічныя дзеянні — у той бок, адкуль чакалі навалы, кідалі вострыя рэчы (нож, сякеру), у тым ліку і вілы.
- У народнай медыцыне знахары для лячэння цяжкіх захворванняў выкарыстоўвалі такі спосаб: над галавой хворага (чалавека ці жывёлы) разломвалі драўляныя вілы, сімвалічна аддзяляючы хворую частку ад здаровай.
- У традыцыі ўсходніх славян вядомая забарона выкарыстоўваць у падчас калядных святочных вечароў, памінальных дзён вілкі і нажы, каб не нарабіць шкоды памерлым продкам, якія нябачна знаходзяцца за святочным сталом. З той жа нагоды ў святочныя дні забаранялася браць у рукі вілы, каб на працягу года не было мору сярод жывёлы.
- На Палессі лічылі, што ў каровы не будзе прыплоду, калі даваць ёй сена ці салому віламі.
- Вілы выкарыстоўвалі і ў абрадавай магіі. У выпадку агоніі грэшнікаў, знахараў і ведзьмакоў вілы забівалі ў столь — тым самым рабілі ў даху сімвалічны выхад, каб душа пакутніка магла лёгка адляцець.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся

Настаўнік фізкультуры ніяк не можа абыграць у шахматы настаўніка працы, таму што апошні выстругаў сабе два дадатковыя фярзі!

☺

Злавіў стары залатую рыбку, і кажа рыбка чалавечым голасам:

— Што табе трэба, старэча?

— Для пачатку — іншую жонку. Пушкіна чытаў, ведаю, чым усё можа скончыцца.

☺

Закон жыцця: у якім бы раёне ты ні пасяліўся, сусед з перфаратарам адшукае цябе і паселіцца побач...

☺

— Сёма, ты як графін. У табе літр гарэлкі, а ты ўсё стаіш.

☺

Анекдоты, яны як дзеці: свае — лепшыя за ўсіх!

☺

Баксёр ва ўрача:

— Доктар, у мяне бяссонніца...

— А вы лічыць спрабавалі?

— Спрабаваў, на 9 ускокваю!

ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА МАЙ

11 мая. Ідэальны дзень для стрыжкі валасоў. Абяцае выдатнае самаадчуванне і нябеднае жыццё да старасці.

12 мая. Пасля наведвання цырульні ў гэты дзень чалавека могуць спасцігнуць хваробы і ўсялякія праблемы.

13 мая. Лепш устрымацца ад наведвання цырульні. Паводле тыбецкіх традыцый, гэта дзень, які «спальвае», стрыжка пагражае пагаршэннем здароўя.

14 мая. Стрыжка ў гэты дзень развівае вастрыню пачуццяў, паляпшае праніклівасць розуму.

15 мая. Стрыжку лепш перанесці на больш спрыяльны перыяд, паколькі ў гэты дзень можна прыцягнуць няшчасці, павялічваецца верагоднасць траўматызму.

16 мая. Добры час для стрыжкі. У гэты дзень вы набудзеце не толькі прывабны знешні выгляд, але і прыцягнеце ў сваё жыццё ўдачу і шчасце.

17 мая. Паляпшэнне ва ўсіх сферах жыцця (ад становішча ў грамадстве да матэрыяльнага стану) чакае таго, хто наведае цырульню.

18 мая. Неспрыяльны дзень для наведвання цырульніка. Стрыжка ў гэты дзень тоіць у сабе сур'ёзныя негатыўныя наступствы практычна ва ўсіх галінах жыцця (ад парушэння агульнага стану арганізма да псіхічных працэсаў).

19 мая. Неспрыяльны дзень для стрыжкі. Наведваючы цырульніка ў гэты дзень, вы наклікаеце верагоднасць асабістых памылак і выпадковасцяў, якія ідуць за імі. Акрамя гэтага, становіцца складана трымаць пад кантролем свае негатыўныя звычкі і страсці.

20 мая. Стрыжка стварае магчымыя перашкоды ў справах і вядзе да пагаршэння здароўя (ад верагоднасці траўматызму да пагаршэння псіхічнай дзейнасці). Паводле ўсходніх традыцый, самыя шкодныя духі прыцягваюцца падчас стрыжкі ў гэты дзень.

21 мая. Стрыжка ў гэты дзень павялічвае верагоднасць скіраванага супраць вас крадзяжу ці рабаўніцтва , што пацягне за сабой не толькі страту маёмасці ці ўласнасці, але і пагаршэнне здароўя.

22 мая. У гэты дзень лепш адкласці справы і знайсці час для наведвання цырульні, паколькі стрыжка ў гэты дзень падаўжае жыццё.

23 мая. Стрыжка ў гэты дзень змяняе адносіны да жыцця. Нават самы заўзяты аптыміст пачне прыглядацца да жыццёвага негатыву — аж да ўзнікнення пачуцця трывалай агіды да жыцця ўвогуле і да навакольных у прыватнасці.

24 мая. Той, хто пастрыжэцца ў гэты дзень, завалодае як знешняй, так і ўнутранай прывабнасцю і прыцягальнасцю, а разам з гэтым — і дабрабытам.

25 мая. З аднаго боку, стрыжка ў гэты дзень дае магчымасць набыцця ўласнасці, а з іншага боку, можа прывесці да павелічэння вагі, што адаб'ецца на агульным стане здароўя.

26 мая. Стрыжка ў гэты дзень дае здаровы колер твару і паляпшае дабрабыт.

27 мая. Для стрыжкі дзень надзвычай неспрыяльны. Пагражае пагаршэннем здароўя, асабліва калі ўжо ёсць схаваныя ці хранічныя хваробы.

28 мая. У гэты дзень магчыма павелічэнне ўнутрывочнага ціску ці абвастрэнне вочных хвароб. Высокая верагоднасць з'яўлення ячменю ці запаленняў.

29 мая. Станоўчы дзень. Ніякіх лёсавызначальных змен не нясе, але стрыжка ці ўкладка атрымаюцца на дзіва ўдалымі, што прывядзе да выдатнага настрою.

30 мая. Паказанні ў гэты дзень такія ж, як і ў папярэдні.

31 мая. Знешні выгляд, які вы атрымаеце сёння пасля наведвання цырульні, саслужыць вам добрую службу ў прыцягненні патрэбных знаёмстваў. Добры дзень для стрыжкі.

Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

МЯСА НЕ ВАЛЯЕЦЦА

Каля в. Тамашоўка (Брэсцкі раён) у памежнай паласе былі затрыманы мясцовыя жыхары, якія не мелі дазволу на паляванне. Калі зрабілі агляд іх аўтамашын, то ў адным знайшлі 17 туш жывёл. Кіроўца заявіў, што мяса знайшоў у лесе.

У гэты ж дзень на аўтадарозе Маларыта—Кобрын была затрымана аўтамашына грамадзяніна Украіны, які перавозіў 23 тушы агульнай вагой 830 кг. Мужчына растлумачыў, што мяса ён павінен быў даставіць за ўзнагароду з п. Мухавец у Баранавічы. Тушы канфіскавалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 18 (680)
адрэса рэкламы
287 17 79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Дача ў в. Чарняты Мядзельскага р-на, возера 100 м.
Тэл. 80215551233.

❒ Дзве шафы, буфет, пральная машына.
Тэл. 8 0171947822.

❒ Драўляны дом з гас. пабудовамі, сад, агарод, пчальнік 40 км ад Ваўкавыска. 500 у.а.
Тэл. 8 0172425918, 8 029 505 03 32.

❒ Піларама Р63-4Б.
Тэл. 8 029 674 88 62.

❒ Камп'ютар, ЖКІ манітор 19 цалей ці мяняю на ноўтбук тэрмінова.
Тэл. 8 029 872 48 10.

❒ Прынтар, стол камп'ютарны.
Тэл. 8 029 8724810.

❒ Трактар ЮМЗ, вялікая кабіна.
Тэл. 8 029 613 47 19.

❒ А/м «Пасат Б5» 1999 г.в., 1,9 ТДІ, 1 мес. у РБ, універсал, 8250 у.е., торг.
Тэл. 8 029 644 91 77.

❒ Восем сем'яў пчол у в. Новая Вёска Стаўбцоўскага р-на.
Тэл. 8 017 293 71 66.

КУПЛЮ

❒ Мотаблок з абсталяваннем.
Тэл. 8 029 564 62 70.

❒ Т-25 або самаробны трактар з с/а.
Тэл. 8 033 64 33 401.

ЗВЯЗДА
КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЫЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

Калейдаскоп

Любоў да чысціні прыводзіць да дэпрэсіі

На думку навукоўцаў, залішняя ахайнасць можа стаць прычынай нервовага расстройства ці нават псіхічнага захворвання. Спецыялісты заўважылі, што ў апантаных чысцінёй асоб часта развіваецца клінічная дэпрэсія.

Людзі, якія рэгулярна наводзяць чысціню, не толькі пазбаўляюцца ад пылу і ад хваробатворных мікробаў, але і ад бактэрый, якія неабходны для правільнага функцыянавання арганізма. А гэта аслабляе імунітэт.

Апроч таго, недахоп гэтых карысных бактэрый прыводзіць да зніжэння сератаніну, які выпрацоўваецца галаўным мозгам. Навукоўцы мяркуюць, што з'яўленне дэпрэсіі залежыць ад работы імуннай сістэмы і ўзроўню сератаніну. Фанаты чысціні самі ўганяюць сябе ў нуду, знішчаючы радасць сваімі рукамі.

Мікрафлора кішэчніка ў адказе за нашу асцярожнасць?

Міжнародная група даследчыкаў, у склад якой увайшлі прадстаўнікі Каралінскага інстытута (Швецыя) і Інстытута генома (Сінгапур), прыйшла да высновы, што бактэрыі-сімбіёнты, якія жывуць у чалавечым арганізме, аказваюць значны ўплыў на нашы паводзіны.

У прыватнасці, як паказалі вопыты на мышах, стымулююць асцярожнасць і баязлівасць, паведамляе Scientific American. У межах эксперыменту вучоныя вырасцілі мышэй са стэрыльна чыстым ад мікробаў кішэчнікам. Далей даследчыкі праводзілі параўнальны біяхімічны і паводзінскі аналіз «безмікробных» грызуноў з іх нармальнымі родзічамі. У адным з эксперыментаў мышэй з абедзвюх груп змяшчалі ў цёмную скрыню з адтулінай, праз якую жывёлы маглі свабодна выбірацца на асветленую прастору. Навукоўцы адзначылі, што грызуны з чыстым ад мікробаў кішэчнікам праяўлялі большую актыўнасць і менш баяліся адкрытай прасторы, чым іх «калегі» з кантрольнай групы. Што тычыцца верагоднага тлумачэння таго, якім чынам кішэчныя бактэрыі ўплываюць на нашы паводзіны, тут на падазрэнні ў навукоўцаў блукаючы нерв і крывяносная сістэма, праз якія, верагодна, паступаюць сігналы ад нашых сімбіёнтаў у мозг.

Расліны выпрацоўваюць уласны «крэм ад сонца»

Даследчыкі вынайшлі ў раслін фотарэцэптар. Ён здольны «бачыць» ультрафіялетавыя хвалі сярэдняй даўжыні (UVB), тым самым расліна стымулюе вытворчасць хімічных рэчываў, якія выконваюць функцыю абарончага крэму.

UVB — гэта самая моцная частка спектра сонечнага святла, патэнцыяльна разбуральная для раслін і людзей. Пошук гэтага фотарэцэптара для раслінных фотабіёлагаў па значнасці нагадваў пошук Святога Грааля, прызналіся навукоўцы ўніверсітэта Глазга.

Чыпсы і бульба-фры — лепшы сродак супраць стрэсу?

Вучоныя сцвярджаюць, што менавіта гэтыя дзве стравы дапамагаюць змагацца з праявамі стрэсу і што замяніць іх, не згубіўшы эфекту, можна любымі іншымі падсоленымі прадуктамі, напрыклад, арэшкамі.

Па словах прафесара Універсітэта Цынцынаці Эрыка Краузэ, група навукоўцаў пад яго кіраўніцтвам у выніку эксперыментаў над пацукамі вызначыла, што павышэнне ў арганізме колькасці солі прыводзіць да зніжэння ўзроўню гармонаў, якія выклікаюць стрэс, і павышае выпрацоўку аксітацыну (яго яшчэ называюць «гармонам задавальнення»). Найбольш інтэнсіўна ён выпрацоўваецца ў арганізме, калі чалавек знаходзіцца ў стане закаханасці. Паводле сцвярджэнняў медыкаў, выпрацоўка аксітацыну спрыяе больш добразычліваму стаўленню да людзей, паведамляе выданне «Аргументы тыдня». Вынікі даследаванняў, змешчаныя ў «Часопісе неўралогіі», паказалі, што ўчасткі галаўнога мозга, якія адказваюць за стрэс, былі менш актыўныя ў пацукоў, у крыві якіх солі было больш, чым у іх родзічаў з нармальнай канцэнтрацыяй солі. Даследаванне гэтай з'явы на людзях пакуль не праводзілася, аднак, як сцвярджаюць вучоныя, у арганізме чалавека гэтыя працэсы праходзяць па тых жа законах. Адсюль вынікае, што пастаянны кліент рэстаранаў хуткага харчавання — вельмі шчаслівы чалавек, робіць выснову etotupo.ru.

Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.

Ляснічы і бабуля выдалі патроны

Супрацоўнікам Лепельскага раённага аддзела ўнутраных спраў 35-гадовы ляснічы добраахвотна выдаў чатыры паляўнічыя патроны калібру 5,6 міліметра.

А 77-гадовая жыхарка Глыбокага па добрай волі ўручыла міліцыянерам ажно 168 малакаліберных патронаў, якія належалі яе свайму... І жыхар Віцебскага раёна «папоўніў калекцыю» аперацыі «Арсенал», здаўшы 12 патронаў калібру 7,62 міліметра. Падчас аперацыі «Арсенал» у Віцебскай вобласці фактычна штодня папаўняецца спіс здадзеных боепрыпасаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, скаратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 2214. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12